Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

23 ВЕРАСНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 179
(26292)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Фота Пятра ФАМІНА.

«СЁЛЕТНІ ГОД БУДЗЕ ЗАЛАТЫМІ ЛІТАРАМІ ЎПІСАНЫ Ў ГІСТОРЫЮ АГРАПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ КРАІНЫ»

«Праляцеў яшчэ адзін год, і мы з вамі ў гэты час традыцыйна сустрэліся на самым добрым і шчырым нашым дзяржаўным свяце», — звярнуўся падчас прывітальнага слова да працаўнікоў вёскі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які, як заўсёды, узяў удзел у рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Дажынкі». Кіраўнік краіны наведаў Оршу, каб асабіста павіншаваць усіх людзей, намаганнямі якіх сёлета здабыты небывалы па важкасці «каравай».

Як зазначыў Аляксандр Лукашэнка, у гэтым годзе на ўборцы збожжа і зернебабовых культур, пры нарыхтоўцы кармоў працаўнікамі гаспадарак рэспублікі было зроблена ўсё, каб «Дажынкі-2008» сталі сапраўды святочным днём. «Безумоўна, у кожнага з вас свае асабістыя перажыванні, якія звязаны з нядаўняй уборкай, з гэтым святам, з гэтым цудоўным месцам — нашым горадам», — заўважыў Прэзідэнт. І дадаў, што Орша, нарэшце, набыла свой новы сучасны твар. Падчас падрыхтоўкі горада да «Дажынак» было пабудавана і рэканструявана каля 700 вялікіх і малых аб'ектаў, якія будуць доўга служыць людзям. «Аднак, — папярэдзіў кіраўнік краіны сваіх землякоў, — тут пакладзены пачатак узнаўленню 140-тысячнага цудоўнага горада, а далей — слова за вамі: пачынайце ад таго, што ўжо зроблена, і ўзнаўляйце самае прыгожае ў свеце месца».

«Я радуюся разам з вамі, таму што ў нас сапраўды ёсць чым ганарыцца», — сказаў Прэзідэнт. Сёлетні год, зазначыў Аляксандр Лукашэнка, будзе залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю аграпрамысловага комплексу краіны. «Гаворачы спартыўнай мовай, сяляне ўстанавілі сапраўдны рэкорд, пры тым не адзін. Па-першае, вырасцілі і сабралі небывалы ўраджай збожжавых. Я ўжо нядаўна казаў і сёння хачу падкрэсліць, што мы на беларускіх землях атрымалі кубанскі ўраджай, і нават абышлі кубанцаў. Ці ж гэта не рэкорд?! Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак з улікам уборкі зернебабовых і кукурузы ўпершыню будзе намалочана каля 10 мільёнаў тон збожжа. Па адной тоне збожжа на кожнага жыхара — гэта той узровень, які па навуковых мерках лічыцца аптымальным». Па-другое, адзначыў Прэзідэнт, у сярэднім па краіне ўраджайнасць ушчыльную наблізілася да 40 цэнтнераў з гектара. «У папярэднія гады, — падкрэсліў ён, — мы пра гэта толькі марылі. Дзесяць гадоў таму нават гаспадарак, якія дасягнулі такой ураджайнасці, было крыху больш за 50, а сёння больш за 50 цэнтнераў з гектара атрымана ў 13 раёнах і амаль у 250 гаспадарках. Перакрылі мяжу 60 цэнтнераў з гектара ў чатырох раёнах і амаль у 100 гаспадарках. Самая высокая ўраджайнасць дасягнута ў сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскага раёна — больш за 100 цэнтнераў з гектара». Прычым да гэтага ўзроўню ўшчыльную наблізіліся яшчэ шмат гаспадарак. На думку Аляксандра Лукашэнкі, асабліва важна тое, што ўстойліва высокія ўраджаі гэтыя прадпрыемствы даюць на працягу некалькіх гадоў. Іх вопыт, зазначыў ён, неабходна сістэмна і настойліва рухаць па ўсёй краіне, ва ўсіх гаспадарках.

Фота БЕЛТА.

«Вынікі працы на хлебнай ніве ўпэўнена сведчаць пра тое, што мы навучыліся эфектыўна працаваць на зямлі па высокіх еўрапейскіх стандартах»,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Важнейшым фактарам поспеху ён назваў рэалізацыю стратэгічнага курса беларускай дзяржавы на пад'ём аграрнага сектара нашай эканомікі. «Мы ў сціслыя тэрміны змаглі забяспечыць вёску айчыннай тэхнікай, насеннем, угнаеннямі, актыўна ўкараняем найноўшыя тэхналогіі, навуковыя распрацоўкі, перадавыя прыёмы арганізацыі працы, спецыялізацыю гаспадарак і цэлых раёнаў. Мадэрнізуем перапрацоўчыя прадпрыемствы, імкнучыся разам звязаць увесь працэс вытворчасці харчавання — ад хлебнага поля да паліц магазінаў. Рэалізуючы гэты курс, мы з году ў год няўхільна нарошчвалі ўкладанні ў аграпрамысловы комплекс», — сказаў ён.

Паводле ацэнкі кіраўніка краіны, сёлета ў аптымальныя тэрміны быў пасеяны і своечасова сабраны ўраджай. Без лішняга абвастрэння сітуацыі. «Так і павінна быць у нармальным добраадладжаным гаспадарчым механізме», — канстатаваў ён. Гэтак жа працуюць і жывёлаводы. Амаль на 9 працэнтаў павялічылася вытворчасць малака, на 10 працэнтаў узраслі аб'ёмы прадукцыі мясной жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі. Што стала вынікам стварэння неабходнай кармавой базы, укаранення рэсурсазберагальных тэхналогій вытворчасці. У бліжэйшыя два гады, паведаміў Прэзідэнт, у рэспубліцы будзе пабудавана дадаткова 118 буйных сучасных малочнатаварных комплексаў, якія дапамогуць кожнаму раёну яшчэ больш дынамічна развіваць жывёлагадоўлю.

Фота БЕЛТА.

Станоўчыя вынікі развіцця аграрнай галіны дазволілі надаць больш увагі сацыяльнай сферы. «У гэтым годзе ў вёсцы ўжо пабудавана 350 тысяч квадратных метраў жылля, — зазначыў Аляксандр Лукашэнка. — У цэлым жа за год вяскоўцы атрымаюць 7,5 тысячы добраўпарадкаваных дамоў, кватэр памерам у сярэднім каля 80 квадратных метраў. Гэтаму могуць пазайздросціць і жыхары горада».

Акрэсліваючы далейшыя перспектывы для аграрыяў, Прэзідэнт зазначыў, што налета, у наступныя год-два неабходна замацавацца на той вышыні, якая была ўзята сёлета. «Зробім гэта — будзем багатымі людзьмі». Ён патлумачыў, што ў свеце ўсё больш абвастраецца харчовы крызіс. У гэтых умовах харчаванне з'яўляецца па-сапраўднаму стратэгічным рэсурсам, які не толькі становіцца важнай крыніцай папаўнення валютных запасаў краіны, але і забяспечвае і сацыяльна-палітычную стабільнасць краіны. «Сёння буйныя краіны трацяць каласальныя сродкі на тое, каб накарміць людзей. Харчаванне, пітная вада, якіх у нас у дастатку, карыстаюцца вялікім попытам на сусветных рынках. Давайце іх будзем прадаваць. Але каб іх прадаваць усё больш і больш, неабходна абавязкова дабіцца збору гэтых 10 мільёнаў тон», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Будзе так — будзем квітнеючай краінай, узновім усе нашы вёскі, створым нармальнае жыццё для сялянства. Як упэўнены кіраўнік краіны, Беларусь мае патэнцыял для атрымання ў перспектыве 12—13 мільёнаў тон збожжа. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што на працягу гэтай пяцігодкі і аднаго-двух гадоў наступнай у рэспубліцы будуць завершаны работы па выратаванні сельскай гаспадаркі і ўзнаўленні вёскі.

Пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы збожжа-вых сярод абласцей стала сёлета Гродзеншчына. Праца сялян гэтай вобласці, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, увянчана самай высокай прыбаўкай ураджаю да мінулага года — 14 цэнтнераў з гектара, альбо ў паўтара раза. Агульны збор збожжа перавысіў 1,7 мільёна тон. «Гродзенцы паказалі дастойны прыклад таго, як трэба працаваць», — зазначыў кіраўнік дзяржавы.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НА ВЫБАРАХ ПАВІННЫ БЫЦЬ МАКСІМАЛЬНА ЗАБЯСПЕЧАНЫ ЎМОВЫ ДЛЯ СВАБОДНАГА ВОЛЕВЫЯЎЛЕННЯ ГРАМАДЗЯН»

У Беларусі праводзіцца беспрэцэдэнтна адкрытая выбарчая кампанія. Пры гэтым прынцыпы сумленнасці і дэмакратычнасці павінны быць няўхільна захаваны і на заключных этапах выбараў. Аб гэтым заявіў 22 верасня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час нарады аб ходзе выбарчай кампаніі ў краіне.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, выбарчая кампанія па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання выйшла на фінішную прамую. З 23 верасня пачынаецца датэрміновае галасаванне.

«Мы зрабілі ўсё, каб выбарчы працэс праходзіў адкрыта, сумленна, дэмакратычна, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Гэтыя прынцыпы павінны быць няўхільна захаваны і на заключных этапах выбараў. Менавіта таму на цяперашнюю нараду запрошаны губернатары і ўпаўнаважаныя прадстаўнікі Прэзідэнта па абласцях і гораду Мінску, якія непасрэдна павінны стварыць усе неабходныя ўмовы для свабоднага волевыяўлення грамадзян».

«Яшчэ да пачатку выбарчай кампаніі я абяцаў, што мы яе правядзём узорна. Не буду ўтойваць: мы зацікаўлены ў тым, каб новы парламент быў прызнаны на міжнароднай арэне. Але гэта не самамэта. Больш важна, каб нававыбраны парламент быў сапраўды народным і карыстаўся аўтарытэтам, перш за ўсё ў нашых грамадзян. Выбары мы праводзім для сябе, таму яны павінны прайсці ў строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аналізуючы мінулы перыяд выбарчай кампаніі, можна сцвярджаць, што патрабаванні да яе цывілізаванага правядзення выкананы, перакананы Прэзідэнт. «Мы стварылі беспрэцэдэнтныя ўмовы адкрытасці гэтай кампаніі, запрасіўшы практычна ўсіх жадаючых ажыццяўляць назіранне за ходам выбараў. Сёння акрэдытавана больш за 400 міжнародных назіральнікаў, і гэта лічба да нядзелі павялічыцца ў 2,5 раза. Гэта значыць іх будзе больш за тысячу», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што беларускі бок не абмяжоўваў час знаходжання назіральнікаў у краіне, не карэктаваў персанальны склад місій, хоць меў на гэта поўнае права, паколькі асобным назіральнікам уезд у краіну быў закрыты «ў сувязі з іх беспардоннымі паводзінамі ў час папярэдняга знаходжання ў нашай краіне».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што выбарчым органам, «мякка кажучы, давялося заплюшчыць вочы на некаторыя хібы ў афармленні дакументаў кандыдатамі ў дэпутаты для таго, каб у выбарах магла прыняць удзел максімальна магчымая колькасць кандыдатаў, прадстаўнікоў шырокага спектра палітычных партый».

«Больш за ўсё заплюшчвалі вочы на «выхадкі» кандыдатаў ад так званай апазіцыі, каб яны не бегалі і не плакалі, што іх не зарэгістравалі, — сказаў Прэзідэнт. — У выніку зарэгістравана амаль 80 працэнтаў ад агульнай колькасці вылучаных кандыдатаў. Для параўнання: у 2004 годзе гэта лічба складала каля 47 працэнтаў».

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ:

«Сусветны крызіс на кошт мінскіх кватэр можа паўплываць толькі ўскосна»

Крызіс іпатэчных неплацяжоў у ЗША пацягнуў за сабой сёння праблемы ліквіднасці заходніх банкаў і банкруцтва асобных страхавых кампаній Амерыкі і Еўропы. Сусветны фінансавы абвал ужо балюча ўдарыў па рынку нерухомасці ЗША, дзе элітная нерухомасць патанела амаль у два разы. Пэўныя эканамісты прагназуюць, што сусветны «чорны аўторак» прывядзе да патаннення жылля і ў Еўропе, а потым, магчыма, і ў нашай краіне...

Старшыня Савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ лічыць, што кватэры ў Мінску могуць істотна патаннець у тым выпадку, калі ў сталіцы будзе будавацца сапраўды шмат жылля для розных сацыяльных катэгорый. Сабекошт квадратнага метра жылля ў камерцыйных забудоўшчыкаў складае цяпер 1000—1200 долараў. Істотнае павелічэнне прапаноў новага жылля па прымальных цэнах абавязкова адаб'ецца і на кошце кватэр на другасным рынку жылля.

На думку Мікалая Прасталупава, сусветны фінансавы крызіс не можа стаць першапрычынай рэзкага патаннення жылля ў Беларусі. Сусветны крызіс можа паўплываць на рынак жыллёвай нерухомасці нашай краіны толькі ўскосна, у выпадку, калі, напрыклад, пагоршыцца эканамічная сітуацыя ў краіне, што адпаведна прывядзе да зніжэння плацежаздольнасці радавых грамадзян. Спадар Прасталупаў лічыць, што так моцна сусветны крызіс не можа ўдарыць па кішэнях беларусаў, бо ў нас існуе самадастатковая эканоміка, у якой прысутнічае невялікая колькасць запазычаных фінансавых сродкаў.

Разам з тым сёння ў чэргах маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Мінску налічваецца каля 220 тысяч сем'яў. За год у сталіцы рэгіструецца больш за 7 тысяч здзелак па куплі-продажы жыллёвай нерухомасці. Відавочна, што другасны рынак жылля ў Мінску нават часткова не вырашыць праблему чаргавікаў.

Кіраўнік Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» упэўнены, што тэндэнцыя на невялікае падаражэнне другаснага жылля ў Мінску будзе працягвацца да сярэдзіны снежня. Як будуць паводзіць сябе жыллёвыя цэннікі надалей, залежыць галоўным чынам не ад наступстваў фінансавага крызісу, а ад актывізацыі будаўнічых структур па лініі масавага долевага будаўніцтва.

Сяргей КУРКАЧ.

Вадзім ПАПОЎ:

«МЭТА ЗАКОНАЎ — ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЦЦЯ»

2 кастрычніка адкрыецца дзявятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі трэцяга склікання. Пра заканатворчыя прыярытэты сесійнай тэматыкі «Звяздзе» расказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Вадзім ПАПОЎ.

— Вадзім Аляксандравіч, кожная парламенцкая сесія мае тэматычныя асаблівасці. Якімі яны бачацца Вам у гэты сесійны перыяд, тым больш што ён будзе карацейшым, чым звычайна, у сувязі з заканчэннем паўнамоцтваў цяперашніх дэпутатаў?

— Са звыш чым 40 законапраектаў і іншых дакументаў, уключаных на сёння ў сесійны графік, падрыхтаваны ўжо больш за палову. У прыкладнай праграме сесіі я выдзеліў бы тры асноўныя блокі пытанняў. Цэнтральны — абмеркаванне праекта Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2009 год» і ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы аб падаткаабкладанні. Акрамя гэтага, дэпутаты разгледзяць блок новых законапраектаў, якія ўпершыню вызначаць прававую аснову шэрагу грамадскіх адносінаў, а таксама прымуць рашэнні па блоку паправак у дзеючае заканадаўства, сярод якіх варта выдзеліць карэкціроўку Закона «Аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва», чым завяршаецца стварэнне заканадаўчага базісу для развіцця ў Беларусі ядзернай энергетыкі. Да месца сказаць, сродкі на будаўніцтва ў нашай краіне атамнай электрастанцыі ўжо закладваюцца ў бюджэце. Праект бюджэту і прапанаваныя змяненні і дапаўненні ў некаторыя законы аб падаткаабкладанні плануем разгледзець у першым чытанні на першым жа пленарным пасяджэнні сесіі, як і ратыфікацыю Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб урэгуляванні пытанняў уласнасці Саюзнай дзяржавы.

— Ці не пашкодзіць высокая аператыўнасць абмеркавання законапраекта «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2009 год» і карэкціроўкі падаткаабкладання якасці гэтага надзвычай важнага нарматыўнага акта?

— За такой аператыўнасцю трэба бачыць вельмі вялікую і складаную папярэднюю працу, праведзеную парламентарыямі сумесна з Саветам Міністраў, Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іншымі ўдзельнікамі бюджэтнага працэсу. Асноўныя паказчыкі, зафіксаваныя ў рэдакцыі бюджэту, унесенай на разгляд Палаты прадстаўнікоў, і напрамкі бюджэтна-падатковай палітыкі прайшлі сур'ёзную экспертызу і абмеркаванне не толькі на ўзроўні міжведамаснай рабочай групы і Мінфіна, але і на неаднаразовых пасяджэннях Савета Міністраў, яго Прэзідыума, профільных парламенцкіх камісій, у тым ліку сумесных з удзелам адказных работнікаў органаў дзяржаўнага кіравання. Выказваліся розныя заўвагі і прапановы, найбольш канструктыўныя з якіх улічаны. Вялікае значэнне ў дапрацоўцы законапраектаў мела нарада па гэтых пытаннях, праведзеная ў кіраўніка дзяржавы А.Р. Лукашэнкі.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Камандзіроўка па пісьму

КАНАЛІЗАЦЫЯ «НА ХАЛЯВУ», або Некаторыя нюансы месцачковай маралі

У нашу газету прыйшоў ліст з Ляхавіч, пад якім паставілі подпісы 14 чалавек. Людзі просяць, каб «Звязда» ва ўсім разабралася і дапамагла. Газета ж са свайго боку заўсёды імкнецца паспрыяць сваім прыхільнікам.

Усё пачалося ў 2002 годзе, калі домаўладальнікі па завулку Усходнім вырашылі правесці ад сваіх дамоў каналізацыю. Неабходна было пракласці больш за 400 метраў трубаў, а да гэтага яшчэ і заказаць праект. У сакавіку людзі яго атрымалі, а праз месяц райвыканкам даў дазвол на правядзенне работ. Далей падзеі развіваліся наступным чынам: трубы, люкі, муфты... людзі закупілі за свае грошы, а яшчэ аплацілі за раскопку вуліц і ўкладку трубаў. Работы гэтыя праводзіла ПМК-16.

Траса прайшла па завулку Усходнім, а затым выйшла на вуліцу Пушкіна і працягнулася па яе левым боку ад павароту. Гаспадары з вуліц, каля дамоў якіх праходзіла каналізацыя, таксама ўвайшлі ў суполку, і ўсяго набралася 17 чалавек, якія ўнеслі грошы.

Напачатку пракласці каналізацыю хацелі жыхары і астатніх дамоў вуліцы Пушкіна (з 24 па 47 нумар), але нечакана перадумалі ці па нейкай яшчэ прычыне не сталі ўносіць грошы і засталіся пры сваіх інтарэсах.

Адстойнікі пры дамах — гэта неабходнасць пастаяннага адпампоўвання адходаў, а смурод і мухі даймаюць летам. Убачыўшы, што цэнтральная каналізацыя мае вялікія выгоды, праз 5 гадоў да пракладзенай ужо трасы вырашылі падключыцца і астатнія дамы. Там таксама ўтварылася суполка з 16 чалавек. Па вуліцы каля сваіх дамоў яны праклалі трубы і падвялі трасу да каналізацыі, якая ўжо функцыянуе і абслугоўваецца гэтыя гады тымі, хто яе праклаў.

— Колькі разоў даводзілася яе чысціць, бо то тут, то там забіваюцца трубы. Іншым разам вылезеш — затым адмыцца цяжка, — кажа Леанід Шкляннік, бо яму найчасцей даводзілася наводзіць парадак.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 23.09.2008 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
1 долар ЗША	2 112,00	Цэнтрабанк РФ	
1 еўра	3 075,18	USD	25,2690
1 латвійскі лат	4 342,55	10 UAH	50,5886
1 літоўскі літ	890,61	1000 BYR	11,9645
1 чэшская крона	127,95	EUR	36,6274
1 польскі злоты	936,59	Курс у гандлёвых кампаніях (на 22.09.2008 г.)	
1 расійскі рубель	83,58	USD	2135 / 2210
1 украінская грыўня	422,82		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

Тыдзень бабінага лета, аднак уначы замаразкі

Ужо з аўторка тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў моцнага скандынаўскага антыцыклону, які выцісне ад нас воблачнае і дажджлівае надвор'е на поўдзень Еўропы, паведаміў **начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.** У другі дзень тыдня невялікія дажджы яшчэ будуць месцамі назірацца на поўдні краіны. Тэмпература паветра ўдзень 9—16 градусаў. На ўсёй тэрыторыі краіны «дарослае» бабіна лета будзе гаспадарыць з серады да суботы ўключна. Ападкаў у гэтыя дні ўвогуле не прадбачыцца, бо будзе даволі сонечна, толькі месцамі невялікая воблачнасць. Праўда, уначы халаднавата — тэмпература паветра 3—9 градусаў, месцамі замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў. Тэмпература паветра ўдзень 12—17 цяпла. Аднак ужо з нядзелі надвор'е зноў пагоршыцца. У гэты дзень да нас завітае атлантычны цыклон, які прынясе працяглыя дажджы, месцамі ўзмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы 5—11, удзень — 8—14 градусаў. Сіноптыкі паведамляюць, што чарговай хвалі бабінага лета ў пачатку кастрычніка не прадбачыцца.

Сяргей КУРКАЧ.

У беларускай эканоміке дастатковы запас трываласці

Нацыянальны банк не плануе прымяняць ніякіх дадатковых мераў у галіне грашова-крэдытнай палітыкі і рэгуляванні дзейнасці банкаў у сувязі з сітуацыяй, што ўзнікла на шэрагу сусветных фінансавых рынкаў, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Звязана гэта з устойлівым становішчам асноўных эканамічных і фінансавых партнёраў нашай краіны. У айчыннай эканоміке — дастатковы запас трываласці, як і ў яе банкаўскай сістэмы. Так, за леташні год і мінулы перыяд гэтага золатавалютныя рэзервы Беларусі ўзраслі больш як у 3 разы і на 1 верасня ў нацыянальным вызначэнні склалі звыш 5,6 мільярда долараў ЗША. На працягу ўсяго года ўзровень ліквіднасці банкаўскага сектара істотна перавышае бягучыя патрэбы.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ОАО «Белтрансгаз» совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 6 (шести) газотурбинных двигателей НК-12СТ. Начальная стоимость с НДС – 2 703 027 001 бел. руб. Задаток в размере 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **23.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания ателье № 5, об. пл. 155,0 кв.м, расположенное: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Площадь зем. уч. 0,0595 га. Начальная цена снижена на 20 % и составляет с НДС – 64 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **21.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже жилого дома об. пл. 64,5 кв.м, расположенного на земельном участке пл. 0,1240 га (водоохранная зона реки Сервечь), по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, г.п. Кривичи, ул. Набережная, д. 13. Начальная цена – 18 440 958 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2007 г. Аукцион состоится **21.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» УНП 690324015.

Сяргей Сідорскі чакае істотнага павелічэння тавараабароту Беларусі з Растоўскай вобласцю

Сяргей Сідорскі лічыць мэтазгодным абмеркаваць на бліжэйшым пасяджэнні саюзнага Саўміна новую праграму сельгасмашынабудавання.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі лічыць мэтазгодным абмеркаваць на бліжэйшым пасяджэнні саюзнага Саўміна новую праграму сельгасмашынабудавання. Аб гэтым ён заявіў у час наведвання ТАА «Камбайнавы завод «Растсельмаш».

Беларускі прэм'ер таксама адзначыў, што неабходна прапрацаваць пытанне фінансавання адпаведных праграм у рамках бюджэту Саюзнай дзяржавы.

У ходзе перагавораў з кіраўніцтвам «Растсельмаша» па пытаннях перспектыў развіцця партнёрскіх адносінаў з ВА «Гомсельмаш» было закранута пытанне неабходнасці аб'яднання намаганняў прадпрыемстваў для больш паспяховага прасоўвання прадукцыі на рынках СНД.

Сяргей Сідорскі чакае істотнага павелічэння тавараабароту Беларусі з Растоўскай вобласцю. Аб гэтым кіраўнік беларускага ўрада заявіў на сустрэчы з губернатарам Растоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Чубам.

Растоўская вобласць цяпер з'яўляецца адным з вядучых гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі. Сяргей Сідорскі выказаў надзею, што яго цяперашні візіт у расійскі рэгіён будзе садзейнічаць актывізацыі кантактаў паміж бакамі, нарошчванню ўзаемнага тавараабароту.

У сваю чаргу губернатар Растоўскай вобласці Уладзімір Чуб, гаворачы аб перспектывах узаемадзеяння бакоў, адзначыў, што «Галоўнае, каб супрацоўнічалі прадпрыемствы, людзі. Мне імпануе тое, што мы ўжо саперничаем, хто больш адзін у аднаго набудзе. Пакуль перавага на беларускім баку», — дадаў Уладзімір Чуб.

Тавараабарот Беларусі і Растоўскай вобласці за сем месяцаў гэтага года склаў $206,4 млн і ў параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года павялічыўся на 39,1 працэнта. Пры гэтым экспарт дасягнуў $136,7 млн і павялічыўся на 48,9 працэнта, імпарт — $69,7 млн і ўзрос на 23,2 працэнта. Сальда знешняга гандлю склалася дадатнае ў памеры $67 млн.

БЕЛТА.

«Жывая» вакцына мае свае перавагі

627 тысяч дозаў жывой інтраназальнай вакцыны і 12 тысяч дозаў інактываванай вакцыны «Грыпол» закуплена сёлета за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту для правядзення бясплатнай процігрыпознай імунізацыі асобаў з груп высокай рызыкі развіцця постгрыпозных ускладненняў і высокай рызыкі інфіцыравання.

Да групы высокай рызыкі развіцця цяжкіх наступстваў у выніку перанесенага захворвання на грып адносяцца асобы з хранічнымі захворваннямі дыхальнай, сардэчна-сасудзістай сістэм, эндакрыннай сістэм, з парушэннямі функцыі нырак ці гемаглабінапатыяй, з імунадэфіцытамі, у тым ліку ВІЧ-інфіцыраваныя, і асобы, што праходзяць імунасупрэсіўную тэрапію, дзеці і падлеткі, якія знаходзяцца на працяглай аспірынатэрапіі, і асобы ва ўзросце за 65 гадоў. Да групы высокай рызыкі інфіцыравання адносяцца асобы, якія з-за сваёй прафесійнай дзейнасці маюць высокую верагоднасць захварэць на грып: гэта медыцынскі персанал, персанал дамоў дзіцяці, дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, работнікі птушкапрацоўчых прадпрыемстваў, ветэрынарныя работнікі, арнітолагі і некаторыя іншыя.

Як патлумачыла ў гутарцы з журналістам «Звязды» загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі і эпіднагляду за паветрана-кропельнымі інфекцыямі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка Шымановіч, расійская інактываваная вакцына «Грыпол», якая не ўтрымлівае жывых вірусаў і ўводзіцца ў арганізм з дапамогай ін'екцыі, прызначаецца для вакцынацыі дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. А «жывая» грыпозная вакцына прызначаецца для больш старэйшых дзяцей, а таксама для дарослых. Яна рыхтуецца з вакцынных штамаў, рэкамендаваных Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя на будучы эпідсезон, таксама як і інактываваная вакцына. Але жывая вакцына ўводзіцца шляхам распылення ў насавыя хады (фактычна яна паўтарае шлях, якім вірус трапляе ў арганізм чалавека), што дазваляе сфарміраваць мясцовы імунітэт на слізістай носа — уваходных дзвярах для рэспіраторных вірусных інфекцый. Да таго ж для дзяцей увядзенне вакцыны шляхам распылення ў насавых праходах з'яўляецца менш траўматычным, чым увядзенне з дапамогай уколу.

Па словах Веранікі Шымановіч, дадаткова вакцыны будуць закупляцца для правядзення бясплатнай вакцынацыі і за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў. Так, напрыклад, у сталіцы плануецца закупіць за кошт гарадскога бюджэту яшчэ 43 тысячы дозаў процігрыпознай вакцыны. Да таго ж, як і ў папярэднія гады, у беларусаў, якія не могуць прэтэндаваць на бясплатную прышчэпку, але таксама хочуць абаранiцца ад грыпу, будзе магчымасць зрабіць прышчэпку за ўласны кошт. Як сведчыць вопыт апошніх гадоў, асаблівы інтарэс да платнай вакцынацыі праяўляюць фірмы, арганізацыі і прадпрыемствы, якія спрабуюць такім чынам мінімізаваць будучыя эканамічныя страты.

Беларускія спецыялісты сцвярджаюць, што дазволіць сабе ахапіць бясплатнай імунізацыяй усё насельніцтва, не можа сёння ніводная, нават заможная краіна свету. Паводле меркавання спецыялістаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, для таго, каб рэальна ўплываць на эпідпрацэс, неабходна вакцынаваць да 95 працэнтаў насельніцтва краіны. Між іншым, дзеяння вакцыны хапае толькі на адзін эпідсезон. Кожны год антыгенны склад вакцыны змяняецца з улікам прагнозаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя на будучую эпідэмію для кожнага з паўшар'яў.

Медыкі папярэджваюць, што самыя безабаронныя перад грыпам — старыя людзі і дзеці. У першых імунная сістэма ўжо «зношаная», а ў другіх — яшчэ знаходзіцца ў працэсе фарміравання. Да таго ў кожнага дарослага чалавека маюцца клеткі імуналагічнай памяці, і калі ён хоць аднойчы быў інфіцыраваны пэўным штамам віруса грыпу, то ў наступны раз будзе да сустрэчы з ім падрыхтаваны. А ў немаўлят такіх клетак няма, таму ім пажадана рабіць прышчэпкі ад грыпу.

Паводле папярэдніх эпідпрагнозаў, чакаць прыходу грыпознай хвалі на тэрыторыю Беларусі трэба напрыканцы студзеня — лютым. Гэта для беларусаў традыцыйна самы «грыпозны час». Праўда, у асобныя гады эпідэмія ахоплівала тэрыторыю Беларусі ў лістападзе-снежні ці затрымлівалася са сваім прыходам да сакавіка. Ахоўны эфект вакцыны канчаткова фарміруецца праз тры тыдні пасля імунізацыі. Таму ў беларусаў яшчэ будзе час, каб прышчапіцца. Закупленыя за сродкі рэспубліканскага бюджэту вакцыны ўжо знаходзяцца на складах «БелФармацыі». Наколькі хутка распачнецца вакцынацыя, залежыць у многім ад аператыўнасці ўстаноў аховы здароўя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НА ВЫБАРАХ ПАВІННЫ БЫЦЬ МАКСІМАЛЬНА ЗАБЯСПЕЧАНЫ ЎМОВЫ ДЛЯ СВАБОДНАГА ВОЛЕВЫЯЎЛЕННЯ ГРАМАДЗЯН»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Мы пайшлі насустрач пажаданням кандыдатаў у дэпутаты і наглядальнікаў і ў два разы павялічылі час для агітацыі па тэлебачанні і радыё. Прычым бясплатна — усё гэта аплачваецца дзяржавай!» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што Міністэрству замежных спраў дадзена дакладнае ўказанне «забяспечыць своечасовую выдачу віз каротказтэрміновым наглядальнікам і прадстаўнікам СМІ, а таксама аператыўна акрэдытоўваць журналістаў, якія прыбываюць асвятляць выбары».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ён «свядома абсалютна не ўмешваўся і не ўмешваецца ў выбарчы працэс, каб не даць падставу папракнуць уладу нават у самым малым націску». Акрамя таго, было катэгарычна забаронена якоенебудзь умяшанне з боку Адміністрацыі Прэзідэнта і іншых дзяржаўных органаў. «Мы дамовіліся, што штабам на гэты перыяд у краіне становіцца ЦВК і яе старшыня», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым з губернатараў і мэра Мінска не здымаецца адказнасць за строгае захаванне парадку і дысцыпліны. Звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, Прэзідэнт паставіў задачу: «Забяспечыць парадак з заўтрашняга дня, паколькі з 23 верасня пачынаецца датэрміновае галасаванне, і асабліва ў нядзелю, а таксама роўныя правы ўсіх кандыдатаў у дэпутаты і выбаршчыкаў». «Любыя намеры, якія парушаюць мір, стабільнасць, спакой грамадзян, павінны спыняцца неадкладна», — заявіў ён. — Звяртаю асаблівую ўвагу на тое, што дзейнічаць вы павінны, выходзячы не з мясцовых інтарэсаў, а з дзяржаўных пазіцый. Ніякай самадзейнасці і самавольства быць не павінна! Кіраванцца трэба толькі Канстытуцыяй і дзеючымі законамі».

Задача праваахоўных органаў — падтрыманне дысцыпліны, парадку і стабільнасці ў краіне.

«Разладзіць абстаноўку ў Беларусі ў час выбарчай кампаніі нікому не будзе дазволена, нягледзячы на міжнародную рэакцыю. Мы не дапусцім ніякіх беспарадкаў нідзе — ні ў Мінску (хоць вы ведаеце, што калі спробы будуць, то гэта будзе толькі ў Мінску, нідзе ў іншых гарадах гэтага не будзе), — сказаў Прэзідэнт. А тут вось могуць паспрабаваць паказаць: глядзіце, «улады зноў нас задушылі». Таму адразу папярэджваю: усё, што дазволена законам, — калі ласка».

«Паглядзіце, выбары яшчэ не пачыналіся, а апазіцыя пагражае ўжо байкотам і збірае палаткі для арганізацыі другога «майдана» ў той час, як толькі закрыюцца ўчасткі для галасавання. Яшчэ вынікаў не будзе, а яны ўжо гатовы зрабіць нешта накшталт «украінскага варыянта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Яны не ведаюць, як прыкрыць сваю бездапаможнасць і канчаткова не абняславіцца перад усім светам сваім нізкім аўтарытэтам ва ўласнай краіне. Трэба ж як-небудзь перад спонсарамі апраўдвацца», — дадаў Прэзідэнт.

У час нарады кіраўнік дзяржавы прывёў даныя сацыялагічных апытанняў, згодна з якімі каля 85 працэнтаў грамадзян Беларусі гатовы прыняць удзел у маючых адбыцца парламенцкіх выбарах. «Гэта вельмі вялікі працэнт. Большая частка людзей лічыць гэта сваім грамадзянскім абавязкам, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Грамадзяне Беларусі не падвялі нас ні ў адной з выбарчых кампаній, заўсёды дэманстравалі высокую яўку і дысцыпліну. Упэўнены, што так будзе і на гэты раз».

Прэзідэнт упэўнены, што «народ даўно вызначыўся і ведае, за кага галасаваць». «Беларусы ніколі не купляліся на пустыя словы і абяцанні, яны могуць адрозніць палітычнага авантурыста ад дастойнага чалавека. Нашы людзі галасуюць за кандыдатаў «ад жыцця», за тых, хто паказаў сябе прафесіяналам на сваім рабочым месцы, хто ведае чаканні і праблемы простага народа, здольны іх вырашаць», — сказаў ён.

Спасылаючыся на даныя сацапытанняў, Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што «беларусы хочуць бачыць у парламенце дэпутатаў, якім уласцівы сумленнасць, паважлівае стаўленне да людзей, вернасць слову і дзяржаўнае мысленне».

«Народ правільна лічыць. У парламенце павінны быць прыстойныя людзі. Я не сумняваюся, што выбаршчыкі аддадуць свае галасы за кандыдатаў, якія будуць прыносіць рэальную карысць краіне, яе грамадзянам, а не прыйдуць у парламент з мэтай набіць сабе кішэні і пакрычаць. Крыкуны там не патрэбны», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуўся да людзей з просьбай не прад'яўляць да дэпутатаў залішнія патрабаванні. «Дэпутаты павінны ствараць законы, прадстаўляючы інтарэсы людзей у парламенце. Яны не будуць працаваць ні за ўрад, ні за губернатараў, ні за старшынь райвыканкамаў і ўказваць ім, як працаваць, таксама не будуць. У нас дзейнасць заканадаўчай і выканаўчай галін улады строга рэгламентавана, іх паўнамоцтвы падзелены», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым дэпутат, адстойваючы інтарэсы сваіх выбаршчыкаў, абавязаны звяртаць увагу ўлады на праблемныя пытанні, якія хвалююць людзей, лічыць Прэзідэнт.

На выбарчых участках павінны быць створаны камфортныя ўмовы, каб людзі ішлі на выбары, як на свята, бо менавіта ў гэтым павага да выбаршчыка, дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка зноў акцэнтаваў увагу на тым, што беларусы праводзяць выбары для сябе, для сваёй краіны і ў адпаведнасці з існуючым заканадаўствам, сумленна і адкрыта.

«Падкрэсліваю: я задаволены ходам выбарчай кампаніі. Мне гаварыць: ціха, спакойна, амаль нячутна, што выбары ідуць. І дзякуй Богу, што ціха і спакойна. Папрашу губернатараў расказаць аб тым, якія ёсць праблемы. Але ведаеце, мы ўжо так пад дудку наглядальнікаў і Захаду скакалі, што на месцах некаторыя кіраўнікі ўчастковых, акруговых камісій паціскаюць плячамі і задаюць пытанне: «Так можа, ужо Захад камандаваць і надалей будзе?» — я вобразна гавару. Таму хачу яшчэ раз папярэдзіць усіх: няхай гэта пачуюць кіраўнікі камісій на ўчастках, у Цэнтрвыбаркаме, у акруговых камісіях. Ва ўчастковых камісіях гаспадары — члены ўчастковых камісій і старшыні! Вось як яны скажуць — так павінна і быць. І той, хто сёння ставіць пытанне, што ўчастковыя камісіі — гэта, маўляў, другарадна, а вось мы, наглядальнікі і іншыя, прыйдзем, закасаем рукавы і будзем за некага там лічыць галасы, то скажу: у нас гэта ўсё рэгламентавана законам! Мы ні ад кога вынікаў не ўтойваем. Але гаспадары — старшыні ўчастковых камісій. Яны перш за ўсё адказныя за тое, як пройдуць выбары, як будзе забяспечаны падлік галасоў. Таму ўмешвацца ніякім наглядальнікам у сітуацыю не будзе дазволена! Хочаце як наглядальнікі вырашыць якое-небудзь пытанне — ідзіце да старшыні ўчастковай камісіі. Там Лідзія Міхайлаўна (Ярмошына) давяла ўсім: як сябе паводзіць, што рабіць згодна з законамі. І там вырашайце. Патрэбна якая-небудзь практычная дапамога, падтрымка — калі ласка, старшыні райвыканкамаў, сельскага Савета, кіраўнікі гаспадарак прымуць рашэнні аб яе аказанні», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў удзельнікам нарады аб тым, што ў кіраўніцтва ўжо пачалася работа па ліквідацыі наступстваў ураганаў. Пастаўлена задача да 1 кастрычніка аднавіць 100 працэнтаў электрасілкавання, 100 працэнтаў сувязі, 100 працэнтаў водазабеспячэння. Ён папрасіў губернатараў і мэра Мінска асабліва ўважліва паставіцца да гэтага пытання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«У вас на Беларусі вельмі добрыя дарогі. А калі ёсць добрыя дарогі, можна развівацца і разлічваць на інвестыцыі»,

— заўважыла падчас візіту на Гомельшчыну ваявода Любускага ваяводства Польшчы Хелена Хатка

Польская афіцыйная дэлегацыя другі дзень вывучае на Гомельшчыне магчымасці супрацоўніцтва на ўзроўні рэгіёнаў. Цяпер Польшча займае ў знешнегандлёвым абароце Гомельшчыны трэцяе месца. Усе прамысловыя гіганты вобласці — прадпрыемствы БМЗ, МНПЗ, Гомелькабель, Хімвалакно, Гомельшкло — актыўна працуюць з польскім бокам. Ёсць некалькі сумесных вытворчасцяў на СЭЗ «Гомель-Ратон».

Хелена Хатка адзначыла, што, у першую чаргу, хацела б намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, якія маглі б рэалізоўвацца ў межах супрацоўніцтва паміж Гомельшчынай і Любускім ваяводствам. На сёння ідзе дыялог па лініі гандлёва-прамысловых палат. Цікавым для нашай краіны можа быць супрацоўніцтва ў межах Еўрарэгіёна, асабліва гэта датычыцца Еўрарэгіёна «Днепр» і Еўрарэгіёнаў, што знаходзяцца як на тэрыторыі Польшчы, так і Германіі, якія з 90-х гадоў супрацоўнічаюць і маюць вялікі вопыт.

У дэлегацыі — некалькі прадпрымальнікаў, якія зацікаўлены ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў па будаўніцтве гандлёвых цэнтраў і невялікіх гатэляў з рэстаранчыкамі і кафэ ўздоўж аўтатранспартных магістраляў. Беларускі бок прапануе разгледзець магчымасць стварэння рэгіянальнага савета дзелавога супрацоўніцтва, які меў бы чатыры блокі — гандаль, інвестыцыі, інавацыі і турызм. Што датычыцца развіцця апошняга, як адзначае Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску Руслан Есін: «У нас у параўнанні з мінулым годам значна павялічылася колькасць выдадзеных візаў — у два з паловай разы больш, чым летась. Інтарэс палякаў да Беларусі вялізны, але ацэнкі не заўсёды станоўчыя — не хапае якасці сэрвісных паслуг. Мы хочам, каб нашы польскія партнёры разгледзелі магчымасць арганізацыі праграм для падрыхтоўкі спецыялістаў для работы ў сферы турыстычнага бізнэсу».

У праграме візіту — наведванне «Адміністрацыі СЭЗ «Гомель-Ратон», Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека, Палаца Румянцавых і Паскевічаў, беларуска-славянскай гімназіі № 36, Добрушскага раёна.

На сустрэчы з кіраўніцтвам Гомельскага аблвыканкама першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Баляслаў Пірштук падкрэсліў: «У апошнія гады ў рэспубліцы многа зроблена для таго, каб спрасціць многія бюракратычныя працэдуры, ёсць вялікі многа прэферэнцый. І не скарыстацца імі было б неапраўдана. Таму ў першую чаргу мы будзем працаваць з тымі партнёрамі, якія накіраваны на канкрэтныя вынікі».

В. АЎРАМЕНКА.

ДЗЕНЬ БЕЗ АЎТАМАБІЛЯ!

Кіраўнікі ўсіх 20 прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у структуру рэспубліканскага аўтатранспартнага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблаўтатранс», дабіраліся ўчора на працу пешшу, пакінуўшы службовыя і асабістыя аўтамабілі, ці на градскім транспарце. Такім чынам яны адзначылі Дзень без аўтамабіля, паведамілі на прадпрыемстве.

На працягу дня складана вызначыць, наколькі актыўна жыхары Прыдзвінскага краю ўсвядомілі неабходнасць падтрымаць акцыю. Тым не менш у Віцебску пасажырапаток у гэты дзень павялічыўся, адзначылі ў «Віцебскаблаўтатрансе». Дадатковыя аўтобусы ў гэты дзень на лініі не накіроўваліся, таму што ўсе маршруты цалкам укамплектаваныя патрэбнай колькасцю аўтатранспарту, дадалі на прадпрыемстве.

Праблема забруджвання паветра транспартам актуальная для Віцебска. Паводле даных гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, ад перасоўных крыніц забруджвання ў атмасферу абласнога цэнтра паступае каля 19 тыс. тон забруджвальных рэчываў у год. У выпадку поўнага спынення транспарту ў горадзе на адзін дзень колькасць шкодных выкідаў знізіцца на 0,01 працэнта ад гадавога аб'ёму.

Сяргей КОЧАТАЎ, БЕЛТА.

Здарэнні

ЗНОЎ ЛЯСНЫЯ БЛУКАННІ

На мінулым тыдні мы расказвалі пра тое, што мелі месца ў Лельчыцкім і Жыткавіцкім раёне выпадкі, калі людзі, адпраўляючыся ў лес за дарамі прыроды, падоўгу не могуць выбрацца адтуль і на пошукі іх выходзяць тады і выязджаюць работнікі службаў МНС, міліцыі, лясгасаў, насельніцтва.

І на гэты раз — тое ж самае. Так, пятнаццацігадовы школьнік з вёскі Курыцічы паехаў на веласіпедзе ў лес па грыбы і нават ноччу не вярнуўся дадому. Жыхара Светлагорска 1953 года нараджэння, які адправіўся па грыбы на дызель-цягніку, праз некаторы час знайшлі. Знайшлася і жанчына з Брагіна, якая ў кампаніі з родзічамі шукала ў лоеўскіх лясах грыбы, адстала ад усіх. Вядома ж, ні ў кога з названых жадання заблудзіцца не было. Але ўсё ж кожны павінен памятаць, што лес — гэта не парк. Тут патрэбна быць вельмі абачлівым.

Мы вырашылі даведацца больш падрабязна, чым закончыліся пошукі людзей, якія заблыталіся ў лесе. Як паведамілі нам з Жыткавіцкага райаддзела ўнутраных спраў, яшчэ 16 верасня 70-гадовы пенсіянер з вёскі Беражцы ў сем гадзін раніцы паехаў на матацыкле на балота збіраць журавіны. На другі дзень родзічы занерваваліся яго адсутнасцю дома, аб чым паведамілі ў міліцыю. У пошукі чалавека некалькі дзён уключаліся работнікі райаддзела па надзвычайных сітуацыях, міліцыі, лясгаса, жыхары населеных пунктаў. У паветра ўзнімаўся верталёт. У выніку ўдалося знайсці толькі матацыкл, а пенсіянер нібы скрозь зямлю праваліўся. Пошукі працягваюцца.

А вось што расказаў нам намеснік начальніка РАУС Петрыкаўскага раёна Васіль Белакур. У мінулую нядзелю ў 13 гадзін 15-гадовы Ігар Бокаў з Курыціч вырашыў паехаць у лес у грыбы. Колькі маці не адгаворвала яго, сын яе не паслухаў, асядлаўшы веласіпед. Ноччу дадому ён не з'явіўся, і тады ў пошукі вучня ўключылася насельніцтва, работнікі вышэйпамянёных арганізацый. Хлопца знайшлі пад хвойкай. Пад дажджом, які ішоў амаль усю ноч, ён прамок да ніткі і расказаў, што ездзіў на веласіпедзе, каб сагрэцца. Яго хутчэй даставілі дадому, у цёплае памяшканне, выклікалі ўрача.

У той жа дзень заблудзіліся ў лесе і два пенсіянеры-равеснікі, 1937 года нараджэння — Аляксандр Фёдараў з Міхедавіч і Аляксандр Ракіцкі з Навасёлак. Да апошняга з Мазыра ў госці прыехалі на легкавушцы дачка з зяцем і адправіліся ў грыбы за 20 кіламетраў ад населенага пункта. Набраўшы кошыкі, высыпалі іх у машыне. Зноў разышліся, і да вечара, колькі яго ні клікалі, ён не адгукаўся. У панядзелак раніцай звярнуліся ў міліцыю. Каля сарака чалавек шукалі яго. Аказваецца, пенсіянер даў такога кругаля ў лесе, што апынуўся на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, дзе яго падабраў вадзіцель лесавоза. Во было колькі слёз радасці, калі яго прывезлі дадому.

Падчас пошукавых работ удалося выявіць 48-гадовага жыхара пасёлка Вазнясенскі Чачэрскага раёна, які быў знойдзены ў лясным масіве без прытомнасці. Ён быў дастаўлен у раённую бальніцу, дзе памёр.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ОХ, НЯЛЁГКАЯ ГЭТА РАБОТА ВЫЦЯГВАЦЬ РАГУЛЮ З БАЛОТА. І КАНЯ — ТАКСАМА

Жыхар вёскі Якімаўка Светлагорскага раёна прывязаў сваю каро'ўку да калка на лугавінцы недалёка ад дома. Траўка там сакавітая, ды пад наглядам Маруся будзе. Пасвіся, маўляў, малачко здабывай.

Але рагуля, напэўна, свой розум і разлікі мела. Бо выслабанілася з-пад прымусоўкі гаспадара і пайшла сабе шукаць лепшы травастой. Ды трапіла ў балацянку. Колькі не спрабавала выкараскацца адтуль сама, толькі глыбей яе засмоктвала. Тады жалобным мыканне пачала клікаць падмогу. Гаспадар быў бяссільны выслабаніць яе адтуль. Гурт мужыкоў — таксама. Таму давялося звяртацца да работнікаў пажарна-аварыйнага выратавальнага атрада раёна. Там праявілі аператыўнасць і зрабілі сваю работу.

Падобны выпадак гэтымі днямі меў месца і ў Веткаўскім раёне. Толькі на гэты раз у балоце паміж вёскамі Свабода і Сініцына апынуўся конь. Намаганні людзей выцягнуць яго адтуль поспеху не мелі. Дапамаглі выратавальнікі, якія выкарысталі вяроўкі і сілу сваіх мускулаў. Яны ўпэўніліся, што... Глядзіце загаловак.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«ЖЫВУ І ПРАЦУЮ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ...»

Кажа кіраўнік сельскагаспадарчага акцыянернага таварыства «Негарэльскае» Валянціна САЧКО

Як бы празаічна ні гучала, што сельскаму кіраўніку наканавана класціся і ўставаць з думкамі пра ўраджаі, надоі і прывагі, клапаціцца пра працаўнікоў фермаў і палеткаў, у гэтых будзённых клопатах пра хлеб надзённы нямала і сваёй радасці. Умець захапляцца і радавацца дадзена ўсім, але ці кожны здольны захаваць лепшыя пачуцці ў штодзённых клопатах пра зямлю-карміцельку і рэалізавацца ў сваіх марах. У Валянціны Сачко — кіраўніка сельскай гаспадаркі «Негарэльскае» Дзяржынскага раёна без клопатаў і перажыванняў не праходзіць ніводзін дзень, тым больш у гарачы час жніва. Так званая, «нежаночая пасада» вымагае вырашаць процьму розных праблем, будаваць новыя планы, клапаціцца пра кожнага хлебароба і жывёлавода, не чакаючы ўдзячнасці. І між тым, «Негарэльскае» цяпер — лідзіруючая гаспадарка раёна, а яе кіраўнік — па-ранейшаму добразычлівы і спагадлівы чалавек, добрая маці і жонка, выдатная суседка.

Быць кіраўніком і заставацца сапраўднай захавальніцай хатняга ачага, дапамагаць вяскоўцам вырашаць жыллёвыя праблемы і рабіць прыгажэйшымі вуліцы і пасёлкі... Бадай, гэта і ёсць стыль і вобраз сучаснага кіраўніка, наогул, прынцыповае стаўленне да жыцця, незалежна ад пасады і абавязкаў.

Валянціна Сачко 12 гадоў працавала эканамістам у калгасе. У калектыве яе паважалі за добрасумленнае стаўленне да сваёй справы. Аб нейкай пасадзе кіраўніка яна не думала і не імкнулася да яе. Аднак у жыцці заўсёды ёсць нечаканыя моманты. Захварэў старшыня і трэба было тэрмінова перадаць гаспадарку ў надзейныя рукі. Прапанавалі Валянціне Міхайлаўне. Аднак яна рашуча адмовілася. Тады раённае кіраўніцтва пайшло на хітрасць. Яе папрасілі выконваць абавязкі старшыні, пакуль не знойдуць дастойнага кандыдата на пасаду.

Валянціна Міхайлаўна ніколі не ўмела працаваць абы-як і таму выконваць новыя абавязкі стала энергічна, з поўнай аддачай сілаў. Самой было цікава: ці атрымаецца ў яе несці гэтую цяжкую ношу? Кожны дзень яна глыбока і ўсебакова ўнікала ў праблемы гаспадаркі. І нічога дзіўнага не было ў тым, што на сходзе акцыянераў яе кандыдатуру вылучылі на пасаду дырэктара «Негарэльскага». Так яна стала кіраўніком вялікай гаспадаркі. Тады Валянціна Міхайлаўна паставіла перад сабой і калектывам амбіцыйную мэту: стаць у раёне лідарам. І гэта атрымалася. Праз год «Негарэльскі» выйшаў на першыя-другія месцы па ўраджайнасці збожжавых, цукровых буракоў, бульбы. За добрымі паказчыкамі была напружаная праца і навуковы, творчы падыход да справы.

У апошнія гады тут грунтоўна ўзяліся за вырошчванне рапсу. Добра зразумелі, што гэтая культура высокарэнтабельная, вельмі прыбытковая. Сёлета рапс пасеялі на плошчы 1300 гектараў. Ураджайнасць больш за 30 цэнтнераў.

Стыль працы Валянціны Міхайлаўны — высокая патрабавальнасць і спагадлівае стаўленне да кожнага працаўніка. Яна вельмі любіць, каб былі чысціня і парадак. Каб на кожнай сядзібе было прыгожа і ўтульна. Побач з вёскай Старына добраўпарадкавалі возера і яно стала месцам адпачынку вяскоўцаў і гасцей з Мінска.

Але не адзіным хлебам, як кажуць, жыве чалавек. Калі гэта пераадрасаваць да нашай гераіні, дык сёлета Валянціна скарыла яшчэ адну вышыню — асабістую: скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі. З чырвоным дыпломам...

Мікалай АМЕЛЬЧАНКА.
Фота аўтара.

Дзяржынскі раён.

Камарын быў першым

Сёння ў Камарыне пройдзе ўрачысты мітынг, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецкай навалы. Цікава, што менавіта гэты невялікі населены пункт у Брагінскім раёне стаў першым з вызваленых у далёкім 1943 годзе на тэрыторыі Беларусі.

Пасля разгрому фашыстаў на Курскай дузе немцы прыступілі да будаўніцтва так званага «Усходняга вала», які праходзіў па лініі Орша—Гомель і далей па рэках Сож і Днепр. Галоўнай перашкодай для савецкіх войскаў нямецкае камандаванне лічыла Днепр. Кажуць, Гітлер сказаў: «Хутчэй, Днепр пацячэ ў адваротны бок, чым рускія яго пераадолеюць».

Перад Савецкай арміяй стаяла задача не даць гітлераўцам замацавацца на правым беразе ракі. З гэтай мэтай войскі Цэнтральнага фронту пад камандаваннем генерала Ракасоўскага пачалі 26 жніўня 1943 года Чарнігаўска-Прыпяцкую наступленчую аперацыю. Падчас яе, 21 верасня, быў вызвалены Чарнігаў. Ворагі падрыхтаваліся да абароны Дняпра ля Камарына — тут быў размешчаны буйны гарнізон, але не чакалі, што атака савецкіх войскаў будзе так хуткa. Першымі на плытах і лодках у ноч на 22 верасня ў Камарын перапраўіўся атрад разведчыкаў 360-га стралковага палка 74-й дывізіі на чале з капітанам М. Паўлоцкім.

Адначасова партызаны на валах прыцягнулі да Дняпра гарматы і прыцэпы з боепрыпасамі, а таксама лодкі. Дзякуючы гэтай дапамозе 229-ы полк разам са знішчальна-супрацьтанкавым дывізіёнам і батарэяй артылерыі незаўважанымі перабраліся на правы бераг Дняпра. У тыя дні газета «Правда» пісала: «Гітлераўскія разбойнікі не разумелі, што для ўсяго савецкага народа Днепр — не проста шырокая і глыбокая рака, а рака — святыня, рака — калыска нашай культуры, рака — носьбіт народных былін і думак. Пачалася расплата немцаў за спробу выкарыстаць Днепр для сваёй абароны».

Раніцай 23 верасня Днепр у раёне Камарына пераадолеў 78-ы стралковы полк 74-й дывізіі. Захапіўшы і ўтрымаўшы ў кровапралітным баі, які ішоў чатыры гадзіны, плацдарм, полк забяспечыў пераправу галоўных сілаў дывізіі. Варожы гарнізон у Камарыне быў разгромлены, і хоць немцы рабілі спробы ліквідаваць гэты плацдарм, поспеху не дабіліся. Больш чым 20 воінам, якія вылучыліся пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Камарына, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 16 кастрычніка 1943 года было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза. Перамога дасталася дарагой цаной. У цэнтры пасёлка Камарын, у брацкай магіле пахавана 627 савецкіх воінаў і партызан, сярод іх — 6 Герояў Савецкага Саюза. Менавіта тут і праходзяць усе жалобныя мерапрыемствы, прысвечаныя 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

В. АЎРАМЕНКА.

Абзац

■ Налічаная сярэдняя зарплата працаўнікоў Беларусі сёлета ў жніўні склала Br938 тыс. 342. У папярэднім месяцы гэты паказчык быў Br923 тыс. 277. Налічаная сярэдняя зарплата рабочых і служачых у жніўні 2008 года склала Br948 тыс. 939 (у ліпені — Br941 тыс. 130).

■ **Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Беларусі заклікае вадзіцеляў быць асабліва ўважлівымі пры сезоннай міграцыі жывёлаў. У Беларусі расце колькасць сутыкненняў транспарту з жывёламі. Сёлета за першае паўгоддзе адбылося 99 ДТЗ з удзелам жывёлы, а за такі ж перыяд летась — 86. Асабліва небяспечнай і для вадзіцеляў, і для жывёлы становіцца восень: кабаны і ласі з лесу пачынаюць перамяшчацца з наступленнем змроку да кукурузных палёў. Толькі ўвечары 16 верасня адбылося 3 ДТЗ з удзелам дзікай жывёлы. Другі пік небяспекі настае раніцай, калі звяры вяртаюцца з месцаў кармлення. Спецыялісты раяць пры набліжэнні дзікай жывёлы, незалежна ад яе памеру, няхай нават гэта будуць жабы ці вожыкі, прытармазіць, прапусціць іх, а не прыбаўляць хуткасці ў надзеі праскочыць.**

■ Балгарскія бізнэсмены прапанавалі стварыць у Магілёве сучасны завод па выпуску віна. На думку балгарскіх вінаробаў, у магілёўчан ёсць вопыт і кваліфікаваныя кадры, а ў балгарскага боку — сучасныя тэхналогіі і натуральная сыравіна. Прапанова датычыцца выкупу Магілёўскага вінзавода і інвеставанне ў яго поўнае тэхперавузбраенне каля 1,5 млн еўра. Гэта дало б магчымасць выпускаць якаснае натуральнае сухое, паўсухое, паўсалодкае вінаграднае віно.

■ **У Астраханскай вобласці трое вясковых жыхароў шпіталізаваны з прыкметамі сібірскай язвы. Паводле папярэдняй інфармацыі, крыніцай заражэння стала ўжытае мяса забітай жывёлы. У раёне працуе спецыяльна створаная камісія.**

■ Славутая статуя «Давід» работ

«СЁЛЕТНІ ГОД БУДЗЕ ЗАЛАТЫМІ ЛІТАРАМІ ЎПІСАНЫ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт адзначыў, што ўсе рэгіёны рэспублікі папрацавалі паспяхова і значна перавыканалі свае абавязацельствы. Найбольшы аб'ём збожжавых сабраны ў Мінскай вобласці — амаль 2,5 мільёна тон. Калі ж улічыць тое, што на Міншчыне сканцэнтравана больш за чвэрць збожжавых плошчаў краіны, то яе, сказаў Аляксандр Лукашэнка, правамерна можна назваць галоўнай беларускай жытніцай, якая ўносіць найбольшы ўклад у агульнарэспубліканскі намалот збожжа.

Значна зрушыліся ў нарошчванні ўраджайнасці збожжавых і хлебаробы Магілёўшчыны, якія занялі другое месца ў рэспубліцы па гэтым паказчыку. Сярэдні намалот тут склаў больш за 40 цэнтнераў з гектара і валавы збор павялічаны амаль на 18 працэнтаў. Брэсцкая вобласць выйшла літаральна ўпрыток да лідара спаборніцтва па такім паказчыку, як прырост у параўнанні з мінулым годам валавога збору збожжа і ўраджайнасці — адпаведна плюс 38 працэнтаў і плюс 10 цэнтнераў з гектара. «Нарэшце, мяжу ў 1 мільён тон збожжа змаглі пераўзысці ў гэтым годзе хлебаробы Віцебскай і Гомельскай абласцей», — адзначыў Прэзідэнт. У віцябчан сярэдняя ўраджайнасць збожжавых склала амаль 34 цэнтнеры з гектара, а гамяльчане сабралі амаль па 33 цэнтнеры з гектара і больш як на 31 працэнт павялічылі валавую вытворчасць збожжавых. Пераможцамі спаборніцтва прызнаны 10 раёнаў, прычым Брэсцкі, Гродзенскі, Аршанскі і Рэчыцкі — паўторна. Асаблівай удзячнасці Прэзідэнта ўдастоіліся працаўнікі Гродзенскага раёна, якія сабралі амаль 250 тысяч тон хлеба і атрымалі самую высокую ўраджайнасць — 75 цэнтнераў з гектара. «Гэта ўзровень перадавых еўрапейскіх дзяржаў», — заўважыў беларускі лідар.

Таксама асаблівую ўдзячнасць Прэзідэнт выказаў і правафланговым уборачнай кампаніі — камбайнерам і вадзіцелям, якія дасягнулі сапраўды алімпійскіх рэкордаў. Ён узгадаў, што 10 гадоў таму было ўсяго 12 камбайнераў-тысячнікаў, а цяпер такая мяжа стала звычайным паказчыкам: звыш тысячы тон намалацілі больш за 2820 экіпажаў. А рэкорднымі намалотамі лічацца 5-6 тысяч тон на камбайн.

«Такую ж вялікую ўвагу як уборцы збожжавых, мы надаём нарыхтоўцы і вытворчасці травяных кармоў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. І тое, і другое — аснова для паспяховага развіцця жывёлагадоўлі, галіны, якая ў найбольшай ступені вызначае эканоміку ўсяго аграпрамысловага комплексу краіны. Сярод лідараў на травяным полі цяпер першае месца займае Віцебская вобласць, дзе на адну ўмоўную галаву жывёлы нарыхтавана па 15 цэнтнераў кармавых адзінак. У сувязі з тым, што нарыхтоўка кармоў яшчэ не завершана, вынікі спаборніцтва ў рэгіянальным разрэзе будуць падведзены ў лістападзе.

«Героі ўборачнай кампаніі сёння тут. Мы іх усенародна ўшаноўваем. Як ушаноўваем і тысячы тых працаўнікоў, якія прадвызначылі сённяшні поспех», — зазначыў Прэзідэнт. Ён, у прыватнасці, узгадаў працоўныя калектывы прамысловых прадпрыемстваў, якія ўнеслі вялікі ўклад у тое, што вырашчаны і сабраны такі багаты ўраджай. У першую чаргу, гэта працаўнікі аб'яднання «Беларускалій», «Гродна Азот» і Гомельскага хімічнага завода, якія забяспечвалі вёску мінеральнымі ўгнаеннямі. А таксама калектывы МТЗ, аўтамабільнага завода, машынабудаўнікі Гомеля, Ліды, Бабруйска, Магілёва, Брэста і Пінска, якія пастаўлялі ўборачную і іншую тэхніку. Традыцыйна дапамогу вяскоўцам аказвалі ваеннаслужачыя Міністэрства абароны, работнікі транспартных і іншых арганізацый. Добрых слоў заслугоўваюць і спецыялісты аграрнай навукі. Паводле слоў Прэзідэнта, гатункамі беларускай селекцыі засяваюцца больш за 80 працэнтаў збожжавых і іншых сельгаскультур. Навукоўцы штогод вядуць карэктыроўку тэхналогій і даюць практычныя рэкамендацыі з улікам рэальных умоў надвор'я.

Фота Пятра ФАМІНА

Разам з тым, на думку беларускага лідара, неабходна зрабіць усё, каб не толькі замацаваць дасягнуты поспех у будучым годзе, але мабілізаваць сілы і сродкі на выкананне яшчэ больш напружаных планаў. Магчымасці, лічыць ён, для гэтага ёсць. Улічваючы спецыялізацыю нашага аграрнага сектара, якая традыцыйна склалася, у бліжэйшыя гады неабходна выйсці ў жывёлагадоўлі на наступныя паказчыкі: вырабляць 8—10 мільёнаў тон малака і не менш за 2 мільёны мяса. Для стабільнага развіцця аграрнай галіны і дасягнення высокіх вынікаў неабходна ўдасканальваць практыку прымянення перадавых тэхналогій як у жывёлагадоўлі, так і ў раслінаводстве. Кіраўнік краіны заўважыў, што гэты год выявіў не толькі поспехі, але і недапрацоўкі ў гэтых пытаннях. Сур'ёзным стрымліваючым фактарам тэмпаў і якасці ўборачных работ стаў недахоп збожжасушыльных комплексаў і збожжасховішчаў. «Вялікія аб'ёмы збожжа мы не можам ужо размясціць у збожжасховішчах савецкага перыяду. Таму для Урада найважнейшая задача на працягу восені і зімы стварыць неабходную колькасць сховішчаў для збожжа і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі. Калі мы не развернемся ўжо гэтай зімой, то будзем мець вялікія праблемы». Таму, паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка, неабходна пабудаваць на працягу года новыя сучасныя сховішчы па сусветных стандартах для захоўвання яблыкаў, агародніны, садавіны і іншай прадукцыі.

Зараз у гаспадарках завяршаецца сяўба азімых, закладваецца аснова будучага ўраджаю. А таму асабліва важна, падкрэсліў Прэзідэнт, ужо цяпер укараняць на практыцы сістэмы праграмавання ўраджаю. І гэта павінна быць нормай ва ўсіх сельгасарганізацыях, уключаючы фермерскія гаспадаркі. «Вытворчасць прадукцыі і ў раслінаводстве, і ў жывёлагадоўлі неабходна весці ў строгай адпаведнасці з перадавымі тэхналогіямі, без парушэнняў і адступленняў. Тэхналагічная дысцыпліна і пастаяннае ўкараненне інавацый павінны быць паўсядзённым клопатам механізатараў і іншых сельскіх працаўнікоў. У гэтым аснова высокай культуры вытворчасці, ключ да новых поспехаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Больш актыўных намаганняў па распрацоўцы і ўкараненні перспектыўных тэхналогій Прэзідэнт чакае і ад вучоных-аграрыяў. «Жыццё паказвае, што менавіта на аснове перадавых тэхналогій і дасягненняў навукі сельгасарганізацыі змогуць умацаваць сваё фінансавае становішча, павысіць устойлівасць эканомікі і выйсці на самаакупнасць і самафінансаванне. Да канца пяцігодкі сельская гаспадарка павінна быць рэнтабельнай і не разлічваць ні на якія «падачкі», у тым ліку з боку дзяржавы», — падкрэсліў беларускі лідар. І адзначыў, што ў новай пяцігодцы будзе ажыццяўляцца фінансаванне, магчыма, яшчэ ў большых аб'ёмах, але толькі ў новую, перадавую вытворчасць.

Між іншым, размова аб будучым АПК з беларускім лідарам была працягнута і на сустрэчы з журналістамі. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка, гаворачы пра перспектывы аграпрамысловага комплексу, адзначыў, што Беларусь будзе працягваць нарошчваць аб'ёмы вытворчасці сельгаспрадукцыі і мінімізаваць яе імпарт.

Фота БЕЛТА.

«Навошта нам завозіць яблыкі з Польшчы? Сёння мы ўбіраем старыя сады, высаджваем новыя і ўжо ёсць ураджайныя вынікі», — сказаў ён. Прэзідэнт таксама акцэнтаваў увагу на тым, што ў рэспубліцы будзе працягвацца рэалізацыя праграмы адраджэння вёскі. «Неабходна стварыць унікальную краіну. Ужо цяпер многія кажуць, што тут утульна жыць і працаваць, але мы павінны зрабіць яе яшчэ лепшай. Мы павінны ператварыць краіну ў квітнеючы край, і мы гэта зробім», — упэўнены ён. Каб дасягнуць гэтага, у тым ліку патрэбна максімальна эфектыўна карыстацца і зямельнымі рэсурсамі краіны: уцягваць землі, якія не выкарыстоўваюцца, у севазварот. «Кожны гектар зямлі неабходна вярнуць у севазварот. Сёння з яго выведзены дзесяткі тысяч гектараў зямлі», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Што ж датычыцца зямель, якія з'яўляюцца непрыдатнымі для сяўбы, то яны павінны стаць месцам свабоднага выпасу жывёлы: у свеце падобных прыкладаў выкарыстання плошчаў шмат, і гэта выгадная справа.

Закранаючы пытанне аб выбарах у Нацыянальны сход і мяркуемай на іх рэакцыі з боку назіральнікаў, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Мы не проста па закону, па Канстытуцыі вядзём гэтыя выбары, мы нават парушаем нашы законы, і праводзім выбары ў адпаведнасці з тым, як патрабуе АБСЕ і заходнія назіральнікі. Мы пайшлі насустрач любым пажаданням міжнародных назіральнікаў адносна прадастаўлення кандыдатам у дэпутаты эфірнага часу ў СМІ. Гэта беспрэцэдэнтна дэмакратычныя выбары, выбары па правілах Захаду».

Разам з тым, паводле слоў Прэзідэнта, ён не мае намеру «весці апазіцыянераў у парламент за руку»: перамогуць — будуць там.

«Я не магу ўявіць, што ў Оршы пасля таго, што дзяржава тут зрабіла, пройдзе ў парламент нейкі апазіцыянер, які крытыкуе гэту ўладу з раніцы да ночы. Як за яго прагаласуюць людзі, калі ў яго толькі адно — Лукашэнка такі, Лукашэнка гэтакі. Кажы па сутнасці. Уладу лаюць, яна не святая, але кожны ж параўноўвае: што было ўчора і што ёсць сёння. Калі ты кандыдат у дэпутаты — будзь прынцыповы, аб'ектыўны. Ты ж скажы, што было, што ёсць зараз. Адзнач і добрае, скажы — я зраблю лепш. Але ж скажы, як зробіш і дзе возьмеш грошы? І народ будзе за цябе галасаваць. А выходзіць на экран альбо пісаць у газеце, што «ўсё дрэнна», «усё не так», «я зраблю лепш»... А як зраблю — пра гэта не кажа... Ну які ж народ за такога прагаласуе? Захад гэтага не ведае. Ён мяркуе, што ў нас сапраўды ёсць сістэмная апазіцыя», — зазначыў Прэзідэнт. На думку беларускага лідара, краіне патрэбен парламент з канструктыўнымі людзьмі, а не крыкунамі. Не зразумела і тое, як можа перамагчы апазіцыянер, калі ён нідзе не працуе. «Як за яго чалавек, які пойдзе да урны галасаваць ад сваіх участкаў, дачаў, фермаў, палёў, ад станка аддасць свой голас? Таму не трэба думаць, што апазіцыя тут ірване моцна. Магчыма, і добра б было, калі б хтосьці з іх перамог, але гэта вырашыць народ», — сказаў Прэзідэнт. Адзначыў ён і тое, што выбары ідуць спакойна: «Для мяне гэта бальзам на душу. Гэта гаворыць пра тое, што наша грамадства здаровае, што ў нас няма вялікіх праблем». І хоць не ўсе яшчэ пытанні вырашаны, лічыць кіраўнік краіны, аднак людзі бачаць, што яны вырашаюцца. «І гэтай уладзе народ пакуль давярае, я гэта добра ведаю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ігар ШЧУЧЭНКА,
Мінск — Орша — Мінск.

ОАО «Горизонт» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже изолированного помещения с инвентарным номером 500/D-7117682, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, общей площадью 7 175,7 кв. м (помещение многофункциональное № 1).

Начальная цена — 30 609 500 000 белорусских рублей без учета НДС.

Продаваемое помещение обременено договорами аренды.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 2 000 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 5 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата по договору купли-продажи осуществляется в следующем порядке: 50 (пятьдесят) процентов от цены продажи, определенной в результате аукциона, перечисляется продавцу в счет оплаты приобретаемого имущества в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона; оставшаяся часть от цены продажи, определенной в результате аукциона, перечисляется продавцу в счет оплаты приобретенного имущества в срок до 10.01.2009. Аукцион состоится **24 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **22 октября 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36 — УП «Минский городской центр недвижимости», (017) 334 25 11 — ОАО «Горизонт».

УНП 190398583

Фота БЕЛТА.

НА НАШЫХ ВУЛІЦАХ ТРАЛЕЙБУС БУДУЧЫНІ?

Суперсучасны тралейбус упрыгожвае вуліцы Мінска толькі сваім выглядам.

Новую мадэль чацвёртага пакалення з прыгожым дызайнам выпусціў «Белкамунмаш». Канструктары выкарысталі зусім новыя прынцыпы ў машынабудаўніцтве. Напрыклад, для зручнасці пасажыраў на інвалідных каляскach ёсць магчымасць карыстацца пандусам. Салон машыны даволі ўтульны, камфартабельны, са зручнымі сядзеннямі, спецыяльнымі месцамі для інвалідаў. Новая машына ўдвая больш эканамічная за сваіх папярэднікаў.

Вадзіцель супертралейбуса Андрэй Мякінчык расказаў, што тут створаны добрыя ўмовы для работы: клімат-кантроль, кандыцыянер, поўнае інфармаванне аб стане машыны. Пакуль ідзе абкатка навінкі. Праехаць, ацаніць новую прыгожую машыну маюць магчымасць пасажыры маршрута № 3 — «Чыгуначны вакзал — Ангарская».

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, фота аўтара.

СВЯТА Ў ЗАВОССІ

«Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў...»
(Адам Міцкевіч)

У мінулую суботу на радзіме Адама Міцкевіча прайшло свята паэзіі, прысвечанае 210-годдзю з дня нараджэння паэта.

Завоссе сустрэла гасцей дажджом і холадам і гэта паўплывала на ўсю ўрачыстасць. І тым не менеў людзей прыехала шмат — аўтобусы і легкавушкі ўздоўж дарогі расцягнуліся на сотні метраў.

Сядзібныя будынкі наноў перакрылі, а экспазіцыя папоўнілася новымі экспанатамі: гаспадары да свята падрыхтаваліся грунтоўна.

Перад прысутнымі выступілі прадстаўнікі мясцовай улады, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Міністэрства культуры... Гучалі вершы Адама Міцкевіча на польскай, беларускай, літоўскай і рускай мовах, а яшчэ сярод прысутных можна было ўбачыць удзельнікаў свята ў старадаўніх шляхецкіх строях...

Уздоўж алеі расклалі свае вырабы народныя майстры, а паводдаль паставіла палаткі мясцовая спажыўкааперацыя — у гэтым плане ўсё было як на мерапрыемствах, дзе збіраецца народ адпачыць і павесяліцца.

Калі б стаяла сонечнае надвор'е, то песні і танцы ўспрымаліся б зусім інакш, чым пад дажджом і ветрам, а гэта падказала, што ў Завоссі неабходна мець хоць нейкі летні павільён ці навес, дзе маглі б сабрацца людзі ў непагадзь.

— І хоць надвор'е сёння не спрыяе святу — нас сабраў і аб'яднаў Адам Міцкевіч, — сказаў у сваёй прамове генеральны консул Польшчы ў Брэсце Яраслаў Ксёнжык.

Хацелася б, каб свята паэзіі ў Завоссі праводзілася не толькі на юбілеі, але і штогод.

...Пабылі ў Завоссі, а затым зазірнулі ў Крошын да Паўлюка Багрыма.

За савецкім часам, калі, здавалася б, ідэалагічны ціск быў сур'ёзны, Дні паэзіі ў Крошыне праводзіліся рэгулярна, а сёння што нашым творцам перашкаджае сабрацца? Прыйшоў у Завоссе новы дырэктар і жыццё там ускалыхнулася.

Будзем спадзявацца, што сёлетняе свята паэзіі на радзіме Адама Міцкевіча — толькі пачатак.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Дзень—ноч: лік роўны!

Учора ў 18 гадзін 44 хвіліны па беларускім часе, у дзень восеньскага раўнадзенства, ва ўсім паўночным паўшар'і планеты пачалася астранамічная восень. 22 верасня Зямля заняла адносна Сонца строга вертыкальнае становішча, а працягласць дня і ночы была аднолькавая — роўная 12 гадзінам. Зрэшты, з-за рэфракцыі (пераламлення святла), якая быццам бы «прыўзнімае» Сонца над гарызонтам, светлавы дзень доўжыўся крыху больш.

Па народным календары, восень з гэтага дня пераходзіць у стадыю «залатой», і працягваецца прыкладна да сярэдзіны. Раней дзень восеньскага сонцастаяння лічылі святам і нават адзначалі — народнымі гуляннямі, пірагамі з капустай, журавінамі, мясам... А ў Японіі з 1878 года гэтае свята адзначаюць на афіцыйным узроўні — як дзень шанавання памяці продкаў, якія адышлі ў іншы свет.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Здарэнне

Мікрааўтобус ад удару сплюшчыла

Позна ўвечары 20 верасня ў Магілёве адбылася аўтааварыя, у выніку якой загінуў чалавек. Пра гэта паведаміла прэс-служба Магілёўскай ДАІ.

На вуліцы Мінская шаша мікрааўтобус «Форд-Транзіт» выехаў на сустрэчную паласу і ўдарыўся ў маршрутны аўтобус. На месцы загінуў 40-гадовы жыхар Бялынічаў, які, мяркуецца, і быў за рулём мікрааўтобуса. Каб высветліць сітуацыю дакладна, трэба мець стасункі з пасажырамі. Аднак магіляўчане 40 і 60 гадоў (верагодна, бацька і сын) з адкрытымі чэрапна-мазгавымі траўмамі былі дастаўлены ў аддзяленне нейрахірургіі Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай дапамогі ў непрытомным стане, і цяпер медыкі змагаюцца за іх жыццё і здароўе.

Аўтобус-«гармонік» ад удару з'ехаў у кювет. Час быў позні, і пасажыраў у аўтобусе было няшмат. Яны моцна спужаліся, але не пацярпелі.

Што стала прычынай страшнай аварыі, чаму мікрааўтобус скрозь шырокую раздзяляльную паласу выехаў насустрач патоку — трэба будзе высветліць следству. Распачата крымінальная справа.

Алена КАЗЛОВА.
Фота прадстаўлена УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытого аукциона по продаже в собственность земельных участков для индивидуального жилищного строительства

Номер лота	1	2	3	4
Наименование объекта	Земельный участок	Земельный участок	Земельный участок	Земельный участок
Местонахождение объекта	г. Сморгонь, проезд Печатный, У-6	г. Сморгонь, проезд Образцовый, У-8	Сморгонский район, Жодишковский с/с, д. Данюшево, У-34 «А»	Сморгонский район, Жодишковский с/с, д. Данюшево, У-34 «Б»
Кадастровый номер	425650100001003351	425650100001003350	425681705101000042	425681705101000043
Площадь участка (га)	0,1500	0,1495	0,2251	0,2279
Форма проводимого аукциона	Аукцион с условием			
Срок аренды	Продажа в собственность			
Условия продажи	Строительство и обслуживание жилого дома в течение 3-х лет с момента принятия решения райисполкома о передаче участка в частную собственность			
Начальная цена (руб.)	3169500	3161048	85700	86757
Сумма задатка (руб.)	316950	316105	8570	8680
Расходы, связанные с организацией, проведением аукциона и подготовкой документации (руб.)	509792 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)	509792 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)	497608 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)	497608 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в частную собственность;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602526000007 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 504, УНП 500108330, код платежа 5520, получатель платежа — финансовый отдел Сморгонского райисполкома.

Гражданин — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

Индивидуальный предприниматель — копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

Юридическое лицо — представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомится с объектами.

Аукцион состоится 28 октября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, в малом зале заседаний.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, каб. 302 в рабочие дни с 8.30 – 17.30. Телефоны для справок в г. Сморгони: 8 01592 3 23 41, 3 17 23, 3 23 91.

Заявления принимаются по 22 октября 2008 года до 17.30 включительно.

УНП 500108328

Камандзіроўка па пісьму

Каналізацыя «на халяву»

або Некаторыя нюансы местачковай маралі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб знайсці паразуменне, быў праведзены сход жыхароў завулка Усходняга і вуліцы Пушкіна, на якім было вырашана, што ўрэзка ў трубу каналізацыі адбудзецца пасля таго, як гаспадары дамоў з 24 па 47 нумар па вуліцы Пушкіна ўнясуць частку сумы, затрачанай першай суполкай на пракладку больш як 200 метраў каналізацыі. На сходзе прысутнічалі прадстаўнікі раённай жыллёва-камунальнай гаспадаркі і здавалася, што ўсё зразумела і будзе справядліва. Акрамя гэтага, быў ліст і з Брэста:

«Брэсцкае абласное ўпраўленне ЖКГ разгледзела Ваш зварот па пытанні падключэння жыхароў вуліцы Пушкіна (д. №№ 24—47) да прыватнай каналізацыйнай сеткі... і паведамляе наступнае: падключэнне каналізацыйнай сеткі, якая будуецца па вуліцы Пушкіна (д. №№ 24—47) будзе зроблена пасля ўзгаднення з усімі зацікаўленымі бакамі».

Ген. Дырэктар БАУП «Упраўленне ЖКГ» С.А. Лабанаў.

Пасля такога напамінання з вобласці думалася, што ўсе пытанні знятыя. А на справе аказалася інакш. Нехта на месцы даў каманду, і адбылося самавольнае падключэнне. Калі б такога дазволу не было, ніхто з жыхароў названых вышэй дамоў не асмеліўся б рабіць урэзку.

А зараз давайце паглядзім на маральны бок праблемы, бо тое, што адбылося на вуліцы Пушкіна не з'яўляецца выключэннем.

Падобная сітуацыя здарылася ў свой час па завулку Артылерыйскім у Баранавічах. Група жыхароў на свае сродкі правяла трасу газаправода, а затым, выкарыстаўшы тое, што траса перайшла на баланс гаргаза, астатнія падключыліся да яе бясплатна. Людзі абураліся, але ж газаправод — не каналізацыя і павінен быць пад кантролем адпаведнай службы.

Наконт маралі, то тут проста — за ўсё трэба плаціць. Хто тыя 17 чалавек, якія ў 2002 годзе праклалі каналізацыйную сетку? Амаль усе пенсіянеры, але яны без усякіх хітрыкаў заплацілі патрэбныя грошы і сёння спадзяюцца, што і астатнія паступяць такім жа чынам. Каналізацыя па вуліцы Пушкіна — агульная для ўсёй вуліцы, і калі адны заплацілі, то і іншыя павінны ўнесці сваю частку. Гэта адзін бок праблемы, а мы паглядзім на мараль шырэй.

Мараль фарміруе мінуўшчына народа — яго гісторыя, культурна-бытавыя традыцыі, псіхалогія, сацыяльна-эканамічная сістэма і ў пэўнай меры ўлада.

Вось людзі за свае грошы пракладваюць каналізацыю ў райцэнтры. Гэта неабходна вітаць і падтрымліваць. У нашым выпадку жыхары знялі з камунальнай службы раёна пэўную нагрузку — яны не толькі праклалі трубы, але і самі абслугоўвалі тую сетку. Што яшчэ хацець ад пенсіянераў? Камунгасу на такіх людзей трэба маліцца і падтрымліваць элементарны парадак, а не займацца гульнямі. Як у нас часта робіцца? Нехта папрасіў, знайшоў падыход, а можа цешча жыве па той вуліцы і вось уся мараль... местачковая!

З пакрыўджанымі ўсё зразумела — яны нават вынеслі на вуліцу праект і паказвалі, дзе тыя трубы праклаліся. А вось на вуліцы Пушкіна было ціха і пустынна. Прайшоў, і на вочы трапілася кабета. Жанчына выслухала мяне і сказала: «А мы ўсе такія. Кожны над сваім рублём дрыжыць».

Як бы тых грошай шкада не было, але ў магазіне за хлеб і прадукты мы вымушаныя плаціць, за газ — таксама, за водаправод, за ўзараны агарод, за.... Мінулі часы, калі шафёр за бутэльку гарэлкі мог зліць каністру бензіну з дзяржаўнай аўтамашыны. Цяпер за бутэльку і гаварыць ніхто не стане. Усё гэта было, але ж мы жывём у новых умовах, калі за кожную паслугу трэба разлічвацца. Сёння ўсе непаразуменні і разборкі ўзнікаюць найчасцей на фінансавай глебе.

Уявім сабе, што па завулку Усходнім жылі б не пенсіянеры, а мужыкі, у жылах якіх цячэ гарачая кроў, то размова была б зусім іншая.

І тым не меней, у нас людзі «не ўсе такія». Вось жа па завулку Усходнім і па частцы вуліцы Пушкіна людзі не сталі прытрымлівацца даволі папулярнага выслоўя «Не падманеш — не пражывеш», а ўсё зрабілі сумленна.

Але што рабіць цяпер, калі палова вуліцы падключылася да каналізацыі «на халяву»?

Пратакол сходу ёсць, і ён не выкананы. ЖКГ мае поўнае права паставіць на каналізацыі заглушку і ўстанавіць справядлівасць. Не пройдзе і некалькіх дзён, як гаспадары дамоў №№ 24—47 выплацяць тую частку грошай.

А вось якая размова ў мяне атрымалася з начальнікам Ляхавіцкага ЖКГ Аляксандрам Мядзвецкім.

— Аляксандр Яўгенавіч, вы знаёмыя з праблемай па завулку Усходнім і вуліцы Пушкіна. А каму належыць тая каналізацыйная сетка?

— Наша памылка, што ЖКГ не ўзяла трасу на свой баланс і яна належыць першаму каапаратыву (па праекце праходзіць як індывідуальны забудоўшчык. — **(Заўвага аўт.)**

— Камунгас гэты ўчастак на працягу гэтых пяці гадоў абслугоўваў?

— Не. Жыхары рабілі гэта сваімі сіламі.

— Як вы думаеце, з маральнага боку такая сітуацыя нармальная? І як можна яе выправіць?

— Я быў у адпачынку, калі адбылося падключэнне і думаў, што там усё ў парадку — людзі разлічыліся. Быў сход і тады прыйшлі да згоды... Я пастараюся сітуацыю разруліць і ўсё паставіць на месца. Першы каапаратыў павінен атрымаць кампенсацыю, але ў разумных межах. Па маіх разліках, не болей, чым 400 тысяч з кожнага дома, які падключаўся пазней. Разам з гэтым цяжка зрабіць усіх шчаслівымі — незадаволеныя будуць.

Я некалькі разоў зрабіў націск на тое, ці будзе праблема вырашана і чуў у адказ ад начальніка камунгаса, што ён у сітуацыі разбярэцца належным чынам.

«Звязда» таксама на гэта спадзяецца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Ляхавіцкі раён.

АХОВА — РУХАВІК БЯСПЕКІ

«Дастойная ахова страхуе ад вялікіх непрыемнасцяў», — сцвярджае кіраўнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Беларусі Аляксандр Ракусаў

47-гадовы палкоўнік — прадстаўнік міліцэйскай дынастыі. Бацька Аляксандра Іванавіча працаваў у следстве, і сыны Ракусава таксама вырашылі прысвяціць сябе службе ў органах правапарадку.

Пры ўсёй складанасці і адказнасці працы, Аляксандр Іванавіч — чалавек, цікаўны да жыцця. Нават яго рабочы кабінет выпучаецца з шэрагу падобных: гадзіннік з боем, радыё ў старадаўнім стылі, шмат кветак...

— Аляксандр Іванавіч, а чаму ваш рабочы стол упрыгожвае выява Мікалая II?

— Гэта даніна памяці. Паглядзіце: у мяне ёсць партрэты рускіх імператараў, якія за сваім часам зрабілі значны ўклад у развіццё органаў унутраных спраў. Пётр I — гэта зразумела. Екацярына II першая ўвяла тэрмін «прафілактыка злачынстваў». А Мікалай II меў дачыненне да Магілёва і аб'яўлены праваслаўнай царквой святым. А я — хрысціянін, імкнуся прытрымлівацца ўсіх запаведзяў.

— Гавораць, што «грашовае дрэва» прыносіць удачу ў матэрыяльных справах. Я нідзе не бачыла такога, як у вас: вялізная расліна згінаецца пад цяжкасцю галінаў. Дрэва як сімвал сведчыць пра поспехі абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы, якое вы ўзначальваеце?

— Гэта «грашовае дрэва» расце роўна столькі, колькі я працую ў органах унутраных спраў. Мне нават двойчы ўдалося назіраць такую рэдкую з'яву, як цвіценне «грашовага дрэва»! Я ўвогуле люблю расліны.

А колькасць кліентаў аховы нябожчыка павялічваецца: прыкладна на 2 тысячы ў год. Людзі ўжо паспелі да таго, што можна застрахаваць сябе ад непрыемнасцяў. Да таго ж значная колькасць беларусаў стала жыць дастойна, і ёсць што ахоўваць.

У Магілёўскай вобласці пад нашай аховай знаходзіцца больш за 18 тысяч аб'ектаў, з іх больш за 14 тысяч кватэр, дамоў, катэджаў і гаражоў.

— А ваша кватэра стаіць на ахоўнай сігналізацыі?

— Абавязкова. Праўда, здарылася гэта толькі тады, калі я перайшоў з органаў следства ў ахову 12 гадоў таму. Я заўсёды лічыў, што ў мяне ахоўваць няма чаго. Аднак калі выязджаў за горад ці ў камандзіроўку, пры вяртанні дадому мроіліся ўзламаныя дзверы. Цяпер я спакойны.

— І можаце на ўласным прыкладзе рэкламаваць паслугі аховы.

— Шчыра кажучы, прынцыпова не рэкламую. Таму што лічу: сёння ўжо столькі рэкламы, што ў людзей узнікае адваротнае пачуццё.

Рэальнае жыццё — лепшая рэклама нашых паслуг. Не дай Божа, каб вам альбо суседзям, сваякам давялося зведаць пачуццё горычы, калі злодзей пранікае ў кватэру і крадзе асабістыя рэчы.

Я не скажу, што ў нас вялікія чэргі, але людзі ідуць, каб здаць сваё жыллё пад ахову.

— І гэта ёсць гарантыя захаванасці маёмасці?

— Так. За апошнія гады мы ўвогуле не дапускалі крадзяжоў з ахоўных кватэр. Злачынцы затрымліваюцца, як правіла, у той момант, калі яны з сабраным чужым дабром збіраюцца пакінуць кватэру. А ў адной краме мы і на відэа знялі, як злодзей збірае клункі.

— Якая сёння зона адказнасці вашай службы?

— Спіс вялікі. Мы ахоўваем такія прамысловыя гіганты, як «Белшына» і «Магілёўхімвалакно». Цяпер вельмі шмат здаюць пад ахову катэджаў у прыгарадах. Не хапае месцаў на аўтастаянках, таму гараджане зноў сталі трымаць свае аўтамабілі ў гаражах, якія ставяць на ахову.

Мы не хаваем сваёй працы. Месца, куды трэба прыкладаць чып пры адкрыцці дзвярэй, асвятляецца. Гэта ўжо прафілактыка крадзяжоў.

— А колькі сёння каштуюць паслугі аховы?

— Штомесячная плата складае палову базавай велічыні, незалежна ад месца жыхарства. Праўда, калі катэдж мае два ўзроўні альбо болей, давядзецца плаціць асобна за кожны. А вось сярэдні кошт абсталявання, якое патрабуецца, немалы. Для аднапакаёвай кватэры — каля 400 тысяч рублёў, двухпакаёвай — каля 500 тысяч, трохпакаёвай — каля 600 тысяч. Гараж — больш за 900 тысяч рублёў.

— Прыстойныя сумы! Тут яшчэ памеркаваць трэба, ці варта плаціць такія грошы, каб захаваць сваю даволі сціплую маёмасць.

— Давайце памяркуем разам. Што ёсць у вашай кватэры? Напэўна, тэлевізар, плэер, бытавая тэхніка. Далей адзенне — дублёнка ці пухавая куртка. Яшчэ абутак. І якая-небудзь схованка на чорны дзень. Калі ўсё гэта падлічыць, то тысяч на 5-6 долараў будзе. І так у кожнага, хто адносіць сябе да сярэдняга класа.

За тое, каб не страціць гэта, трэба аднойчы заплаціць некалькі соцень тысяч рублёў, у залежнасці ад маштабу кватэры. Гэта будзе аднаразовая страта для сямейнага бюджэту, бы яшчэ штомесяц, на сёння, 17 500 рублёў.

— Няўжо злодзеі пакапяцца на мой стары пухавік?

— Паслухайце, злачынны свет абмяльчэў. І злодзей цяпер не цураецца нічога. У маёй практыцы былі такія крадзяжы, што з кватэры на першым паверсе, дзе жылі старыя людзі, злачынцы забіралі бялізну. Два заслужаныя ветэраны вайны паехалі на лячэнне ў шпіталь і нібыта браць у іх не было чаго. Нават тэлевізар ледзь не з першых мадэляў. Тады забралі бялізну.

Дарэчы, усе ветэраны маюць у нас растэрміноўку плацяжоў да 6 месяцаў. І штомесячная плата для іх сімвалічная — 350 рублёў.

— А як можна зэканоміць на пастаноўцы на ахову? Можа, усталяваць датчыкі не ва ўсіх пакоях?

— Скажу вам проста: сквапны плаціць двойчы. Калі ўжо здаваць кватэру пад ахову, то поўнасцю. Напрыклад, кліент жыве на 7-м паверсе і просіць заблакаваць толькі ўваходныя дзверы. Усталёўваецца магніт, дзверы расчыняюцца — і адразу ідзе сігнал. Але былі прыклады, калі з даха злодзеі спускаліся па канатах да патрэбнага паверха, разбівалі акно і ўсё скрадзенае дабро цягнулі наверх, а потым уніз па лесвіцы і ў аўтамабіль. Але дзверы ніхто не расчыняў, і за такі крадзеж мы адказнасць не можам несці.

Былі выпадкі, калі блакуюцца дзверы і аб'ёмны датчык ставіцца толькі ў тым пакоі, дзе ёсць балкон. Але каштоўнасці ёсць у іншых пакоях, і злодзеі разбівалі акно, пранікалі і забіралі ўсё, што было там... Няўжо шкада не так ужо і шмат грошай на яшчэ адзін датчык, каб захаваць нажытае?

— А як выглядае сучасны дамушнік?

— У маёй практыцы быў кішэнны злодзей па мянушцы «Інтэлігент». Яму было 65 гадоў, апранаўся як прафесар: касцюм-тройка светла-кафейнага колеру, белая кашуля, прыгожы гальштук, мадэльныя туфлі і «дыпламат». Яго затрымалі, калі ён палез у кішэню студэнткі. Так што сённяшні дамушнік можа выглядаць як кожны з нас, звычайным чалавекам.

Акрамя гэтага, дамушнікі могуць быць узброеныя сучаснымі тэхналогіямі. Гадоў пяць таму ў Магілёве дзейнічала злачынная група, якая спецыялізавалася на кватэрах. Жыхары першых паверхаў ставілі на вокны жалезныя краты і не хваляваліся за сваю маёмасць. А дарэмна, таму што злодзеі мелі нажніцы, якія ў адну секунду перакусвалі арматуру, і злачынцы вычышчалі кватэры поўнасцю.

— Але і сістэмы аховы з цягам часу павінны ўдасканальвацца.

— Так і ёсць. Цяпер ёсць ахова, заснаваная не толькі на тэлефонных лініях, але і на радыёантэнах, на GSM. Датчыкі дазваляюць ставіць на ахову кватэру, дзе ёсць хатнія жывёлы — каты і сабакі. Можна ўсталяваць трывожную кнопку, каб выклікаць міліцыю ў любы час. Колькі гадоў таму, калі была хваля разбойных нападаў на кватэры, трывожныя кнопкі ўсталёўвалі ў прыбыральнях. Таму што менавіта туды закрывалі разбойнікі няшчасных гаспадароў кватэры.

— А з крамаў цяпер крадуць альбо не?

— Ёсць выпадкі. Звычайна злодзеі хаваюцца ў падсобных памяшканнях, прыбыральнях і за стэлажамі да закрыцця. Але мы іх затрымліваем на выхадзе.

Праўда, цяпер нас вельмі непакояць крадзяжы «на рывок». Гэта значыць, што злачынца загадзя вывучае аб'ект і месца самых дарагіх тавараў на паліцах. Уначы ён бярэ вялізны камень, разбівае вітрыну, за лічаныя секунды змахвае тавар у кайстру і збягае. Нядаўна мы такога затрымалі ў Бабруйску. Мы працуем — гэта наш абавязак.

— Колькі сёння людзей працуе ў сістэме аховы ў Магілёўскай вобласці?

— Больш за 3 тысячы чалавек. І яшчэ больш за сотню службовых сабак, якія дапамагаюць раскрываць злачынствы. Быў выпадак на Новы год, калі магіляўчанка пайшла святкаваць да сваякоў, а ў гэты час злодзеі разбілі акно і вынеслі з дома пральную машыну, тэлевізар, музычны цэнтр, ды нават алюмініевы бідон. А наш сабака Хонда ўзяў след і прывёў міліцыянераў да дома, які знаходзіўся на той жа вуліцы. Злачынцаў затрымалі, а маёмасць вярнулі жанчыне.

— Тая жанчына, верагодна, пасля такога выпадку адразу паставіла дом на ахоўную сігналізацыю?

— І правільна зрабіла. Таму што, як паказала практыка, гэта абарона не толькі ад злодзеяў, але і ад непрыемных выпадкаў. Задымленне, затапленне...

Не так даўно быў такі выпадак: наш кліент адпачываў з сям'ёй у замежжы, а ў выніку аварыі з водаправодам у яго кватэры заліла суседзяў. Яны і патэлефанавалі ў ахову з просьбай аб дапамозе. Мы адкрылі кватэру і выратавалі кліента ад непрыемнасцяў.

І акрамя ўсяго іншага, наша ахова — гэта вялікая псіхалагічная страхоўка. Вы зачынілі дзверы, здалі на ахову кватэру і думаць забыліся пра сваю маёмасць, бо яна пад надзейнай аховай. І дзеці вашы ў кватэры ў бяспецы, таму што там ёсць трывожная кнопка. А вы спакойна займаецеся сваімі справамі.

— Аляксандр Іванавіч, што вы пажадаеце чытачам «Звязды»?

— Безумоўна, скарыстацца нашымі паслугамі, каб захаваць сваю маёмасць, на якую зараблялі ўсё жыццё. Страціць нажытае за гады працы ў адзін дзень — гэта горка і цяжка. Таму здайце пад ахову і жывіце спакойна!

І яшчэ хачу загадзя павіншаваць усіх супрацоўнікаў Дэпартамента аховы з надыходзячым прафесійным святам. 29 кастрычніка ў Беларусі адзначаецца Дзень аховы. У гэты дзень мы шануем сваіх ветэранаў. 55 гадоў таму яны заклалі каласальны падмурак: пачыналі з простых вартаўнікоў, якія ў сцюжу і спякоту ахоўвалі будынкі, перасоўваліся на веласіпедах ды матацыклах. А сёння нашы супрацоўнікі маюць добрыя ўмовы працы і забяспечаны камп'ютарамі, сродкамі сувязі і аховы, аўтамабілямі. Усім неабходным, каб працаваць на дастойным узроўні.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

Гналі і гоняць

Мінулы тыдзень аказаўся «ўраджайным» на самагоншчыкаў. Толькі за 18 верасня па вобласці выяўлена 7 выпадкаў вырабу гарэлкі.

У пенсіянера з вёскі Лутавень Лунінецкага раёна знайшлі 400 літраў брагі і 24 — гарэлкі, а ў лесе каля пасёлка Арэхаўскі Кобрынскага раёна быў знішчаны цэлы міні-завод і пры ім 800 літраў брагі.

Гоняць гарэлку, найчасцей, у сябе дома ці ў лесе, а ёсць выпадкі, калі пяршак капае і ў закінутай хаце.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Засумавалі па турме?

Вечарам да пенсіянера, які жыве на хутары Палінава ў Пружанскім раёне, адсунуўшы засаўку, залезлі двое. Напачатку яны старога збілі, затым забралі мех цукру, рогі аленя і пайшлі ў цемру.

Следства ўстанавіла, што ў хаце пенсіянера пабывала двое жыхароў вёскі Куплін, якія ўжо адсядзелі тэрмін за рабаванне.

Абдурыў

Дырэктара аднаго Брэсцкага прыватнага прадпрыемства схапілі за руку, калі ён падчас куплі-продажу нерухомасці незаконна завалодаў 28 мільёнамі 510 тысячамі рублёў беспрацоўнага.

Дырэктара арыштавалі, але адкуль у беспрацоўнага такія грошы?

Не разбагацелі

У Маларыце, каля бара па вуліцы Лермантава, на жыхара райцэнтра напалі двое і забралі ўсё, што было пры пацярпелым — барсетку з рублямі і долярамі, мабільны тэлефон. І хоць сума нарабаванага аказалася не надта вялікай — усяго 314 тысяч — рабаўніковы затрымалі і завялі крымінальную справу.

Калі цёмна і няма флікераў

Каля пасёлка Мухавец, што ў Брэсцкім раёне, на аўтатрасе Брэст — Макраны жыхар пасёлка на сваім БМВ-520 зрабіў наезд на чалавека — беспрацоўнага з Брэста.

Дарога была неасветленая, а загінулы чамусьці сядзеў на праезнай паласе.

Па той жа прычыне загінуў і жыхар вёскі Краглевічы Івацэвіцкага раёна. Пенсіянер ішоў па неасветленаму ўчастку дарогі і на ім не было флікераў. Вадзіцелі былі цвярозыя.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КВЗ — у калонію, асуджаных — у тэатр!

Зборная Беларускага КВЗ у Віцебску трапіла за... дрот. Вясёлыя і знаходлівыя па ўласным шчырым жаданні пазбавіліся на дзень волі, бо выступалі перад выхаванцамі мясцовай папраўчай калоніі № 1. У якасці падтрымкі на акцыю запрасілі прыехаць спявачку Ўладу, групы «Дразды» і «Тяни-Толкай». Незвычайныя гастролі адбыліся пад эгідай творчай акцыі «Восеньскі марафон». У розны час у ёй бралі ўдзел такія «зоркі», як Ларыса Грыбалёва, Уладзімір Ухцінскі і іншыя.

— Мы спадзяёмся, што нашы выступленні дапамогуць так званаму «спецыяльнаму кантынгенту» паглядзець на свет іншымі вачыма і вярнуцца на волю дастойнымі людзьмі, — кажа самы «вопытны» ўдзельнік КВЗ Аляксей Жук, на рахунку якога ўжо пятая «ходка» ў зону.

У самой выхаваўчай калоніі № 1 ёсць свае таленты, якім па сілах выступленне і на прафесійных сцэнах . У прыватнасці, «каланістаў» запрасілі выступіць на малой сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Напрыканцы верасня маладыя асуджаныя тут выступяць перад студэнтамі віцебскіх ВНУ. Пакажуць спектакль «Вяртанне» па матывах «Маленькага прынца» Экзюперы. Цікава, што непасрэднае дачыненне да пастаноўкі маюць і жанчыны. Рэжысёр — прафесійная актрыса Ніна Абухова працуе ў «коласаўскім» тэатры. А адзіную жаночую ролю іграе намеснік дырэктара па навучальна-выхаваўчай рабоце вячэрняй школы № 26, што пры калоніі, Алена Краўцова. Такім чынам «начальства» становіцца духоўна бліжэй да выхаванцаў.

Добра, што начальнік калоніі падпалкоўнік Аляксандр Гаралёў асабіста падтрымлівае ўсе цікавыя пачынанні. І конкурсы снежных фігур праводзяцца, і турніры па шахматах і шмат чаго іншага.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

на право заключения договора аренды земельного участка

21 октября 2008 г. в 11.30 в здании Гродненского районного исполнительного комитета (г. Гродно, ул. Горького, 51) состоится аукцион на право заключения договора аренды земельного участка.

№ лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Срок аренды	Начальная цена предмета аукциона, белорусских рублей	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, белорусских рублей	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории
1	422000000004000257, микрорайон «Цеховщизна»	0,7368	для строительства зданий и сооружений швейного производства	51 год	7 150 000	2 000 000	вблизи участка проходят сети газоснабжения, участок прилегает к асфальтированному подъездному пути

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) со дня опубликования настоящего извещения и до 17.00 16 октября 2008 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды земельных участков по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 51, каб. 88, документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет Гродненского райФО № 3602514000010 в филиале 404 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 691, назначение платежа 04002, УНН 500027345;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды земельных участков в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: 73 01 09, 74 04 14.

Аукцион проводится при наличии не менее 2 участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Шаг аукциона – 10 % от предыдущей цены, называемой аукционистом. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка вносит плату за предмет аукциона и возмещает расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Договор аренды земельного участка заключается в течение 2 рабочих дней после внесения победителем платы за предмет аукциона и возмещения им расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Победитель аукциона в двухмесячный срок после принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка обязан осуществить государственную регистрацию прав на земельный участок.

Рэха публікацый пра Першую сусветную...

ВАЙНА ВАЙНОЙ, А ЖЫЦЦЁ ІДЗЕ...

Газета «ЗВЯЗДА» вядзе гаворку пра тую амаль забытую вайну ды пра яе наступствы. Шкада, што па волі лёсу — змены палітыкі, улады, поглядаў, — людзі забыліся пра герояў Першай сусветнай вайны. Добра, што хоць праз 90 гадоў з дня заканчэння вайны ўспомнілі пра тыя цяжкія падзеі, якія закранулі і Беларусь.

Ужо адышлі да вечнасці сведкі Першай сусветнай, але захаваліся ў нашай памяці расказы аднавяскоўцаў і родных, чый лёс быў непасрэдна звязаны з той вайной, у якую вельмі пацярпелі людзі экаламічна і сацыяльна, якая парушыла людскія лёсы, мары, а некаторым і жыццё скалечыла.

Хачу расказаць, як жылі ў часы Першай сусветнай вайны людзі маёй вёскі Янушкавічы Валожынскага раёна. Спачатку ў вёску прыйшлі немцы, але яны жорстка з людзьмі не абыходзіліся, хіба што за рэдкімі выключэннямі. Вось толькі лес дубовы — добрыя былі дубы, сапраўдныя лясныя волаты — спілавалі. З сарака гектараў пакінулі толькі 11 дрэў. Панарабілі з нашых дубоў клёпак — такіх дошчачак для бочак. А частку лесу вывезлі конкай — каля Янушкавіч праходзіла чыгунка, па якой коні цягалі вагоны па рэйках.

Неўзабаве немцы былі выцеснены з нашай тэрыторыі царскай арміяй, 10-й гвардзейскай, але да канца вайны было яшчэ далёка. У нашай вёсцы размясціліся казакі. Жылі яны ў вясковых хатах, былі маладыя, прыгожыя, на іх сталі заглядацца дзяўчаты, а для бацькоў паўстала цэлая праблема — як не дапусціць кахання? Бо салдату ж няма веры ў такой адказнай справе. Папрасілі бацькі камандзіра, каб нават на танцы казакі не прыходзілі. Дзядуля расказваў, яму было тады гадоў 7, што аднойчы сядзеў на куце і сачыў за танцуючымі. Было ўжо за поўнач, калі з'явіліся казакі і вельмі прыгожа танцавалі. Ды хтосьці з бацькоў не спаў, далажыў камандзіру, той з'явіўся з нагайкай і давай казакаў сцябаць... Ды толькі зберагчы ад кахання сваіх дачок некаторым бацькам не ўдалося. У Янкі Голуба на кватэры быў салдат Ягор Шытоў, ён закахаўся ў іх дачку, прыгажуню Адольфу. І вось аднойчы Адольфа маці прызналася, што хоча выйсці замуж за Ягора. А маці страх узяў — схапіла пугу і добра набіла дачку. Думала, што на гэтым усё закончылася. А вось і не! Калі бацькі заснулі, маладыя падняліся, хуценька на каня селі, паехалі за 10 кіламетраў у Даўбені і пабраліся шлюбам у царкве. Ну а раніцай далажылі бацькам. Прыйшлося тым згадзіцца, але былі незадаволеныя, што Адольфа змяніла веру, перайшла на праваслаўную. А як закончылася вайна, то паехалі маладыя ажно ў Саратаў, за тысячы кіламетраў, з'явілася ў іх дачка Марыя.

Не толькі Адольфа шукала сабе каханне сярод казакоў: другая дзяўчына з вёскі выйшла замуж за салдата ажно ў Палтаву, трэцяя — нарадзіла сына ад казака, які пасля заканчэння вайны ўцёк...

...У гады вайны ад конкі была праведзеная чыгунка да лесу, гэта прыблізна адзін кіламетр да Янушкавіч, там быў склад з боепрыпасамі, высока агароджаны калючым дротам. Адсюль конкай вазілі боепрыпасы і правіянт ажно на ракаду (так называлася прыфрантавая дарога), а там коньмі — на лінію фронту.

У абоз бралі людзей з коньмі, так што і мясцовае насельніцтва, можна сказаць, таксама ўдзельнічала ў вайне. Фронт быў ад Янушкавіч за 30 кіламетраў — гэта Бакшты, Багданава, Ластаянцы, Подберазь. Як там ірвалася снарады, то было чутно ажно ў нас. У небе пастаянна ляталі цэпеліны — вялікія надзіманыя шары ўнізе з карзінай, дзе сядзелі немцы, якія нават бомбу маглі кінуць... Пару чалавек з нашай вёскі былі атручаныя газам пад Смаргонню.

Пасля вайны той склад з боепрыпасамі ўзарвалі — выбух быў вельмі страшны, а замест склада атрымаліся дзве вялікія сажалкі. Зямля гарэла і курэла некалькі месяцаў — адсюль і назва мясцовасці Курэлеўка. Перад выбухам камандзір прыйшоў у Янушкавічы і папярэдзіў людзей, каб схаваліся ў будынках і дасталі шыбы з вокнаў. Ну а хто не падпарадкаваўся загаду, то застаўся без вокнаў.

Аднавяскоўцы ўспаміналі, што царская армія была багатая, салдатаў добра кармілі. У адным гумне захоўваліся салдацкія прадукты харчавання: скрыні з салам, з нейкай вялікай рыбай, як вясковы кабан, цукар ляжаў цэлымі галовамі, нават былі мясныя кансервы.

Людзі за ваенныя гады вельмі збяднелі, не апрацоўвалі палі, бо ад іх узялі коней для фронту. Ад жабракоў-бежанцаў хаты не закрывалі, бо тыя хоць і маліліся за лустачку хлеба, але не кралі. Яны былі такія знясіленыя, што садзіліся на абочыны дарогі адпачываць і тут жа паміралі. У эвакуацыю ў Янушкавічы прыехалі на конях і прывезлі ўсё неабходнае пяць сем'яў бежанцаў ажно з Літвы. Літоўцы прывезлі сваю культуру: вокны завешвалі фіранкамі, падлогу дзёрлі не дзеркачамі, а адмысловымі шчоткамі, кожны меў звязаныя кручком тапкі. Яны былі выдатныя кулінары. Навучылі аднавяскоўцаў пячы хвораст, розныя пячэнні і іх нацыянальныя стравы. Іх дзеці гулялі з нашымі і абменьваліся мовамі: наша бабуля так вывучыла літоўскую мову, што яе нават бралі за перакладчыцу, калі ішлі ў вёску па пакупкі.

Вайна закончылася, і, відаць, за непатрэбнасцю, конку разабралі. Шкада! Як было б добра пракаціцца цяпер у вагончыку, які цягне конь. І бензіну не патрэбна!.. У лесе, каля Вялага, дзе быў палац графа Тышкевіча, пахавана каля 40 нямецкіх салдатаў. Магілы даглядалі людзі з навакольных вёсак. Два разы ў год яны фатаграфавалі магілы і адпраўлялі фота родным у Германію, а адтуль ім дасылалі грошы. Як толькі немцы ў Другую сусветную вайну з'явіліся ў Пяршаях, то першае, што яны зрабілі — наведалі магілы сваіх продкаў, а адзін з нямецкіх салдатаў нават знайшоў апошні прыстанак свайго бацькі. Калі пра гэта даведаліся партызаны, то ўсе крыжы павыкідалі далёка і магілы зруйнавалі з зямлёй...

Першая сусветная вайна «падарыла» нам такія назвы палёў, як Курэлеўка, Конка, Акопы, Траншэя, Загарадзь. Трэба памятаць пра тую вайну, не забываць яе, бо гэта ж наша гісторыя...

Данута ШАЎЛОЎСКАЯ.
Валожынскі раён.

Сітуацыя

Яны не хацелі жыць

За тры апошнія дні ў Гомельскай вобласці развіталіся з жыццём па ўласным жаданні тры чалавекі. У абласным цэнтры, Хойніках і Рэчыцкім раёне. І ўсе — мужчыны. Як патлумачыў **намеснік галоўнага ўрача абласной псіхіятрычнай клінічнай бальніцы Сяргей СТАНКЕВІЧ**, сярод самагубцаў «лідзіруюць» мужчыны. І тлумачыцца гэта тым, што яны больш рашучыя ў сваіх дзеяннях па прыродзе.

Больш за ўсё развітваюцца з жыццём па сваім рашэнні людзі сярэдняга ўзросту (35—45 гадоў) і пажылыя, пасля 60 гадоў, часцей за ўсё непрацуючыя, без сям'і. На глебе алкагольнага ап'янення. Такіх — 60—65 працэнтаў, і толькі 10—15 працэнтаў тых, хто стаіць на дыспансэрным уліку ў псіхбальніцы.

Назіраецца змяншэнне суіцыдаў. У 2000 годзе іх было зафіксавана ў вобласці 499, а праз сем гадоў — 424. За сёлетнія восем месяцаў — 240.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Спорт-тайм

БАТЭ РАЗГРАМІЎ «ШАХЦЁРА»

Адбыліся матчы 23-га тура чэмпіянату Беларусі ў вышэйшай лізе. Можна вылучыць гасцявы разгром «Савіта» «Нафтанам» (4:1) і перамогу «Дарыды», якая, здаецца, усур'ёз наважылася застацца ў вышэйшай лізе. Каманда з Кунцаўшчыны адолела сярэбранага прызёра мінулагодняга чэмпіянату — «Гомель» (2:1). Мінскае «Дынама», нягледзячы на выдаленне Паўлюковіча ў першым тайме, перамог на родным стадыёне магілёўскі «Днепр» (1:0), МТЗ-РІПА, дзякуючы Арцёму Канцавому, адолеў «Граніт» (2:0), а «Віцебск» разышоўся мірам з жодзінскім «Тарпеда»(0:0). Унічыю згулялі брэсцкае «Дынама» і гродзенскі «Нёман» (1:1), «Лакаматыў» дома прайграў «Смаргоні» (1:2) і нарэшце, у апошнім матчы тура, які прайшоў у нядзелю, БАТЭ на барысаўскім стадыёне разграміў «Шахцёра» (5:0). БАТЭ па-ранейшаму ўзначальвае турнірную табліцу (50 ачкоў), на другім месцы — МТЗ-РІПА (49), замыкае тройку лідараў мінскае «Дынама» (43).

ГРУЗІНСКІ ТЭНІСІСТ АШТРАФАВАНЫ

Мужчынская зборная Беларусі па тэнісе захавала прапіску ў першай групе Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса. Матч, які праходзіў у мінулыя выхадныя ў мінскім Палацы спорту, завяршыўся з лікам 3:0 на карысць нашай каманды. Трэцяе ачко нашай дружыне прынесла парная дуэль, у якой Максім Мірны і Сяргей Бетаў сустракаліся з дуэтам Іраклій Лабадзэ\Лада Чыхладзэ. Гульня скончылася пры ліку 6:3, 3:0 на карысць беларусаў з-за адмовы Лабадзэ ад далейшай барацьбы. Сапернікі беларусаў пагадзіліся не праводзіць два астатніх адзіночных паядынкі, якія ўжо не мелі турнірнага значэння. Грузіны апусціліся ў другую групу Еўра-Афрыканскай зоны.

Фота Пятра ФАМІНА
Уладзімір ІГНАЦІК

За неспартыўныя паводзіны Міжнародная федэрацыя тэніса (ІТФ) аштрафавала на дзве тысячы швейцарскіх франкаў грузіна Іраклія Лабадзэ. Справа ў тым, што падчас адзіночнага паядынку матча Кубка Дэвіса паміж мужчынскімі зборнымі Беларусі і Грузіі супраць нашага Андрэя Каратчэні ён паказваў непрыстойныя жэсты ў адрас гледачоў. Лабадзэ быў раздражнёны, апеляваў да суддзяў і гледачоў, уступаючы з імі ў перабранку.

ЦІХАН І ДЗЕВЯТОЎСКІ ЗБІРАЮЦЬ ІНФАРМАЦЫЮ

Пазаўчора ў Лазане адбылося слуханне Дысцыплінарнай камісіі Міжнароднага алімпійскага камітэта, прысвечанае выпадку са станоўчымі допінг-пробамі ў беларускіх штурхальнікаў молата, сярэбранага і бронзавага прызёраў Алімпіяды ў Пекіне Вадзіма Дзевятоўскага і Івана Ціхана. Атлеты на працягу дзвюх гадзін адказвалі на пытанні чыноўнікаў. У выніку камісія дала нашым суайчыннікам магчымасць прадаставіць дадатковую інфармацыю — да 17 кастрычніка 2008 года. Калі новыя даныя будуць прааналізаваныя, тады і будзе вынесены вердыкт. Нагадаем, Ціхана і Дзевятоўскага падазраюць у прымяненні тэстастэрону. Калі іх віна будзе даказаная, то МАК можа пазбавіць спартсменаў заваяваных медалёў і дыскваліфікаваць. Прычым Дзевятоўскаму пагражае пажыццёвае адхіленне ад выступленняў на спаборніцтвах.

«КЕРАМІН» ПЕРАРВАЎ СЕРЫЮ ПАРАЖЭННЯЎ

У экстралізе адкрытага чэмпіянату Беларусі па хакеі адбыліся чарговыя матчы. Чэмпіён краіны мінскі «Керамін» перарваў серыю з трох паражэнняў, абыграўшы дома даўгаўпілскі «Латгале» — 4:2. Дастойнае супраціўленне латвійскай «Рызе-2000» аказаў бабруйскі «Шыннік», сфарміраваны на аснове маладзёжнай (да 20 гадоў) зборнай Беларусі. Бабруйчане капітулявалі толькі ў авертайме — 3:4. Праявіла характар і мінскае «Юнацтва», якое ў гасцявым паядынку са жлобінскім «Металургам» пазбегла паражэння за 79 секунд да заканчэння трэцяга перыяду, а затым вырвала перамогу ў серыі пасляматчавых булітаў — 3:2. Пасля няўдалага старту ў чэмпіянаце краіны другую запар перамогу атрымаў «Гомель», які абгуляў дома магілёўскае «Хімвалакно» — 4:3. Шостае паражэнне запар пацярпеў «Брэст», які саступіў дома ліепайскаму «Металургсу» — 0:5. Гродзенскі «Нёман» выйграў у гасцях у латвійскага «АСК-Агрэ» — 4:3. Наваполацкі «Хімік-СКА» атрымаў перамогу над «Віцебскам» — 4:3 (у авертайме), саступаючы ў ходзе сустрэчы 0:2. Лідарам адкрытага чэмпіянату па-ранейшаму застаецца мінскае «Юнацтва» — 14 ачкоў пасля 6 гульняў. На другім месцы ліепайскі «Металургс» — 13(5), на трэцім — жлобінскі «Металург» — 11(6).

БАСКЕТБАЛІСТЫ ПРАЙШЛІ БЕЗ СТРАТАЎ

Мужчынская зборная Беларусі па баскетболе без стратаў прайшла першы круг у дывізіёне В чэмпіянату Еўропы. У заключным паядынку першай паловы турніру наша каманда ўзяла верх над зборнай Кіпра — 81:80. Такім чынам, пасля чатырох сустрэч падапечныя Аляксандра Папкова набралі 8 ачкоў і лідзіруюць у сваёй групе. Далей размясціліся зборныя Швейцарыі — 6 балаў, Румыніі — 6, Кіпра — 5 і Албаніі — 5. Матчы другога круга пройдуць у 2009 годзе.

«МАЛАДЗЁЖКА» ЗГУЛЯЕ З ТУРЦЫЯЙ У ГРОДНЕ

Маладзёжная зборная Беларусі, якая сустрэнецца ў плэй-офе супраць равеснікаў з Турцыі, вызначаліся з месцам правядзення хатняга матча. Першую сустрэчу наша каманда правядзе 10 кастрычніка ў Турцыі, а 14 кастрычніка прыме свайго саперніка на адрэстаўраваным стадыёне ў Гродне.

ШКЕРМАНКОВА ПРЫНЕСЛА «СЕРАБРО»

У албанскім Дурэсе праходзіць чэмпіянат Еўропы па цяжкай атлетыцы. У вагавай катэгорыі да 53 кг вызначылася беларуская юніёрка Наталля Колас. У суме двухбор'я яна падняла 172 кг і заняла 3-е месца. Акрамя таго, малы бронзавы медаль дастаўся нашай суайчынніцы і ў рыўку.

Чэмпіёнкай Еўропы па цяжкай атлетыцы сярод юніёраў у вагавай катэгорыі да 69 кг стала расіянка Таісія Антонава. У суме двухбор'я яна падняла 240 кг (110+130). На 32 кг адстала ад яе беларуска Марына Шкерманкова — 208 кг (92+116). Толькі па ўласнай меншай вазе «бронза» дасталася ўкраінцы Наталлі Сіроце — 206 кг, якая паказала аднолькавы вынік з сяброўкай па камандзе Карынай Сімак.

НА МАТЧЫ «БЕЛАРУСЬ — АНГЛІЯ» ПАРАДАК ЗАБЯСПЕЧАЦЬ АНГЛІЙСКІЯ ПАЛІЦЭЙСКІЯ

15 кастрычніка, у дзень правядзення ў Мінску адборачнага матча чэмпіянату свету па футболе 2010 года паміж нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Англіі, а таксама 14 кастрычніка парадак у цэнтры беларускай сталіцы будуць забяспечваць беларускія міліцыянеры і англійскія паліцэйскія. Дамоўленасць аб сумесным патруляванні ўжо дасягнутая. Прычым англійскія паліцэйскія будуць працаваць у сваёй традыцыйнай уніформе. Англійскім балельшчыкам выдадзена каля трох тысяч візаў. Ім прададзена каля 2600 білетаў.

У рэдакцыю нашай газеты прыйшла сумная вестка — пасля цяжкай і працяглай хваробы не стала Веры Мікалаеўны Стальмаховай. Амаль 40 гадоў свайго жыцця яна аддала «Звяздзе». Яна прыйшла ў газету на працу карэктарам у далёкім 1954-м, яшчэ з'яўляючыся вучаніцай сярэдняй школы № 20 «пры в/ч 27306 на вуліцы Якуба Коласа», як напісана яе рукой у аўтабіяграфіі, а на пенсію Вера Мікалаеўна пайшла ў 1993-м. За газетнымі старонкамі пражыта цэлая эпоха: колькі ўсяго адбылося за гэты час. А карэктар жа — самы ўважлівы чытач. І нават на пенсіі Вера Мікалаеўна не парывала сувязі з рэдакцыяй. Яна заўсёды прыходзіла ў калектыў на розныя святы, юбілеі. І заўсёды была аптымістычнай. Яна ніколі не скардзілася — ні на здароўе, ні на жыццё ў цэлым, хоць яно было нялёгкім.

На яе асабістай справе ў рэдакцыйным архіве напісана «захоўваць 75 гадоў». Але чалавечая памяць не можа падпарадкоўвацца канцылярскім загадам. Кажуць: чалавек жыве, пакуль пра яго памятаюць. Усе, хто працаваў з Верай Мікалаеўнай, будуць памятаць яе заўсёды.

Зарабілі на рамонт музея

Раённыя і гарадскія арганізацыі БРСМ Віцебскай вобласці пералічылі больш за 40 мільёнаў беларускіх рублёў на рамонт будынка музея «Обальскае падполле» і аднаўленне экспазіцыі. Зарабілі грошы падчас спецыяльна праведзеных суботнікаў.

Музей у гарадскім пасёлку Обаль быў адкрыты 29 кастрычніка 1965 года як Рэспубліканскі музей камсамольскай славы. Праз дваццаць гадоў атрымаў новую назву «Обальскае камсамольскае падполле»…

У ліку маладых падпольшчыкаў, якія ўчынілі больш як 20 буйных дыверсій супраць фашысцкіх акупантаў, былі легендарныя Ефрасіння Зянькова — кіраўнік падпольнай арганізацыі і Зінаіда Партнова. Апошняя за гераізм атрымала званне Героя Савецкага Саюза.

Добрай традыцыяй у музеі стаў прыём у ганаровай абстаноўцы ў піянеры і члены БРСМ. Тут праводзяцца сустрэчы з ветэранамі, іншыя патрыятычныя мерапрыемствы. Напярэдадні 90-гадовага юбілею камсамолу гэты ўтульны музей зноў адкрые свае дзверы. На святочную цырымонію запрасілі ветэранаў камсамольскага руху — усіх тых, хто ў розныя гады ўзначальваў райкам камсамола, ветэранаў вайны, ганаровых гасцей. Яны самымі першымі пасля рамонту змогуць азнаёміцца з унікальнымі экспанатамі, падзяліцца ўспамінамі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Вадзім ПАПОЎ: «МЭТА ЗАКОНАЎ — ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЦЦЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Думаю, што вынікам шматлікіх абмеркаванняў, кансультацый і ўзгадненняў стане прыняцце на дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў усебакова ўзважанага, рэалістычнага фінансавага дакумента, што дазволіць забяспечыць нармальную жыццядзейнасць і далейшае развіццё Беларусі ў 2009 годзе. Гэтаму, безумоўна, паспрыяюць новыя меры па аптымізацыі падатковай сістэмы краіны, якія будуць зафіксаваны ў заканадаўстве аб падаткаабкладанні.

— Плануецца пераход да адзінай 12-працэнтнай стаўкі падаходнага падатку з фізічных асобаў. Ці не палягчаюць ад гэтага заканадаўчага нововвядзення кашалькі людзей з невысокімі заробкамі?

— Пры абмеркаванні дэпутатамі новага парадку і ўмоў прымянення падаходнага падатку з фізічных асобаў спецыялісты Міністэрства фінансаў грунтоўна патлумачылі, што з увядзеннем адзінай стаўкі падаходнага падатку ў памеры 12 працэнтаў падатковая нагрузка на грамадзян з нізкім і сярэднім узроўнямі даходаў не павялічыцца. Так што падстаў для апасення няма. Удасканаленне падаходнага падаткаабкладання павінна спрасціць парадак налічэння падаходнага падатку і дэкларавання.

— Па зразумелай прычыне найбольшую грамадскую цікавасць выклікае сацыяльны складнік рэспубліканскага бюджэту. На чым тут зроблены акцэнты?

— Нягледзячы на рост цэнаў на імпартуемыя ў нашу краіну паліўна-энергетычныя рэсурсы, пры фарміраванні расходных артыкулаў законапраекта «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2009 год» захавана сацыяльная накіраванасць. Запланавана павялічыць выдаткі на заработную плату як для работнікаў эканомікі, так і бюджэтнай сферы. Узрасце бюджэтнае фінансаванне аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і спорту, сродкаў масавай інфармацыі. Павялічацца расходы на сацыяльную палітыку. Яны будуць накіраваны на ўтрыманне ўстаноў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, выплату матэрыяльнай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і асобным катэгорыям грамадзян, на забеспячэнне інвалідаў тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, забеспячэнне інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пенсіянераў санаторныі пуцёўкамі, і на іншыя сацыяльныя мэты, у тым ліку на рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Усё гэта і іншыя меры, прадугледжаныя ў праекце закона аб бюджэце, дазволяць палепшыць якасць жыцця ў Беларусі.

— Вы сказалі, Вадзім Аляксандравіч, што ў сесійным партфелі ёсць пакет новых законапраектаў. Якая іх тэматыка?

— У прыкладную праграму сесіі ўключаны праекты нарматыўных прававых актаў «Аб органах пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь», «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў», «Аб асновах адміністрацыйных працэдур», «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі», «Аб таварных біржах», «Аб крэдытных гісторыях», «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый». Яны будуць абмяркоўвацца ў другім чытанні. Да разгляду ў першым чытанні падрыхтаваны праект Закона «Аб ахове атмасфернага паветра».

— Дэпутаты спадзяюцца, што калі ў краіне з'явяцца крэдытныя гісторыі, то гэта ўмацуе плацёжную дысцыпліну тых, хто бярэ крэдыты ў банках?

— Я не сумняваюся ў тым, што закон «Аб крэдытных гісторыях» павысіць зацікаўленасць, гаворачы юрыдычнай мовай, фізічных і юрыдычных асобаў у належным выкананні сваіх абавязкаў перад банкамі і крэдытна-фінансавымі арганізацыямі. У выніку знізіцца крэдытная рызыка, банкаўская сістэма будзе працаваць больш эфектыўна. Гэта пацвярджае і вопыт замежных краін.

— Ці не дублюе праект Закона «Аб асновах адміністрацыйных працэдур» раней прынятыя парламентам заканадаўчыя рашэнні аб дэбюракратызацыі работы па выдачы людзям даведак і іншых дакументаў?

— Не дублюе, а развівае. У ім комплексна і сістэмна акумуляваны патрабаванні да ўпаўнаважаных органаў, якія ажыццяўляюць адміністрацыйныя працэдуры па зваротах грамадзян, і ўстанаўліваецца адказнасць за парушэнне заканадаўства ў дадзеная сферы. Гэты дакумент стане базавым для работы дзяржаўных і іншых устаноў і арганізацый з грамадзянамі.

— Яшчэ адна «цаглінка» ў падмурак дзяржавы для народа?

— Менавіта так.

— Якіх прававых навацый, калі гаварыць абагульнена, можна чакаць ад карэкціроўкі на сесіі шэрагу нарматыўных актаў дзеючага заканадаўства?

— Будзе створана сістэмная прававая аснова дзейнасці свабодных эканамічных зонаў, у якой прадугледжаны і дзяржаўныя гарантыі замежным інвестарам. Устанаўліваюцца роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання на рынку паслуг электрасувязі. Вызначаюцца патрабаванні да радыяцыйнай бяспекі пры выкарыстанні радыяцыйных адходаў і меры забеспячэння радыяцыйнай бяспекі пры трансгранічным перамяшчэнні крыніц іанізуючага выпраменьвання. Аптымізуюцца і скарачаюцца адміністрацыйныя працэдуры па заключэнні здзелак з нерухомай маёмасцю. Уводзяцца крымінальныя санкцыі за выкарыстанне рабскай працы, распаўсюджванне дзіцячай парнаграфіі і прастытуцыі.

Гэта толькі некаторыя змяненні і дапаўненні, прапанаваныя ў дзеючае заканадаўства, якія дэпутаты абмяркуюць на сесіі. Увогуле ж папраўкі ідуць ад жыццёвых праблем. Мы разглядаем усе прававыя нововвядзенні з таго пункту гледжання, ці зменяць яны да лепшага стан спраў у той ці іншай сферы грамадскіх адносінаў і наколькі прынясуць карысць людзям.

Акрамя новых заканадаўчых ініцыятыў дэпутаты разгледзяць і шэраг дэкрэтаў кіраўніка дзяржавы, сярод якіх — «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь», «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі». Значная ўвага на сесіі будзе нададзена таксама ратыфікацыі міжнародных дагавораў і пагадненняў. Я ўжо назваў Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб урэгуляванні пытанняў уласнасці Саюзнай дзяржавы. У сесійным партфелі ёсць і іншыя дакументы міжнароднага характару. У іх ліку міжурадавыя пагадненні з В'етнамам і Карэяй аб паветраных зносінах, Пагадненне з Міжнародны фінансавай карпарацыяй аб Прадстаўніцтве гэтай структуры ў Беларусі, Асноўнае пагадненне нашай краіны з Дзіцячым фондам ААН, Дагавор з Латвійя аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння.

— Што дасць Пагадненне аб уласнасці Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі?

— Гэта яшчэ адзін крок да ўмацавання супрацоўніцтва нашых краін. Пагадненне паспрыяе развіццю інтэграцыйных працэсаў, паслядоўнаму вырашэнню задач саюзнага будаўніцтва.

— Па тым, што вы расказалі, Вадзім Аляксандравіч, можна зрабіць выснову, што дзявятая сесія Палаты прадстаўнікоў трэцяга склікання будзе даволі працаёмкай. Перадфінішны час не расхаладзіў дэпутатаў?

— Я ўпэўнены, што на сесіі мы будзем працаваць у звыклым рытме — напружана і інтэнсіўна. У дэпутатаў дастаткова прафесіяналізму і адказнасці, каб дастойна завяршыць свае парламенцкія паўнамоцтвы.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

АЦЯПЛЕННЕ ПАКУЛЬ НЕ ЎКЛЮЧАЦЬ

Уключаць ацяпленне ў сталічных кватэрах у бліжэйшыя дні не плануецца. Аб гэтым паведаміў генеральны дырэктар РУП «Мінскэнерга» Васіль Бабей на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме. «Згодна з нарматывам, ацяпленне ў жылых дамах уключаецца, калі сярэднясутачная тэмпература на працягу пяці сутак ніжэй за +8 градусаў, — сказаў Васіль Бабей. — Да гэтага паказчыка наблізіліся. Але ў нядзелю было ўжо больш за 10 градусаў цяпла. А ў бліжэйшы час чакаецца пацяпленне. Думаю, што ў пачатку кастрычніка, магчыма, уключым ацяпленне».

Як паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава, на гэтым тыдні дзякуючы скандынаўскаму антыцыклону чакаецца невялікае пацяпленне. Атмасферны ціск пачне расці. Воблачнае з праясненнем і адносна цёплае надвор'е захаваецца ў сталіцы да выхадных. Удзень паветра прагрэецца да + 11... + 17 градусаў, уначы будзе павосеньску халаднавата — усяго 3—9 градусаў цяпла. Але ўжо ў суботу ў Беларусь прыйдзе атлантычны цыклон і прынясе ападкі. У нядзелю надвор'е пагоршыцца. У пачатку наступнага тыдня стане яшчэ халаднейшае.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск — Навіны».*

З УДЗЯЧНАСЦЮ

З 1 па 10 кастрычніка ў Мінску пройдуць мерапрыемствы, прымеркаваныя да Міжнароднага дня пажылых людзей.

Як паведаміла намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Святлана Ліцвінка, на працягу тыдня сацыяльныя работнікі наведаюць дома і ў стацыянарных лячэбных установах мінчан пажылога ўзросту, якія з-за дрэннага здароўя не змогуць прысутнічаць на святочных мерапрыемствах, і ўручаць сувеніры і падарункі. У гэтыя дні ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва для пажылых людзей будуць арганізаваны канцэрты, конкурсы, чаяпіцце. У гарадзе таксама адбудуцца дабрачынныя спектаклі, кінасеансы, вечары адпачынку. Міжнародны дзень пажылых людзей адзначаецца 1 кастрычніка. На ўліку ў органах сацыяльнай абароны сталіцы знаходзяцца больш за 360 тысяч атрымальнікаў пенсіі. Па выніках абследаванняў матэрыяльна-бытавых умоў жыцця пажылых гараджан выяўлена 19 224 адзінокія і 54 976 адзінока пражываючых пенсіянераў. Усе яны знаходзяцца на ўліку ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання Мінска.

Надзея ІЛЬЯШУК, *«Мінск—Навіны».*

Ці доўга будуць выдаваць нектары за сокі?

Чула, што з 1 верасня на сокі і нектары ўведзены новы стандарт. Але разглядваючы ўпакоўкі сокаў у магазіне, нічога новага на іх не заўважыла. Да таго ж і смак сокаў, так бы мовіць «бюджэтных» марак, лепшым не стаў. Таматныя сокі часта нагадваюць распушчаную ў вадзе таматную пасту. А апельсінавыя і мультысадавінныя сокі змяшчаюць проста ўдарныя дозы цукру, хоць іх вытворцы і заяўляюць смела на ўпакоўцы, што павінна змяніцца для спажыўцоў пасля ўвядзення новага стандарта?

Т.П. Ласунова, *г. Мінск.*

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў Беларускім дзяржаўным інстытуце стандартызацыі і сертыфікацыі, спачатку ў Беларусі была распрацавана «Канцэпцыя развіцця нарматыўнай базы ў галіне стандартызацыі сокаў і соказмяшчальных прадуктаў», скіраваная на павышэнне тэхналагічнага ўзроўню вытворцаў, канкурэнтаздольнасці выпускаемых прадуктаў і абарону айчыннага рынку ад паступлення няякаснай прадукцыі. І ўжо ў працяг гэтай канцэпцыі Навукова-практычным цэнтрам па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук былі распрацаваныя стандарты на сокі, нектары і соказмяшчальныя напоі: агульныя тэхнічныя ўмовы іх вытворчасці і асноўныя тэрміны і азначэнні. Немалаважна, што новыя стандарты былі прыведзеныя ў адпаведнасць з еўрапейскімі стандартамі.

У прыватнасці стандарт СТБ П 1826-2008 устанаўлівае асноўныя тэрміны і азначэнні паняццяў у галіне вытворчасці кансерваваных сокаў з садавіны, агародніны, ягад, нектараў і соказмяшчальных напояў. Згодна з гэтым стандартам, наша класіфікацыя, як і ва ўсім свеце, будзе ўключаць два віды сокаў: сокі прамога адціскання і адноўленыя. Адноўлены сок атрымліваецца шляхам аднаўлення канцэнтраванага соку ці канцэнтраванага пюрэ або пасты падрыхтаванай пітной вадой у суадносінах, што забяспечваюць захаванне арганалептычных, фізіка-хімічных уласцівасцяў і, галоўнае, харчовай каштоўнасці сокаў.

100-працэнтным сокам можа называцца толькі сок без аніякіх дабавак, доля пладовай часткі ў якім складае 100 працэнтаў. Сок з цукрам павінен утрымліваць не менш як 85 працэнтаў пладовай часткі і не больш як 15 працэнтаў цукру. Калі напой змяшчае толькі ад 25 да 50 працэнтаў пладовай часткі — гэта не сок, а нектар. Для алычовага і гранатавага нектару мінімальная масавая доля пладовай часткі складае 25 працэнтаў, для вішнёвага — 35 працэнтаў, сунічнага (клубнічнага) — 40 працэнтаў, яблычнага — 50 працэнтаў і г.д.

Да таго ж новы стандарт дае азначэнне такім напоям, як морс, соказмяшчальны напітак і соказмяшчальны кактэйль. Морс — гэта вадкі прадукт, атрыманы са свежых ці замарожаных ягад, з масавай доляй ягаднага соку ці пюрэ не менш як 15 працэнтаў, з дабаўленнем ці без дабаўлення цукру, глюкозы, фруктозы, мёду і іншых інгрэдыентаў.

Соказмяшчальны кактэйль — гэта вадкі прадукт, які атрымліваюць з сумесі сокаў і (ці) пюрэ (у тым ліку канцэнтраваных), з пастаў аднаго ці розных найменняў у любой камбінацыі з падрыхтаванай пітной вадой, цукрам, мёдам, у якой масавая доля соку і (ці) пюрэ складае ў залежнасці ад віду садавіны і гародніны не менш як 20 працэнтаў. У соказмяшчальныя кактэйлі могуць дадавацца малочныя прадукты, кавалачкі садавіны і гародніны, харчовыя кіслоты, аскарбінавая кіслата, экстракты раслін, натуральныя ці ідэнтычныя натуральным араматызатары, канцэнтраваныя натуральныя духмяныя рэчывы, стабілізатары, вітаміны і г.д. І, нарэшце, соказмяшчальны напітак атрымліваецца шляхам змешвання даведзенай да пюрэпадобнага стану ядомай часткі дабраякасных спелых свежых пладоў, ягад, агародніны ці сокаў з садавіны і гародніны, пюрэ і пастаў у любой камбінацыі з пітной вадой, цукрам, мёдам, лімоннай кіслатой. Масавая доля соку і (ці) пюрэ з садавіны або гародніны ў соказмяшчальных напітках павінна быць не менш як 10 працэнтаў.

Аднак, як нам патлумачылі ў Беларускім дзяржаўным інстытуце стандартызацыі і сертыфікацыі, дадзены стандарт з'яўляецца папярэднім. Адпрацоўка яго патрабаванняў будзе праводзіцца на працягу двух гадоў — да 1 верасня 2010 года. Такім чынам, у беларускіх прадпрыемстваў будзе час, каб мадэрнізаваць сваю вытворчасць і прывесці ў адпаведнасць са стандартамі і свае тэхналогіі, і якасць вады, якая будзе выкарыстоўвацца для адпаўнення соку. Для сэкыўцоў гэта азначае, што ў бліжэйшы час сокі старога ўзору з магазінных паліц, наўрад ці знікнуць.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

Да канца верасня дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

23 верасня — галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Людміла Эдуардаўна МАКАРЫНАКІБАК.

24 верасня — намеснік дырэктара РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Рышард Рамуальдавіч СІДАРОВІЧ.

25 верасня — начальнік аддзела ліцэнзавання фармацэўтычнай дзейнасці Міністэрства аховы здароўя Вольга Пятроўна ШЫШЭЯ.

26 верасня — галоўны спецыяліст аддзела медэкспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Людміла Захараўна ГАРНОВА.

29 верасня — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ігар Віктаравіч ЛАЗАРЧЫК.

30 верасня — галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Віктар Іванавіч МАСЛА.

«ГАРАЧАЯ» ЛІНІЯ УПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА (017) 220 20 25:

23 верасня:

9.00—12.00 — галоўны ўрач Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Дзмітрый Уладзіміравіч ЗАЙЦАЎ.

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога радзільнага дома Тамара Канстанцінаўна АЛЯКСАНДРАВА.

30 верасня:

9.00—12.00 — галоўны ўрач Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Алег Анатольевіч ЖЫВАЕЎ.

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога радзільнага дома Сяргей Раманавіч МАЗІТАЎ.

У графіку магчымыя змяненні.

«Лістапад-2008» у Бабруйску

У Бабруйску прайшла II восеньская выстава «Лістапад-2008», якая доўжылася тры дні.

Тут была прадстаўлена прадукцыя большасці беларускіх прадпрыемстваў — тэкстыль, прадукты, упрыгажэнні, сувеніры, вырабы з керамікі, са скуры, а таксама — тэхніка, трактары, увогуле вельмі разнастайны асартымент. У якасці гасцей на «Лістападзе» былі прадстаўлены і расійскія прадпрыемствы. Ідэя заснавання выставы ўзнікла два гады таму і належала бабруйскаму філіялу «Магілёўскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты». Галоўныя задачы выставы — азнаёміць бабруйчан з прадукцыяй іншых гарадоў і рэгіёнаў краіны, асабліва з малым і сярэднім бізнэсам, пашырыць рынак збыту для прадпрыемстваў.

Наталія НОВІК.

Мішава сэрца

Аўтамабільная кампанія, афіцыйны прадстаўнік Mazda і Land Rover у Беларусі, далучылася да дабрачыннай праграмы «Сэрца жыве», мэта якой — збор 350 тысяч еўра на аперацыю па перасадцы сэрца Мішы Ларыну. Кампанія пералічыла на рахунак Мішы 1 тысячу еўра.

Акцыя «Сэрца жыве» была аб'яўлена яшчэ ў чэрвені па ініцыятыве групы «J:морс» і газеты «Комсомольская правда в Беларуси». З таго часу на сайце serca.tut.by беларускія музыканты выкладваюць свае новыя песні і эксклюзіўныя запісы, а таксама просяць добраахвотнікаў пералічваць грошы на дабрачынныя рахункі. У Мішы — дылітацыйная кардыяміпатыя. Складанае захворванне выклікае гібель, што і адбылося з Мішыным братам-блізняком. У дадзены момант Міша падключаны да апарата штучнага сэрца. Адзінае выратаванне ў такіх выпадках — перасадка хворага органа, але пакуль падобную аперацыю робяць толькі за межамі краіны. Сабраць жа неабходныя 350 тысяч еўра бацькам хлопца не па сілах.

Пераводы па Беларусі: філіял 511 ААТ «ААБ Беларусбанк». Код 815 УНП 100349858. Карэспандэнцкі рахунак (S.W.I.F.T.) 6111000000266.

У беларускіх рублях — р/р 3819382103561 для пералічэння на рахунак № 01000019 для Ларына Міхаіла, у еўра — 9780010000006, у доларах ЗША — 8400010000217, у расійскіх рублях — 6430010000013.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Простыя рэчы

ЧАРАВІКІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У самым пачатку васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя ў мяне ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў першы зборнічак вершаў. Тады, уласна кажучы, гэта было адзінае дзяржаўнае выдавецтва, дзе выдаваліся кнігі паэзіі. У тым жа годзе выйшла і першая кніга Ірыны Багдановіч, якая сёння — вядомы літаратар, навуковец. А тады нас запрасілі зняцца на Беларускім тэлебачанні. Вядучы праграмы Рыгор Барадулін вывеў нас у прыемны мінскі сквер, што ля танка, які стаіць каля Дома афіцэраў. Мы сядзелі на лавачцы, чыталі свае вершы. Спыняліся выпадковыя людзі, слухалі, глядзелі, як нас запісваюць на тэлекамеру. Прызнаюся, на дзяўчыну з прыгожымі вачыма глядзелі больш. Ды і вершы яе гучалі, відаць, лепш. А называлася яе першая кніжачка — «Чаравікі дзяцінства». Назва па тым часе вельмі нязвычная, але гучная, кранальная. Паэтэса адышла ад звыклых у тыя часы нормаў, падала сваю паэзію па-жаноцку тонка. І прагучала гэта выдатна. Я са сваімі рублёнымі фразамі быў грубаватым. Ну што ж, мужчына застаецца на экране заўсёды на другім плане. Хаця пасля той перадачы была мне ад кіраўніцтва тэлеканала прапанова стаць дыктарам. Быў малады, яшчэ не сівы, з добрым валоданнем нашай мовай...

Такім чынам, чаравікі.

А што ім папярэднічала? Лапці. Самы надзейны яшчэ і ў пачатку XX стагоддзя абутак селяніна. Лапці пляліся з лыка, бяросты, вяровак. Лапаць, зразумела, быў прыкметай беднасці і пэўнай адсталасці людзей. Лапці сёння шчодра вывешваюць у этнаграфічных музеях, як напамінак аб былой беднасці селяніна. Ды што селяніна. У нейкага генерала, у яго ваенных мемуарах прачытаў, што яшчэ ў дваццатыя гады чырвонаармейцы і іх камандзіры хадзілі ў лапцях. І вось рэкай, які так нічога і не зразумеў.

На лапці не аб'ехаць — тут ужо насмешка да твайго, напрыклад, невялікага ўчастка зямлі.

Плесці кашалі з лапцямі — так, пляліся і кашалі адначасова з лапцямі, але ў кашалях-кошыках насілі нешта каштоўнае, а лапці сведчылі якраз аб нястачы.

Гэта ў нас, славян. А яшчэ старажытныя грэкі мелі абутак — сандалі. Драўляная альбо скураная падэшва без абцасаў, якая мацавалася да нагі раменьчыкамі. Грэчаскае — sandalion. Ад іх у нашай мове ёсць **сандалеты** — лёгкія летнія туфлі, якія вельмі любяць і сёння адпачываючыя і на берагах паўднёвых мораў, і на берагах родных нам азёр і рэк. Але ж ёсць у гэтай простай рэчы і чыста беларуская, паўзабытая назва — абутак з падвязанай на раменьчыках падэшвай нашы продкі называлі **пасталамі.** Ёсць і **туфаль** альбо **пантофля,** памяншальна-пяшчотна гучыць — **туфлік.**

Просценькія сандалецікі былі нашым абуткам у дзяцінстве. Бегалі мы ўвесь летні час басанож. А вось выйсці з бацькамі ў горад, як гаварылася, сфатаграфавацца ці прайсціся па крамах — тут абавязкова і хлопчыкаў, і дзяўчынак прымушалі мыць ногі, апраналі шкарпэткі і **сандалікі.**

Бл

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ЗаСЛОНа ад знікнення

Ёсць нагода

22 верасня лічыцца Сусветным днём абароны слоноў — самых буйных з сучасных наземных млекакормячых. У апошнія гады іх колькасць істотна скарацілася. Напрыклад, па падліках эколагаў, яшчэ 15 гадоў таму ў Кеніі (Афрыка) налічвалася каля 130 тысяч слоноў, цяпер жа іх не больш як 20 тысяч. Усяго на афрыканскім кантыненце слоноў засталося менш як 750 тысяч асобін (для параўнання: у 1979 годзе налічвалася звыш 1,3 млн асобін), у Азіі папуляцыя скарацілася да 30 тысяч слоноў. Прычына таму — як масавае паляванне за слановай косткай, так і выраджэнне жывёл.

Каб прыцягнуць увагу да гэтай праблемы, у гонар слоноў па ўсім свеце экалагічныя арганізацыі наладжваюць святы і фестывалі. Так, у Індыі праходзяць гонкі на слонах і нават чэмпіянат па «слановым полу».

А вось у Беларусі ахоўваць... няма каго. Цяпер слоноў няма ні ў адным з шасці заапаркаў рэспублікі. Чаму? «Патрэбна адпаведнае памяшканне, — патлумачыла загадчык заатэхнічнага аддзела Мінскага заапарка Эла Рабава. — Слон — афрыканскі ці індыйскі — цеплалюбівая жывёла, для яго неабходна пастаянна падтрымліваць пэўную тэмпературу і вільготнасць, да якой ён звыклы. І калі летам яшчэ можна ўтрымліваць слана на вуліцы, то ў астатні час — абавязкова ў памяшканні». А яго пакуль што няма — сталічны заапарк толькі-толькі абнаўляецца і перажывае рэканструкцыю, таму пытанне набыцця слана магчымае хіба што ў аддаленай перспектыве. На сёння самае буйное млекакормячае ў Мінскім заапарку — зубр. Прыкладна тая ж карціна ў Магілёўскім, Жлобінскім і Акцябрскім заапарках, дзе найбуйнейшыя з «жыхароў» — мядзведзі.

У Гродзенскім дзяржаўным заапарку, які адзначыў летась 80-годдзе, слаценяк ёсць. Але ён пустуе з 2002 года, калі памёр адзіны слон, што жыў у Беларусі — агульны любімец па мянушцы Сурак. Ён быў прывезены ў Гродна з Германіі, з Лейпцыгскага заапарка ў 1964 годзе, і пражыў амаль 40 гадоў. Супрацоўнікі заапарка спадзяюцца, што ў Гродне ўсё ж будуць жыць слоны — але гэта магчыма толькі пасля рэканструкцыі слаценяка. «Пакуль што яна не распачатая, няма нават праекта, таму не магу вам расказаць, якім будзе новы слаценяк. Але будынак будзе цалкам перароблены — расказала дырэктар заапарка Цэліна Пагерыла. — Нельга пакуль што і прагназаваць, колькі будзе каштаваць набыццё слана. Але, думаецца, калі будынак адновім, то знойдзем грошы і на пакупку. Папярэдне плануем, што гэта будзе не пара, а толькі адзін слон — экспазіцыйны экзэмпляр, бо ўтрымліваць большую колькасць жывёл не дазваляе плошча».

У Віцебскім заапарку, дзе пражывае найстарэйшы ў Беларусі 21-гадовы леў Рыгус, слаценяк, кажуць, няма і ніколі не было. Сёлета вясной, праўда, праходзіла інфармацыя, як быццам Віцебскаму заапарку невядомы мецэнат падарыў слана, і некаторыя нашы калегі спрабавалі высветліць падрабязнасці падзеі. Але інфармацыя аказалася «вуткай», першакрасавіцкім жартам...

З ЖЫЦЦЯ СЛАНОЎ

Сярэдняя працягласць жыцця слаценяк набліжана да чалавечай; як правіла, жывёліны жывуць да 70 гадоў. Самым старым слаценяк лічыцца Лінь Вань з Тайваня — баявы слон, якія нават служыў у кітайскай арміі падчас другой кітайска-японскай вайны. Памёр у 2003 годзе ва ўзросце 86 гадоў.

Індыйскія слаценяк драбнейшыя за сваіх афрыканскіх суродзічаў. Калі азіяты важаць ад 3,5 да 5 тон пры росце да 3 метраў, то афрыканскія жывёліны дасягаюць 7 і нават больш тон пры росце да 4 метраў.

Унікальны слаценяк орган — хобат, які ўтрымлівае каля 40 тысяч мышцаў. З яго дапамогай жывёла можа падняць як груз вагой у 200—250 кг, так і маленькую шпількі. Акрамя таго, у хобаце слаценяк часта пераносяць ваду — да 7,5 літра.

Ходзіць жарт, што вушы афрыканскіх слаценяк нагадваюць па форме абрысы гэтага мацерыка, а азіяцкіх — адпаведна Індыі.

Слаценяк — адзіныя жывёліны, якія не могуць скакаць.

Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, слаценяк не баяцца мышэй. Нават калі грызун залезе ў хобат, слон можа набраць паветра і «стрэліць» мышшу!

Афрыканскі слон Loxodonta africana занесены ў Чырвоную кнігу IUCN. Эколагі папярэджваюць — калі не прымаць рашучых мераў, гэты від можа знікнуць з твару зямлі літаральна ў бліжэйшыя гады.

ПАДЛЯГАЮЦЬ АХОВЕ

Зразумела ж, клапаціцца неабходна не толькі пра слаценяк. Актывісты-эколагі ведаюць яшчэ мноства памятных дат:

19 лютага адзначаецца Сусветны дзень кітоў, які распаўсюджваецца таксама на ўсіх марскіх млекакормячых і іншых жывых істот, якія насяляюць моры і акіяны. Дзень усталяваны з 1986 года, калі Міжнародная кітовая камісія абвясціла забарону на кітовы промысел.

1 сакавіка — Сусветны дзень катоў, а роўна праз месяц, **1 красавіка** — Сусветны дзень птушак.

24 красавіка — Сусветны дзень абароны лабараторных жывёл.

16 жніўня — Міжнародны дзень бадзяжных жывёл. Паводле статыстыкі, толькі бяздомных сабак у Беларусі налічваецца звыш 30 тысяч, і адным адловам праблему не вырашыць.

4 кастрычніка ў календары — Міжнародны дзень абароны жывёл, усіх увогуле. А **10 снежня** — Міжнародны дзень абароны правоў жывёл, які, дарэчы, не выпадкова супадае з Днём абароны правоў чалавека...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СУСВЕТНАЯ ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЯ ЛЯСОЎ

ААН аб'явіла аб пачатку глабальнай акцыі па ацэнцы маштабаў працэсу знікнення лясоў на планеце. Штогод страчваецца трынаццаць мільёнаў гектараў лясных угоддзяў.

ААН непакоіць узніклая апошнім часам заканамернасць паміж змяншэннем плошчаў лясоў і павышэннем аб'ёмаў выкідаў у атмасферу вуглякроду, што ўплывае на клімат, у прыватнасці, з'яўляецца адной з прычын пацяплення. Якім чынам будзе весціся маніторынг лясных рэсурсаў? Двума спосабамі: шляхам глабальнага дыстанцыйнага зандзіравання і метадам збору палявых даных. Для сусветнай інвентарызацыі лясоў ствараецца глабальная сетка спецыялістаў па маніторынгу лясных рэсурсаў у 176 краінах, таксама ў гэтай рабоце будуць удзельнічаць нацыянальныя эксперты.

Леанід ТУГАРЫН.

У СТАЛІЦЫ СТАЛІ ЧАСЦЕЙ КРАСЦІ АЎТАМАБІЛІ

У Мінску сталі часцей красці аўтамабілі. З пачатку гэтага года міліцыі давялося адшукваць 219 машын, гэта на 45 аўто больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Як паведаміў намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама Раман Мельнік, у 90 працэнтах выпадкаў машыны былі вернуты законным уладальнікам. Пры гэтым часцей за ўсё кралі «Жыгулі», «Масквічы», «Опелі», «Форды» і «Фольксвагены».

Кацярына ГУСЕВА, *«Мінск—Навіны».*

НЕ ЎТРЫМАЎСЯ

Раніцай жыхар аднаго з дамоў па вуліцы Тэкстыльнай, што ў Баранавічах, вырашыў з агульнага балкона пералезці на балкон свайго пакоя. Але 25-гадовы «верхалаз» не ўтрымаўся і ўпаў. Ад атрыманых траўмаў ён памёр.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Добрыя людзі

ВІКТАР І СІТАЎКА

Раніцай я сустрэў сітаўку. Яна выбегла з-пад куста, падбегла да мяне, пастаяла і вярнулася пад свой куст. Гэтую сітаўку я ведаю добра, бачу ледзь не кожную раніцу, ідучы ў майстэрню. А сягоння я пашкадаваў, што няма ў мяне ў кішэні нічога такога, каб пачаставаць знаёмую пташку. Тут мне і згадалася карціна Віктара «Чалавек, якога не баяцца пташкі». Раней я заўсёды думаў, што чалавек, намаляваны Віктарам Папковым, нейкі надзвычайны. Той чалавек стаяў на беразе мора і маляваў вялікіх бела-блакітных чаек. Тых чаек вакол чалавека была процьма. Пэўна ж, Віктар схітраваў, ён не намаляваў рыбу, якой чалавек карміў пташак... Так мне падумалася, калі мая знаёмая сітаўка забягала пад свой куст.

ГЛОБУС І АДКЛАДАННЕ

Сваё прозвішча можна пачуць зусім нечакана, як зараз я... Іду праз чыгуначны вакзал і чую абвестку па радыё: «Старшы насільшчык — Глобус, тэрмінова зайдзіце ў адміністрацыю вакзала!» Я ледзь было сам не пайшоў у тую адміністрацыю, але спыніўся і вырашыў адкласці знаёмства з цёзкам па прозвішчы маёй маці. Нідзе ён не дзенецца з чыгуначнага вакзала, пазнаёмлюся другім разам. Прыдумаецца нагода, і пазнаёмлюся, а не прыдумаецца, і не буду знаёміцца са старшым насільшчыкам Глобусам, бо не лёс.

БРАТ І КАРЫДА

З Барселоны брат даслаў эсэмэску: «Карыда — не цукерка з гематагену... Учора быкі забадалі дваіх тарэадораў. Аднаго бык падняў на рогі і матляў, як ляльку з анучаў. Другога бык патаптаў».

ЯДЗЯ І ЗАЯЦ

Толькі чалавек пачне збірацца ў падарожжа, як вакол яго ўсынаецца мітусня. Калі ж той чалавек — твая малодшая і любімая дачка Ядзя, дык той мітусні робіцца ўдвая болей. А калі яна выпраўляецца на працу ў Парыж, дык хоць ты схавайся куды ад гурбы яе праблемаў. «Дзе валіза? Якія красоўкі браць? У гэтай сукенцы я нармальна выглядаю? Ты ведаеш, чалавек, з якім я павінна ехаць на машыне, не вельмі ўзрадаваўся, калі пачуў мой голас у тэлефоне!!! Можа мне зусім не ехаць? Ён жа яшчэ сабраўся ў Кёльн заязджаць на два дні... Што я буду ў тым Кёльне рабіць два дні? Сам падумай... На чорта мне ў той Кёльн заязджаць?» — «Не едзь! Можаш зусім не ехаць ні ў Кёльн, ні ў Парыж!» — «І не паеду!» — «Не едзь! Вазьмі квіток на самалёт і ляці! І чым хутчэй ты паляціш, тым лепей!» — «І вазьму, і палячу!» — «Ляці!» Узяла квіток і паляцела, і прызямлілася, і патэлефанавала, каб хлопцу, які збіраўся ехаць у Парыж праз Кёльн, перадалі фотаўспышку, якую яна забылася дома. «Дык ён жа ж выехаў раней, чым ты паляцела...» — «Ён позна ўвечары даехаў да Брэста, а перад самай мяжою на дарогу выскачыў заяц. Ён не захацеў давіць зайца і павярнуў у лес. Машыны ў яго больш няма. Заўтра ён вылятае ў Парыж, і трэба аддаць яму фотаўспышку...» Фотаўспышка паляцела ў Парыж. Два дні жыву без мітусні. Дома ціха, як у начным лесе.

ТАТА І ЛЕЦІШЧА

Тата любіў сваё лецішча з крыху недагледжаным садам і двухпавярховым дамком, пафарбаваным у лёгка-блакітны колер. Тое лецішча я недалюбліваю, колькі маці ні запрашае туды пад'ехаць, адмаўляюся катэгарычна. Усе звыкліся з тым, што я на лецішча ні нагою. Мусіў прывыкнуць і я, а не прывык. Учора ўначы, праязджаючы непадалёк ад Лысай гары і бацькавага летняга дамка, я нечакана для сябе знайшоў адказ на пытанне, чаму я не хачу туды наведвацца. Пэўна, гэта адзінае месца, дзе бацька застаўся для мяне нібыта жывы. Пасля ягонае смерці я так ні разу і не падняўся на другі паверх блакітнага дома, дзе тата працаваў з вясны да восені. Для мяне ён усё яшчэ там, ён усё яшчэ працуе над сваёю беларускай прозаю.

Адам ГЛОБУС.

Жывы запіс у дапамогу

Муз-news

Гурт «Ляпис Трубецкой» узяў удзел у акцыі «Сэрца жыве» — днямі на сайце serca.tut.by была змешчана для бясплатнага скачвання эксклюзіўная версія песні «Залатыя яйкі».

Гэты хіт, упершыню выдадзены на аднайменным альбоме ў 2004 годзе, і цяпер застаецца адным з самых запатрабаваных канцэртных нумароў, але ў «жывой» версіі раней ніколі не выпускаўся. Цяпер жа прыхільнікам даступны гэты запіс, зроблены на канцэрце ў мінскім Палацы спорту напрыканцы 2005 года. «Песня абсалютна несур'ёзная, але я спадзяюся, што яна дапаможа зрабіць сур'ёзную і важную справу», — разважае лідар гурта Сяргей Міхалок.

Нагадаем, мэта дабрачыннай акцыі, у якой удзельнічаюць многія вядомыя беларускія поп- і рок-выканаўцы — сабраць 350 тысяч еўра, неабходных для аперацыі па перасадцы сэрца Мішу Ларыну. Цяпер на рахунках знаходзіцца ўжо каля 55 тысяч еўра. Усе падрабязнасці, нумары рахункаў, інфармацыя для банкаўскіх пераводаў з-за мяжы — на сайце serca.tut.by.

Не карпаратывам адзіным...

Апошнім часам калегі па цэху заўважылі, што спявачка Аня Шаркунова зачасціла ў Маскву. Папаўзлі нават чуткі, што артыстка збіраецца заключыць кантракт на работу ў расійскай сталіцы.

«Так, ёсць некалькі прапаноў папрацаваць у Маскве і ў Кіеве, — пацвярджае спявачка. — Але гаварыць аб гэтым пакуль што падрабязна не варта — баюся сурочыць». Пачалося ж усё, паводле прызнання Ані, з карпаратыўных і прыватных мерапрыемстваў, дзе беларускую спявачку прымалі як сваю, а некаторыя песні нават пачынналі падпяваць... Нядаўна Ані даверыліся і больш адказную місію — Міністэрства культуры ўключыла артыстку ў склад беларускай творчай дэлегацыі, якая выступала на святкаванні Дня Масквы. На галоўнай канцэртнай пляцоўцы на Цвярской вуліцы свае песні слухачам дарылі Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская, Ірына Дарафеева, Пётр Елфімаў, Ксюша Сітнік, Андрэй Кунец, Аляксей Жыгалковіч, ансамблі «Песняры» і «Бяседа».

«Пунсовыя парусы» на новы лад

Так можна ахарактарызаваць сюжэт кліпа «Асоль», знятага рэжысёрам Аляксандрай Бутар для гурта «Лекі ад меланхоліі». Дарэчы, з 8 кліпаў у скарбонцы гурта палова належыць менавіта гэтаму рэжысёру.

У відэагісторыі дзейнічаюць дзве пары герояў: жывыя, рэальныя — акцёры Тэатра беларускай драматургіі Максім Паніматчанка і Кацярына Прохарава, — і намаляваныя. Прычым апошніх «ажыўлялі» менавіта з рухаў сапраўдных акцёраў. Героі сустракаюцца ў кафэ, і завязваюць дыялог... малюючы на сурвэтках гісторыю Грэя і Асоль. Праўда, завяршаецца яна досыць нечакана — дзяўчына сыходзіць, а з ёй сплывае на лодачцы і Асоль...

А вось каго ў кліпе і блізка не бачна, гэта саліста «Лекаў ад меланхоліі» Яўгена Салдаценкі. «Я са сваім рылам у калашны рад не выйшаў, — жартуе выканаўца. — У крайнім выпадку магу пацешыць сваё самалюбства, як рэжысёр Разанаў — зняцца ў другаснай ролі на заднім плане. А так — я ўжо самавыявіўся ў песнях, а ў галоўных ролях у кліпе павінны быць усё ж занятыя прафесіяналы. Дарэчы, іх рэжысёр падабрала ідэальна — калі б кліп рабіў я, то менавіта такія тыпажы герояў і шукаў бы!». Са свайго боку, акцёры адзначылі, што ім спадабаліся здымкі, а галоўнае — спадабалася музыка, дзеля якой усё гэта рабілася. Зрэшты, галоўная ацэнка ўсё ж за слухачамі і гледачамі. У бліжэйшы час кліп «Асоль» трапіць на айчынныя тэлеканалы.

Беларускі след у «Розыгрышы»

Яшчэ адзін беларускі музычны калектыў дэбютаваў у кіно — музыка мінскага гурта «Tanin Jazz» стала саўндтрэкам маладзёжнай расійскай камедыі «Розыгрыш». Фільм гэты, дарэчы, у верасні ўжо выйшаў у пракат у сталічных кінатэатрах.

«Розыгрыш» — гэта рэмейк аднайменнага славутага фільма Уладзіміра Мяньшова 1976 года, у якім упершыню зняўся дзевяцікласнік Дзмітрый Харацьян. Сюжэтная лінія засталася тая ж: у выпускны клас прыходзіць новы вучань і кідае выклік прызнанаму лідару... Карціну здымаў беларускі рэжысёр Андрэй Кудзіненка на студыі Паўла Лунгіна, бацька якога напісаў сцэнарый да першага «Розыгрышу». Акрамя таго, у фільме гучыць чатыры кампазіцыі беларускага гурта «Tanin Jazz» — дзве інструментальныя і дзве песні.

Усю музыку да іх напісала салістка калектыву Таццяна Гарошка, таксама як тэкст песні «Feel This Time», а тэкст песні «Віртуальнае каханне» належыць пастаяннай аўтарцы гурта Алене Ермаловіч. Дарэчы, у абедзвюх дзяўчат ёсць вопыт настаўніцкай працы, таму сюжэтная лінія фільма ім блізкая. «Я гэту «вучылку» вельмі добра разумею! — заўважае Алена. — Сама памятаю: трэба ісці і працаваць, а там робіцца... што-небудзь гэткае. Але фільм не ўспрымаецца як цяжкі, магчыма таму, што многія выхадкі і двухсэнсоўныя жарты вучняў цяпер успрымаюцца як звычайныя штукі. Павесіць настаўніцы прэзерватыў — мілая справа...».

За працай у кіно дзяўчаты не забываюцца на асноўны занятак — творчасць — і 2 кастрычніка абяцаюць прадставіць слухачам свой першы альбом «Feel This Time».

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Упершыню каля сталічнага Палаца спорту прайшоў кірмаш «Рыба Беларусі». Дзевяць рыбалоўных гаспадарак прапанавалі мінчанам і гасцям сталіцы па самай нізкай надбаўцы рыбу з усёй краіны. Не абышлося на свяце і без галоўнай рыбнай стравы — юшкі, пакаштаваць якую змаглі ўсе ахвотныя.

KALTENBERG У БЕЛАРУСІ!

«Каралеўская баварская якасць у Беларусі можа быць і ўжо ёсць. У чым змаглі ўпэўніцца ўсе аматары добрага і смачнага піва»

У гасцініцы «Еўропа» прайшла прэс-канферэнцыя пад назвай «Кальтэнберг — каралеўскае баварскае піва ў Беларусі» пры ўдзеле прынца Баварскага Люітпольда фон Баерна. Гэта сустрэча насіла зусім не выпадковы характар. Справа ў тым, што ў 2005 годзе быў заключаны ліцэнзійны дагавор паміж кампаніяй «Кёніг Людвіг Інтэрнэшнл» і беларускай «Крыніцай» аб вытворчасці «Кальтэнбергу» ў Беларусі. З таго часу аматары якаснага піва атрымалі добрую магчымасць пакаштаваць сапраўднае баварскае піва, лепшае ў Еўропе. Гэты статус быў пацверджаны ў чэрвені ў Англіі на World Beer Cup — у намінацыі World's Best Premium Lager першы прыз атрымала піва Kaltenberg Special.

І гэта не дзіўна! Бо ў самым сэрцы Баварыі, за 40 км ад Мюнхена, стаіць цудоўны замак Kaltenberg, рэзідэнцыя яго каралеўскай Высокасці прынца Баварскага Люітпольда, у сценах якой знаходзіцца адна з апошніх сапраўдных піваварняў. Прынц асабіста кіруе піўным заводам і сочыць за якасцю піва, зваранага па старых рэцэптах яго сям'і.

Гісторыя каралеўскага баварскага піва налічвае больш за 800 гадоў. Kaltenberg вядомы сваім характэрным піўным пахам і лёгкім араматам хмелю, трошкі гаркаватым прысмакам і ўтрыманнем алкаголю не менш за 4,5 % — усё гэта з'яўляецца неад'емнай часткай баварскага гатунку Pils. Увесь працэс стварэння праходзіць пад якасным кантролем высокакваліфікаваных півавараў кампаніі Konig Ludwig International. Таму піва атрымліваецца не проста смачным, а яшчэ і карысным. Паляпшае абмен рэчываў, супакойвае і ўзнімае настрой, умацоўвае сардэчную мышцу і косці.

На прэс-канферэнцыі прынц фон Баерн адзначыў паспяховае супрацоўніцтва з беларускім заводам «Крыніца». Таксама выказаўся аб магчымасці далейшага ўкаранення баварскага піва «Кальтэнберг» на наш рынак, бо прызнанне сапраўдных аматараў працягвае расці і адчуваецца ў павелічэнні аб'ёмаў продажаў на 56 працэнтаў у параўнанні з леташнім годам! Хочацца пажадаць поспехаў у такім цікавым супрацоўніцтве і спадзявацца, што дэвіз «Праца без межаў» сябе апраўдае!

Дзіяна АРЫПАВА.

«Белая вежа-2008»

ПАД ПЕСНІ ДАЖДЖУ

Балет «Шчаўкунчык» Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Рэспублікі Беларусь.

Фота БЕЛТА.

у прамым і пераносным сэнсе прайшоў міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа» ў Брэсце. У прамым, таму што такога надвор'я, як сёлета, аўтар гэтых радкоў на фестывальным тыдні не памятае. Звычайна фэст сустракаў сваіх удзельнікаў лагоднай берасцейскай восенню. А цяпер сярэдзіна верасня аказалася шчодрай толькі на дождж і холад. Ну а ў пераносным — таму што фурор выклікаў спектакль «Песні дажджу» тэатра пластычнай драмы «ЧалаВЕК» імя Нэлі Дугар-Жабан з С.-Пецярбурга. Спектакль рэжысёра Ігара Грыгуркі атрымаў дыплом I ступені фестывалю. У кулуарах да апошняга моманту хадзілі чуткі, што менавіта гэта работа забярэ галоўную ўзнагароду фэсту. Але ж трэба зразумець і журы, ім сапраўды цяжка было судзіць такія рознажанравыя паказы. Пластычныя, вулічныя, лялечныя, драматычныя спектаклі належала прывесці да адной роўніцы. У рэшце рэшт не важна, якую ўзнагароду прысудзілі «Песням дажджу», важна, што спектакль стаў падзеяй «Вежы-2008». Такой грацыі і пластыкі, такога ўмення на мове цела перадаваць унутраныя перажыванні чалавека, танчэйшыя межы разнастайных адносінаў мужчын і жанчын, бясконцасць іх, першапачатковае адзінства чалавека з прыродай у нас яшчэ не бачылі. Спектакль без слоў глядзіцца на адным дыханні. Гадзіна праходзіць незаўважна.

Гран-пры трынаццатай «Вежы» павёз у Казань Татарскі дзяржаўны акадэмічны тэатр за пастаноўку «Чорная бурка». Героі п'есы Пастух, Сабака, Воўк, Заяц, Крумкач сабралі ў сабе ўсе рысы нашага сучасніка — носьбіта ўсялякіх кампрамісаў, агрэсіі, страху, але і гонару, годнасці таксама. «Чорная бурка» — філасофская прыпавесць аб доўгу і гонары, каханні і здрадзе. Падчас атрымання ўзнагароды ўдзельнікі спектакля расказалі, што праца прысвечана іх любімаму настаўніку, стваральніку тэатра, якога ўжо няма з імі. Можа яшчэ і таму так самааддана іграліі акцёры.

Дарэчы, дыплом «За лепшую мужчынскую ролю» атрымаў артыст гэтага ж тэатра Іскандэр Хайрулін за ролю Тузара. Узнагародай «За лепшую жаночую ролю» адзначана Таццяна Сцяпанчанка за ролю Ізэ ў спектаклі «Паўдзённы раздзел» Цэнтра драматургіі і рэжысуры з Масквы.

Некалькі адзнак фестывалю атрымалі і беларускія ўдзельнікі праграмы фэсту. Спецыяльны прыз журы за плённае супрацоўніцтва нацыянальных тэатральных культур атрымаў спектакль «Макбет» Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, пастаўлены Альгірдасам Латэнасам. Такую ж узнагароду атрымаў мастак Брэсцкага тэатра драмы і музыкі Віктар Лесін за лепшую сцэнаграфію ў спектаклі «Злачынства і кара». Спецыяльны дыплом за дзёрзкі творчы пошук у спектаклі «Ах, Галівуд, Галівуд, Галівуд!!!» атрымаў Тэатр-студыя імя Яўгена Міровіча з Мінска. Такі ж дыплом за пошук мовы пластыкі прысуджаны пастаноўцы «Зіма», «Дэ-Рэ», «Мухі на сонцы» Тэатра сучаснай харэаграфіі з Мінска.

Трынаццаты фестываль, які сабраў 28 творчых калектываў з 15 краін свету, перадаў сваю эстафету чатырнаццатаму. Сёлета, паводле інфармацыі арганізатараў фэсту, спектаклі наведалі каля 19 тысяч чалавек. Асноўную частку нашага гледача старшыня журы галоўны рэдактар расійскага часопіса «Тэатральнае жыццё» Алег Піваваў назваў «таленавітай публікай». Паводле яго назіранняў, ва ўспрыманні нават складанейшых інтэлектуальных, філасофскіх спектакляў на тварах людзей было разуменне, або імкненне да разумення. І што асабліва ўразіла мэтра, усё сказанае характэрна і для самай маладой часткі аўдыторыі, што асабліва абнадзейвае. Не першы раз даводзіцца чуць ад знакамітых замежных тэатразнаўцаў, што брэсцкі глядач мае выхаваны густ, ён падрыхтаваны і крышачку таленавіты. Мусіць яно так і ёсць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Народная эцыклапедыя

Вясельнае застолле: ДЫК «ГОРКА» ЦІ СОЛАДКА»?

Крок за крокам мы разглядалі розныя складнікі даволі працяглага па часе перадвясельнага перыяду, затым паступова, надаючы значную ўвагу шматлікім дэталям, пачалі разгляд пачатковага этапа ўласна самога вяселля: вызначылі форму святочнага стала, патлумачылі прынцыповую схему пасадкі гасцей, акрэслілі кола найбольш тыповых рытуальных страў, размеркавалі функцыянальныя абавязкі галоўных вясельных чыноў. Можна з палёгкай уздыхнуць — усё гатова. Здавалася б, засталося толькі пачуць доўгачаканую каманду-бласлаўленне свата: «З Богам!» або «Дай, Божа, у добры час!». Аднак перш чым паважаны сват-тамада возьме сябе ў рукі, справіцца з эмоцыямі і абвесціць вясковаму люду, з якой нагоды ён сабраўся за званым сталом, мы зробім яшчэ некалькі заўваг, якія датычацца нашага нацыянальнага менталітэту.

Па-першае, **паўсюдна лічылася, што ладзіць святочнае застолле ні ў якім разе нельга на пасычаныя грошы**. Гэтая забарона напрасткі звязана з адным з галоўных правілаў народнай культуры, якое патрабуе: аддай усе пазыкі перад Новым годам. У маладых людзей скончыўся адзін цыкл жыцця і распачынаўся новы, яшчэ больш працяглы і адказны. Таму распачынаць яго нельга было з праблемамі, якія вяжуць па нагах яшчэ з давясельнага часу. А з іншага боку, пачатак новага цыкла жыцця неабходна было маркіраваць рытуалам, які скіраваны быў на праграмаванне сямейнага дабрабыту. Тут ужо правамоцную сілу набірае яшчэ правіла беларускай традыцыі, якое мы добра памятаем па нашых паводзінах у веснавы час. Пачулі ўпершыню зязюлю, патрасіце ў кішэні манеты, якія будуць з вамі на гэты час. Казалі, што пустая кішэня прадракала на ўвесь будучы год недахоп фінансавых сродкаў. Вясельны абрад у значнай ступені быў тоесным моманту зязюльчыных прадказанняў. Па сутнасці ў ім закадзіравана ўся гісторыя будучага жыцця заручанай пары, таму існавала глыбокая перакананасць, што гучнае вяселле на пазычаныя грошы не прынясе маладым шчасця. Дарэчы, гэты ж самы рэгламентуючы прынцып пашыраецца і на паводзіны сваякоў у кантэксце пахавальнага абраду. **Крайне непажаданым лічылася пазычаць у суседзяў адзенне для нябожчыка або нейкія атрыбуты, якія павінны будуць суправаджаць яго ў момант пераходу ў іншасвет.**

Па-другое, адным з краевугольных камянёў нашага менталітэту з'яўляецца правіла, сэнс якога сфармуляваны ў паслявясельным дыялогу паміж госцем і тым, хто не прысутнічаў на ўрачыстасці: «Ну, як вяселле?» — «Ой, усё добра, усё добра. Адно кепска — прымусу не было!»

Сярод беларусаў існавала няпісанае правіла, у адпаведнасці з якім госці павінны былі спяваць, весяліцца, жартаваць, танцаваць, але пры гэтым не напівацца і стрымліваць сябе ад пераядання. Беларускае традыцыйнае вяселле было не толькі строга рэгламентаваным абрадам, падзеі якога напярад ведаў кожны запрошаны госць і дакладанага выканання якога ён бясспрэчна прытрымліваўся, але яшчэ і драматычнай дзеяй, псіхалагічным спектаклем, у якім кожны персанаж дакладна ведаў сваю ролю, месца, статус, за якімі, у сваю чаргу, стаялі агульнаграмадскія жыццёвыя стасункі. Вясельнае застолле — гэта шматпланавы дыялог, у цэнтры якога былі маладыя, але разам з тым кожны госць быў звязаны з імі, а найперш з іх бацькамі сотнямі нябачных, але вельмі адчувальных нітачак-сувязяў. Вось гэты пульсуючы нерв і трэба было не парушыць ні сватам, ні бацькам жаніха і нявесты. Калі сват і свацця трымалі руку на пульсе ўсёй святочнай дзеі, надаючы ёй адпаведную дынаміку, ствараючы атмасферу весялосці (у пэўнай ступені штучнай), то бацькі маладых штохвілінна разыгрывалі міні-спектаклі з удзелам кожнай запрошанай сям'і. Яны ўзгадвалі нейкія цікавыя выпадкі, здарэнні з удзелам таго ці іншага госця, імкнуліся выказаць сваю павагу, пачівасць, падзяку за прынятае запрашэнне. А самае галоўнае было ў тым, што кожны з гэтых адрасных дыялогаў быў скіраваны на тое, каб угаварыць-упрасіць госця падняць кілішак, выпіць за здароўе маладых і пасля гэтага закусіць тым, «што Бог паслаў». І толькі пасля працяглых угавораў госці пачыналі налягаць на прыгатаваныя прысмакі. Уласна кажучы, вось гэты псіхалагічны падтэкст і яго ўдалае выражэнне і былі гарантам таго, што пра такое вяселле будуць доўга гаварыць: «Удалося на славу!» Калі ж бацькі не здолеюць дасканала выканаць ролю мясцовых дыпламатаў, пра такое вяселле скажуць: «Прымусу не было».

Узнікненне ўзгаданага фразеалагізма зусім невыпадковае. На жаль, у практыцы правядзення святочных застолляў сустракаліся і непрадбачаныя абставіны. Побач з адкрытасцю душы, шчырасцю, гасціннасцю, шчодрасцю існавалі і сквапнасць, скупасць, якія не прымаліся аднавяскоўцамі. Здаралася, гаспадары ішлі на розныя хітрыкі, каб стрымаць апетыт гасцей. Сярод іх былі і зусім нечаканыя (аб чым сведчаць звесткі фальклорыстаў XIX ст.): «І на вясельнай бяседзе і на іншых ашчадныя гаспадары хочуць, каб іх госці менш пілі і еліды хутчэй разыходзіліся па хатах, не тлумілі б галавы. Дзеля гэтага стол засцілаюць тым абрусам, які ляжаў тут пры нябожчыку, а знізу ў яго ўтыркаюць нож: тады госці хутка захочуць спаць і разыдуцца. Калі госці ведаюць гэткія гаспадарскія хітрыкі, зайшоўшы ў хату, яны найперш падыходзяць да печы і глядзяць у комін: тады чары гаспадароў губляюць сілу».

Нарэшце і гэты падводны рыф святочнай урачыстасці мы мінулі. Сват даў знак, каб усе сцішыліся, і з разуменнем выключнай значнасці падзеі блаславіў яе пачатак: «З Богам». У імгненне вока ў хаце ўсталявалася цішыня. Галоўны цырыманіял-майстар абвясціў аб тым, дзеля чаго сабраўся вясковы люд. Не паспеў ён дагаварыць сваю прамову да канца, як прастора хаты напоўнілася спевам жаночага гурта. Трэба сказаць, што характэрнай асаблівасцю беларускіх традыцыйных вяселляў з'яўляецца амаль пастаяннае і абавязковае суправаджэнне кожнага віншавання спецыяльнымі песнямі ў выкананні лепшых вясковых спявачак. Даволі часта сэнс песні зводзіўся да прамой ілюстрацыі чарговага абрадавага дзеяння або шчырага віншавання якога-небудзь госця. Не паспеў сват абвясціць аб тым, што сённяшні агульнародавы фэст прысвечаны вельмі адказнай падзеі ў жыцці не толькі жаніха і нявесты, але і усіх прадстаўнікоў двух пародненых родаў, як хор жанчын перахапіў ініцыятыву і па-свойму пракаментаваў гэты этап святочнай урачыстасці:

Ляцелі гусі з далёкай Русі,
Наехалі госці з нашай Беларусі.
Гэта сватоўе — знаць, што паноўе,
Знаць, што паноўе,
панскага роду —
Не п'юць гарэлкі, чакаюць мёду.
— А ў нас пчолкі не параілі,
Для Вас мядочку не нанасілі.

Тут жа самыя актыўныя памочнікі сватоў падхоплівалі яшчэ адну песню, словы якой запрашалі гасцей распачаць святочны абрадавы дыялог і служылі адным з першых «прымусаў» з боку сваякоў нявесты:

Ліце, госцейкі, дужа
У добрага мужа.
Ліце і гуляйце,
Добрыя мыслі майце,
Добрыя, дабрэнькія,
Госцейкі міленькія.

Сёння, на жаль, шмат што ў нашых вяселлях пераасэнсавана на сучасны манер, але зусім не ў лепшы бок. Часцей за ўсё гэтыя змены — вынік нашага элементарнага няведання прынцыпаў пабудовы старой традыцыі, а таксама перастаноўкі прадугледжаных абрадам акцэнтаў. На самым пачатку вясельнага застолля сват прапанаваў падняць кілішак і ўшанаваць не саміх віноўнікаў урачыстасці, а **выпіць за тых, хто стаяў каля вытокаў радаводнай кнігі быцця — за продкаў ганаровага Роду**, жывым увасабленнем якога з'яўляліся бабулі і дзядулі заручанай пары і, вядома ж, перш за ўсё з таго боку, які распачаў вясельную дзею — з боку нявесты.

Другім тостам госці жадалі **ўшанаваць бацькоў нявесты**. Як правіла, гама пачуццяў, якімі былі напоўнены песні ў адрас маці маладой, была мінорнай. Гэта зразумела — маці, якая ўзгадавала сваю «доню», развітвалася з ёю, адпраўляла ў чужую сям'ю. Таму і песні, адрасаваныя ёй, былі напоўнены смуткам і думкамі аб развітанні:

Будзе ж табе, мая мамачка,
Да без роднае дачкі.
Пойдзеш у поле шырокае
Ды буйное жыта жаці,
Зойдеш постацьку шырокую —
Да некаму паджынаці.
Нажнеш снапок, нажнеш другі —
Да некаму і звязаці.
Скажаш слоўца да другое —
Да некаму адказаці.
Гэта ж табе, мая мамачка,
Да без роднага дзіцяці.

І толькі трэці тост быў адрасаваны непасрэдным віноўнікам урачыстасці — **жаніху і нявесце**. І вось тут у развіцці вясельнага рытуалу адбываўся істотны псіхалагічны пералом. Не паспелі госці прыгубіць кілішак, як дом у літаральным сэнсе слова выбухаў ад нечаканых эмоцый. Услед за сватам усе дружна пачыналі крычаць урачыстае зычэнне: «Горка!». Абрадавы сэнс гэтага зычэння-заклічу ў дадзеным кантэксце далёка неадназначны.

(Працяг будзе.)

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗДАРОВЫ БІЗНЭС

Лепшы прадпрымальнік года Сяргей КАЗЛОЎ не толькі раіць, але і дапамагае трымаць сябе ў форме

У конкурсе «Лепшы прадпрымальнік года-2008» лепшым прадпрыемствам у сферы фізкультурна-аздараўленчых паслуг сёлета стала ўнітарнае прадпрыемства Нацыянальнага алімпійскага камітэта «Спартыўна-аздараўленчы комплекс «Алімпійскі». Выйграць конкурс у гэтай намінацыі ў Год здароўя не столькі ганарова, колькі складана — да гэтай сферы зараз асаблівая ўвага і патрабаванні. Затое прадпрыемства правамерна можа ганарыцца тытулам, атрыманым якраз у свой 10-ы, юбілейны год. Але, паводле слоў генеральнага дырэктара Сяргея Казлова, галоўнае тое, што паслугі, якія аказвае САК «Алімпійскі», карыстаюцца попытам у насельніцтва. З кастрычніка па май трапіць, скажам, у басейн не так і проста — ахвотнікаў наведваць комплекс у цэнтры горада больш чым дастаткова. А каб трапіць у дзіцячы басейн «Малютка», дзе працуюць групы навучання плаванню, бацькі гатовыя месяцамі чакаць у чарзе.

— Сяргей Сяргеевіч, віншуем вас з узнагародай. Раскажыце падрабязней, як выйгралі конкурс.

— Хоць конкурс і называецца «Лепшы прадпрымальнік года», ацэньваецца не кіраўнік, вядома ж, а прадпрыемства.

— Якія аспекты ў рабоце прадпрыемства ацэньваюцца пры вызначэнні лепшых?

— Стан базы, эфектыўнасць працы, эканамічны складнік, рэнтабельнасць, колькасць працуючых на прадпрыемстве, сярэдняя месячны заробак работнікаў.

— І якім чынам дасягаецца высокая рэнтабельнасць вашага прадпрыемства?

— За кошт гібкай цэнаўтваральнай палітыкі. А ў першую чаргу — шырокі спектр паслуг, якія пастаянна растуць і развіваюцца. Гэта басейн, які працуе тут даўно, гэта спартыўна-аздараўленчыя цэнтры з саўнамі, гэта ўнікальны ў рэспубліцы адкрыты басейн з мінеральнай вадой, якая здабываецца прама на тэрыторыі комплексу са свідравіны глыбінёй 500 метраў. Вада ўнікальная па складзе — не хапае ўсяго аднаго ці двух кампанентаў, каб яна была падобная да марской. Гэта паслугі фітнэс-залаў, танцавальных залаў, більярд на тэрыторыі «Алімпа», арыентаваны на моладзь і студэнтаў, гэта і спартыўныя залы па валейболе і міні-футболе. Да зімы мы падрыхтавалі і адкрытую лядовую пляцоўку і памяшканне для пракату канькоў. Мы пастаянна ствараем новыя паслугі, як толькі бачым, што яны сталі папулярныя ў насельніцтва...

— Ваш комплекс выкарыстоўваецца і нацыянальнымі камандамі для падрыхтоўкі да міжнародных спаборніцтваў і Алімпійскіх гульняў...

— САК «Алімпійскі» — база падрыхтоўкі нацыянальных камандаў па водных відах спорту — плаванне, сінхроннае плаванне, скачкі ў ваду і воднае пола. Рэзерв — юніёрская зборныя каманды — рыхтуюцца на нашых футбольных палях. Сёлета сумесна з федэрацыяй футбола мы ўвялі новае футбольнае поле са штучным пакрыццём і сістэмай падагрэву, асвятленнем. Поле выкарыстоўваецца зборнымі камандамі — маладзёжнымі, юніёрскімі, юнацкімі, таксама камандай «Суворавец» сувораўскага ваеннага вучылішча. Астатні час займаюць айчынныя футбольныя клубы — «Дынама», МТЗ-РІПА, БАТЭ — хто паспее. Тут праводзяцца і матчы чэмпіянату рэспублікі па футболе ў першай лізе. Два гады таму мы адкрылі гасцініцу для спартсменаў, кавярню «Акваторыя», што дазваляе праводзіць замкнуты цыкл — спартсмены ў нас жывуць, харчуюцца і трэніруюцца. Валейбалісты займаюцца ў «Алімпе» — у нас выдатны трэніровачны зал з сучасным нарвежскім пакрыццём. Жаночая зборная па валейболе, якая цяпер выйшла ў фінал чэмпіянату Еўропы, выкарыстоўвае наш зал і спартыўна-аднаўленчы комплекс як асноўную базу падрыхтоўкі.

— Звернемся ўсё ж да больш шырокага кола спажыўцоў вашых паслуг. Ці існуюць скідкі для аматараў здаровага ладу жыцця?

— Прадпрыемства цалкам гаспадарчаразліковае. Ніякіх ільгот на цяпло, энергарэсурсы, падатковых ільгот і датацый з бюджэту яно не мае. Таму цэны дыктуе рынак. Калі я бачу, што ў касы чэргі і народу хапае, а так яно звычайна і бывае з кастрычніка па май, то цэны мы не знімаем. З падаражэннем цепла- і энергарэсурсаў і мы вымушаны ісці на павышэнне цаны. Але стараемся ўтрымацца на такім узроўні, каб нашы цэны і паслугі былі даступныя масавому спажыўцу. Цяпер пра скідкі. Яны існуюць для неабароненых слаёў насельніцтва — для студэнтаў, пенсіянераў — гэта 30-працэнтнае змяншэнне цаны, для інвалідаў — 50-працэнтнае. А цяпер у басейне праходзіць акцыя: сеанс плавання ў вярсні каштуе ўсяго пяць тысяч рублёў — амаль 50-працэнтная скідка для ўсіх аматараў здаровага ладу жыцця. Мы пайшлі на гэта, улічваючы Год здароўя, алімпійскі год і наша жаданне, каб людзі восенню не ад грыпу і прастуды пакутавалі, а аздараўляліся. Многія, вядома ж, здзіўленыя такім цэнам — нідзе ў горадзе нічэжыя няма.

Яшчэ адна эксклюзіўная паслуга — дзіцячыя групы навучання плаванню ў дзіцячым басейне «Малютка». Дзяцей з пяці гадоў (з чатырох у выглядзе выключэння) мы прымаем у суботу і нядзелю на 45-хвілінныя сеансы. Дзеці, пазаймаўшыся з інструктарам чатыры месяцы, упэўнена трымаюцца на вадзе. У верасні мы пачынаем прадаваць абанементы, а бацькі тэлефануюць з пачатку верасня, каб запісаваюцца, як у старыя добрыя часы за дэфіцытам. Групы эфектыўныя, з традыцыяй. Праз чатыры месяцы дзеці плаваюць і летам з імі можна спакойна ехаць адпачываць.

— Што яшчэ выгадна вылучае ваш комплекс?

— Наш мінеральны басейн з даўняй гісторыяй — ён пабудаваны ў 1967 годзе, цяпер прайшоў поўную рэканструкцыю. З аднаго боку, ён захаваў усе старыя працэдуры, якія мінчане любілі, але ўсё стала сучасным, камфортным, і адпавядае еўрапейскім стандартам. З'явілася новая мармуровая плітка, лаўкі з падагрэвам. Яшчэ адзін наш плюс — месцазнаходжанне. Нам пашанцавала знаходзіцца паміж Паркам Чалюскінцаў і Батанічным садам — у месцы з добрай экалогіяй і ў цэнтры горада. Выдатна, што ў нялёгкія 90-я ўсё гэта было захавана, а не пайшло пад элітную забудову. Цяпер наша задача — захаваць гэту ўнікальную тэрыторыю ў 17 гектараў з лесапаркавай зонай. Мы забаранілі тут аўтамабільны рух, зрабілі пешаходную зону, сёлета падчас суботніку алімпійскія чэмпіёны пасадзілі фруктовы сад з сотні дрэў.

Канкурэнцыя не дазваляе спыняцца на дасягнутым. На наступны год мы адкрыем стадыён пляжнага спорту, бо гэта цяпер набірае папулярнасць — па пляжным валейболе, футболе і гандболе пачалі праводзіцца нават чэмпіянаты свету. Насупраць стадыёна пляжных відаў спорту будзе пабудавана тры адкрытыя тэніснымі корты. Я вывучаў гэтыя тэндэнцыі — адкрытыя корты летам занятыя лепш, чым закрытыя. Пра каток я ўжо ўзгадваў, а летам мы пастараемся прыцягнуць туды ролераў — адкрыем пракат, паставім туды горкі — магчыма, спрацуе і гэта.

— Застаецца пажадаць вам поспехаў і перамог.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Прызнаўся

Тры гады праляжаў у каналізацыйнай яме ў Баранавічах труп жанчыны, якая знаходзілася ў рэспубліканскім вышуку за ўхіленне ад выплаты сродкаў на ўтрыманне дзіцяці.

Міліцыя высветліла, што ў чэрвені 2005 года жанчыну падчас скандалу некалькі разоў ударыў сужыцель і пайшоў з хаты. Калі ён вярнуўся праз два дні, жанчына была мёртвая. Убачыўшы гэта, сужыцель вырашыў замесці сляды.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КАНЬЯКУ! І ПАБОЛЕЙ

Кіраўнік дыпмісіі Арменіі ўпэўнены, што пастаўкі гэтага напою ў Беларусь можна было б і павялічыць

Пасол Алег ЕСАЯН назваў слынны на ўвесь свет армянскі каньяк асноўным элементам экспарту ў Беларусь. Побач з віном, вінаматэрыяламі і мінеральнымі водамі...

— Беларусь праводзіць палітыку пратэкцыянізму ўласных вытворцаў, я з разуменнем стаўлюся да гэтага. Аднак пастаўкі каньяку скараціліся, — адзначыў спадар Есаян падчас сустрэчы з журналістамі, прысвечанай Дню незалежнасці Арменіі. — Нямногія імпарцёры і наяўнасць квот... Мы маглі б пастаўляць у 10 разоў больш дастаткова канкурэнтаздольнай прадукцыі, на яе ёсць запыт.

Ён удакладніў, што пастаўкі варта было б пашырыць і ў плане колькасці прадукцыі, і ў плане яе асартыменту. Кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва таксама выказаў жаданне, каб гэта пытанне стала прадметам абмеркавання падчас сустрэчы кіраўнікоў нашых краін.

У канцы апошняга восеньскага месяца можна чакаць візіту ў Беларусь Эдуарда Налбандзяна — кіраўніка Міністэрства замежных спраў Арменіі. Ён прыбудзе на запрашэнні свайго калегі — міністра Сяргея Мартынава. Напрыканцы года, мяркуецца, пройдуць чарговыя пасяджэнні беларуска-армянскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і камісіі па міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Спадар Есаян выказаў спадзяванне, што гэтыя мерапрыемствы дадуць новы стымул палітычнаму, эканамічнаму і культурнаму супрацоўніцтву дзвюх дзяржаў, услед за імі падвоіўся (і, паводле інфармацыі Алега Есаяна, перасягне да канца года суму ў 30 млн доларaў). Аб прававой базе, якую ўтвараюць 64 заключаныя дагаворы і пагадненні... Пакрысе развіваецца міжведамаснае і міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, узяць хоць бы гарады-пабрацімы — Жодзіна і Каджаран, а таксама візіт дэлегацыі Мінскай вобласці ў адну з абласцей Арменіі. На тэрыторыі Арменіі створанае сумеснае прадпрыемства «Прамаграсэрвіс», заснавальнікам якога з беларускага боку выступіла кампанія «Прамагралізінг».

— У кастрычніку пачнецца пастаўка прадукцыі, — запэўніў кіраўнік дыпламатычнай місіі.

У Арменію будуць пастаўляць беларускія трактары, МАЗы, лідскія аўтобусы, дарожную тэхніку, шыны. За кошт гэтага плануецца істотна павялічыць аб'ём узаемнага тавараабароту. Другім важным крокам стане адкрыццё ў Арменіі сэрвіснага цэнтра. Ён возьме на сябе не толькі абслугоўванне пастаўленай айчыннай тэхнікі, але і капрамонт той, якой карыстаюцца ў краіне з даўніх часоў.

Пасол спадзяецца і на развіццё сувязяў у сферы турызму. Ён паведаміў, што сёлета ў Беларусі пабывалі 322 армянскія турысты.

Не засталося без увагі і «карабахскае» пытанне:

— Арменія цвёрда прытрымліваецца неабходнасці мірнага міжнародна-прававога ўрэгулявання карабахскай праблемы. Таму што іншага шляху вырашэння падобных канфліктаў проста няма, — падкрэсліў дыпламат. — І нядаўнія падзеі на Каўказе дастаткова яркa паказалі, што ўчарашні «замарожаны» канфлікт сёння можа быць нават вельмі гарачым.

Выхад Грузіі з СНД, на думку пасла, асаблівага ўрону Садружнасці не нанясе, хоць, безумоўна, і не ўзмацніць яго. «Прыкметных зрухаў у адмоўны бок не адбудзецца», — выказаў меркаванне Алег Есаян. Ён заўважыў, што Грузія падпісала менш чым палову дакументаў Садружнасці, а ратыфікавала і таго менш — палову падпісаных. Аднак пры гэтым, аб'явіўшы аб выхадзе з СНД, краіна абяцала выконваць раней узятыя абавязкі. «І гэта ўжо добра», — рэзюмаваў пасол.

Спадар Есаян у чарговы раз выказаў удзячнасць за тое, што ў Беларусі спакойна пражывае і працуе армянская суполка — адна з самых шматкласных у краіне. «Дружба народаў у Беларусі з'яўляецца нацыянальным багаццем, гэта асноватворны фактар стабільнасці ў краіне», — падкрэсліў пасол. Для Арменіі гэта пытанне актуальнае таму, што дзве трэці насельніцтва, як праінфармаваў спадар Есаян, пражывае за межамі радзімы. Нездарма ж у хуткім часе (з першага кастрычніка) у дзяржаве пачне работу новае міністэрства — па справах дыяспары.

Ала МАЧАЛАВА.

Міліцыя Мінска раіць гараджанам мяняць дзвярныя замкі кожныя пяць гадоў

Дзвярны замок, які выкарыстоўваецца ў кватэры больш за 5 гадоў, не здольны забяспечыць бяспеку ў выніку старэння і зносу механізма. Аб гэтым паведаміў намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі (МГБ) ГУУС Мінгарвыканкама Раман Мельнік на прэс-канферэнцыі ў мэрыі.

Выказваючы рэкамендацыі па захоўванні маёмасці, ён заклікаў гараджан не эканоміць на дзвярных запорах, патлумачыўшы, што ўзламаць стары замок з павышанай сакрэтнасцю па заканчэнні тэрміну для зламысніка не складана. Гэта датычыцца злачынстваў, якія ўчыняюцца шляхам падбору ключа або іншых прылад.

Такую ж параду прадстаўнік сталічнага ГУУС даў і ў дачыненні да ўваходных дзвярэй: «Калі драўляныя дзверы не мяняліся з моманту пабудовы дома, не трэба быць спецыялістам, каб зразумець, што яны не могуць засцерагчы ад кватэрнага крадзяжу». Паводле слоў Рамана Мельніка, дзейсным спосабам абароны свайго жылля з'яўляецца ўстаноўка металічных дзвярэй, вялікі выбар якіх сёння прапануе рынак. Самым жа надзейным метадам ён назваў выкарыстанне тэхнічных сродкаў аховы.

У цэлым, у Мінску за студзень — жнівень сёлета колькасць крадзяжоў з жылых памяшканняў знізілася на 35 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года і склала 2 тыс. У сярэднім у горадзе штодня ўчыняецца 12 кватэрных крадзяжоў, трэць з якіх раскрываецца. Найбольш частыя крадзяжы ў спальных раёнах сталіцы — Заводскім, Маскоўскім, Фрунзенскім.

Аксана ШЫКУЦЬ, БЕЛТА.

Затаварыўся...

У дачыненні да 45-гадовага жыхара Фаніпаля Дзяржынскага раёна, дырэктара аднаго з таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, аддзелам папярэдняга расследавання Ваўкавыскага РАУС узбуджана крымінальная справа.

Падазраецца кіраўнік таварыства ў махлярстве: як мяркуецца, дырэктар з кастрычніка 2005-га па красавік гэтага года завалодаў прадукцыяй РУП «Ваўкавыскі завод дахавых і будаўніча-апрацовачных машын» на 72 мільёны рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Выпрабавана на сабе

ДАРАЖЭЙ, АЛЕ СЁННЯ. ТАННЕЙ, АЛЕ ЗАЎТРА

Людзей, якія ўдзельнічаюць у дарожным руху, можна падзяліць на тры катэгорыі — вадзіцелі, пасажыры і пешаходы. Прычым шмат каму даводзіцца рэгулярна выконваць кожную з гэтых «роляў», і ацэнкі тут зусім неаднолькавыя. Вось толькі некаторыя ўражанні карэспандэнта «Звязды».

З пункту гледжання вадзіцеля...

Кожны паважаючы сябе, іншых удзельнікаў дарожнага руху і, вядома ж, станцыю тэхагляду вадзіцель павінен клапаціцца аб нармальным стане сваіх «колаў». Напрыклад, у транспартным сродку ёсць такая дэталь, як паветраны фільтр. Гэта не надта ўжо і складаны, у параўнанні з іншымі, канструктыўны элемент аўтамабіля, аднак вельмі важны. У прыватнасці, ад яго стану залежыць расход паліва і таму, каб разам з выхлапнымі газамі ў паветра не выкідваліся і вашы грошы, фільтр трэба своечасова мяняць. Здавалася б, што за праблема... У кожным буйным горадзе, і Гродна тут не выключэнне, дзясяткі гандлёвых пунктаў з проста каласальным асартыментам аўтазапчастак: выбірай бліжэйшую ад дома ці гаража і ўсё на гэтым. Але, аказваецца, не ўсё так проста.

У першым магазіне фільтра ў наяўнасці не было, аднак «пад заказ» яго маглі даставіць дзён праз дзесяць. Кошт — 48 тысяч рублёў. Накіроўваюся ў другую краму. Там можна было набыць фільтр адразу ж, але для гэтага маё матэрыяльнае становішча павінна было пагоршыцца ажно на 61 тысячу рублёў. Шукаем далей. У наступным гандлёвым пункце рука ўжо пацягнулася за кашальком, паколькі здалося, што танней за 47 тысяч рублёў нідзе не будзе. Ды і без заказу, не трэба чакаць. І ўсё ж вырашыў зрабіць яшчэ адну спробу. У гэтай краме фільтр каштаваў 31 тысячу рублёў, праўда, трэба было пачакаць да заўтра, калі прыйдзе машына з таварам.

Зрэшты, у падобнай сітуацыі не выключана, што скупы плаціць двойчы. Хоць і даражэйшае, як патлумачыў «па сакрэце» адзін з гандляроў аўтазапчасткамі, не абавязкова больш якаснае. А адсюль і выснова: купляць у праверaных практыкай пунктах, у людзей, якія ніколі вас не падводзілі.

А вось дзе няма сэнсу шукаць больш выгадныя для вашага бюджэту варыянты, дык гэта на аўтазаправачных станцыях. Паліва ўсюды каштуе аднолькава, а дынаміка цэнаў вядома якая. Псіхалагічна вы да гэтых павышэнняў ужо падрыхтаваныя, бо прызвычаіліся, што кошт нафты на сусветных рынках у апошнія гады пастаянна ставіць рэкорды. Але вось па тэлебачанні — сенсацыя: раптам нафта пачынае таннець. Для кагосьці — праблема, а аўтааматар быццам бы і павінен быць у выйгрышы. Аднак у цэннікаў на аўтазапраўках свая, невядомая дылетантам у галіне нафтабізнэсу логіка...

...Пасажыра

Еду ў «маршрутцы» і ў чарговы раз пераконваюся, што ўмовы працы вадзіцеля даволі нясцерпныя. Адной рукой трэба трымаць руль, а другой — браць ад пасажыраў грошы і вяртаць рэшту. У аўтобусах і тралейбусах так не робяць, абілечванне праводзіцца на прыпынках перад пачаткам руху, а тут чамусьці можна, звычайная рэч. Хоць, вядома ж, такая сістэма зусім не дапамагае шафёру сканцэнтраваць увагу на дарожнай сітуацыі. А яна з кожным годам, асабліва ў буйных гарадах, становіцца ўсё больш складанай, бо павялічваецца колькасць аўтамабіляў.

У Севастопалі, да прыкладу, у дадзенай сітуацыі вадзіцелі не рызыкуюць. Плата за праезд бярэцца з пасажыраў на прыпынках пры выхадзе з мікрааўтобуса і гэта не стварае ніякіх затрымак, хутка і зручна для ўсіх.

Госці Севастопаля звяртаюць увагу і на тое, што ў апошнія гады актыўна абнаўляецца парк «маршрутак». І наўрад ці магчыма сітуацыя, калі мікрааўтобус застаецца без... дзвярэй. Менавіта так здарылася аднойчы з аўтарам гэтых радкоў, калі па завяршэнні паездкі ён паспрабаваў зачыніць дзверы, а яны ўзялі ды і саскочылі са свайго месца. І добра яшчэ, што гэты даволі салідны па вазе кампанент транспартнага сродку не пакалечыў мне ногі. А далей... Думаеце, вадзіцель адразу ж кінуўся да пасажыра з прабачэннямі? Не, ён пайшоў у атаку, маўляў, трэба ўмець зачыняць дзверы і гэта па маёй віне ў яго будзе парушаны графік руху. Супакоіўся толькі тады, калі пачуў прапанову выклікаць на месца здарэння спецыялістаў адпаведных кантралюючых органаў, якія б разабраліся, ці меў права аўтамабіль выязджаць на лінію ў такім тэхнічным стане.

...Пешахода

Сярод славянаў ёсць такое паняцце, як вадзіцельская салідарнасць. Яна праяўляецца ў тым, што сустрэчнаму транспарту сігналізуюць фарамі аб знаходжанні на трасе супрацоўнікаў ДАІ, а значыць, трэба быць пільным, не парушаць хуткасны рэжым і іншыя правілы дарожнага руху. Аднак ці заўсёды такія папярэджанні на карысць парадку на дарогах? Наколькі дысцыплінуюць яны вадзіцеля, які з вашай дапамогай пазбегнуў штрафных санкцый?

Аб гэтым падумалася пасля нядаўняга здарэння на адным з пешаходных пераходаў абласнога цэнтра, якое не зарэгістравана ў Дзяржаўтаінспекцыі, але надоўга застанецца ў маёй памяці. Зялёны сігнал святлафора, раблю некалькі крокаў і раптам... Ледзь не пад самым носам на шалёнай хуткасці праносіцца машына. Да бяды было так блізка, што цяпер разумееш пешаходаў, асабліва пажылых людзей, якія, хоць і маюць права перайсці праезную частку, але чакаюць, пакуль будуць «задаволеныя» ўсе аўтамабілі. Разумееш і тое, што нельга быць салідарным з тымі, хто ігнаруе нормы паводзінаў на дарогах, паколькі гэта пагражае жыццю не толькі самога парушальніка.

Барыс ПРАКОПЧЫК.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 27 (595)
аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 30122102700016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца гараж, нядорага, у райцэнтры г. Гарадок.
Тэл. 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

❒ Дом у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці ў добрым стане, 96 кв. м.
Тэл. 8 02357 220 29, 8 044 792 05 82.

❒ Катэдж 2-павярховы (газ, сад, вада) каля ракі Нёман 40 км ад г. Ліды, 18 тыс. у.а.
Маб. тэл. 889 95 10.

❒ Палова пачатага будаўніцтва 2-кватэрнага дома з майстэрнямі ў Брэсцкім раёне, ёсць будматэрыялы — сямейнаму кампаньёну без шкодных звычак для сумеснай будоўлі і сумеснай справы.
Тэл. 8 029 801 69 81.

❒ Кабан у Дзяржынскім раёне.
Тэл. 8 01716 56 941, 8 029 854 24 09.

❒ VW-пасат, 1990 г.в., 1,6 бензін-газ, седан, 3 500 у.а.
Тэл. 8 02236 210 98.

❒ Козы высокаўдойныя зааненскай пароды, 2 акот, племянны казёл.
Тэл. 8 02234 356 46, 8 044 714 17 20.

❒ Рухавік, вузлы і з/ч да трактара Т-25.
Тэл. 8 029 285 97 96.

❒ Палявая кухня на шасі.
Тэл. 8 01512 619 97.

КУПЛЮ

❒ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

❒ Рухавік «Хундай саната», 1993 г.в., 2,0, 12-клапанны са счапленнем і выжымным падшыпнікам.
Тэл. 8 017 248 90 60.

❒ Ангар, арачнік.
Тэл. 8 029 337 33 38.

❒ Магазін, офіс.
Тэл 8 029 798 14 42.

❒ Дом з лазняй у вёсцы не далей за 100 км ад Мінска (Слуцкі, Брэсцкі ці Гродзенскі напрамак).
Тэл. 8 029 773 52 60, 8 017 205 57 17.

РОЗНАЕ

❒ Мяняю 4-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў г. Слуцку на 2-пакаёвую ў г. Мінску.
Тэл. 8 01795 25 156, маб. 947 34 34.

❒ Мяняю 2-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску і 3-пакаёвую кааператыўную з гаражом у г. Гарадок (з даплатай) на кватэру ў Мінску ці Санкт-Пецярбургу.
Тэл. 8 029 216 17 09.

«МТС — аграгарадкам»

ВЯСКОЎЦАМ ПАДАРЫЛІ... ЦАРКВУ

На мяжы з Расіяй у вёсцы Ляды Дубровенскага раёна стаіць па-свойму ўнікальная праваслаўная царква. Справа ў тым, што яе будаўніцтва аплаціла... усяго адна сям'я масквічоў. І ніякія яны не багацеі. Проста працавалі ўсё жыццё добрасумленна, адпаведна многага дабіліся. І вось зрабілі сваім землякам цудоўны падарунак.

Ён — вельмі сціплы чалавек, прасіў сваё прозвішча не тыражаваць у СМІ. З'яўляецца адным з кіраўнікоў вельмі сур'ёзнага расійскага ведамства. Мае высокае званне — генерал-палкоўнік. У Лядах і цяпер жыве ягоная маці. А жонка ў свой час у вёсцы працавала настаўніцай.

Адноўчы прыехаў будучы фундатар да маці ў госці і выказаў жаданне царкву пабудаваць. Такіх жа фундатараў і да рэвалюцыі было нямала. А разбурылі старую царкву, што стаяла непадалёк ад цяперашняй, у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вось і ён выканаў тое, што задумаў. Як нам паведаміў настаяцель царквы айцец Васілій, будаўнічыя работы пачаліся ў 2004 годзе. Працавалі тут спецыялісты з Оршы, Барані, Горак. Асвяцілі храм у маі мінулага года.

Знешне і ўнутры невялічкая драўляная царква вельмі прыгожая. Ахвяруюць царкве як мясцовыя жыхары, так і выхадцы з гэтых мясцін. Яны ж усё роўна застануцца на ўсё жыццё тутэйшымі. Хто

абраз падорыць, хто матэрыяльна дапаможа.

І добра, што ў нашы дні ёсць такія шчырыя людзі, якія не толькі клапоцяцца аб уласным дабрабыце, але і хочуць нешта карыснае зрабіць для грамадства. Абавязкова прыязджайце ў Ляды, каб убачыць гэтую маленькую царкву.

А прама ад яе пешшу ўсяго за некалькі хвілін можна дайсці да суседняй брацкай краіны — Расійскай Федэрацыі. Вядома, ніхто на празрыстай мяжы не запытае ў вас візы. Тут прама ля дарогі вы ўбачыце цікавы помнік, што паставілі ў 1912 годзе ў гонар падзеі вайны 1812 года. Надпіс на ім паведамляе, што тут перайшлі мяжу войскі імператара Напалеона, калі пераможна наступалі ў жніўні на Маскву і адступалі ў лістападзе пасля паражэння.

Безумоўна, абаненты МТС — вядучага аператара паслуг мабільнай сувязі ў нашай краіне, за мяжой, не застануцца без сувязі. Нагадаю, што і ў Расіі МТС гарантуе вам надзейнасць сувязі, параўнальна нізкі кошт званкоў, ільготны роўмінг. Ды і ў многіх краінах свету з МТС вы застаняцеся «даступнымі» для тых, хто вам захоча патэлефанаваць. І без праблем здалёк патэлефануеце родным, сябрам.

Мо хто з чытачоў захоча падзяліцца сваімі ўражаннямі, расказаць пра сваю малую Радзіму? Тэлефануйце ў віцебскі карпункт (тэлефон МТС: 5 107 555). Пішыце ў рэдакцыю. Мы будзем імкнуцца прывесці найбольш цікавыя з вашых аповедаў у рубрыцы «МТС — аграгарадкам». Да новай сустрэчы разам з МТС!

Вядучы рубрыкі Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.

Вёска Ляды, Дубровенскі раён.

КАБ ЛЕПШ ВЕДАЛІ Ў ЕЎРОПЕ

У рамках трэцяга Эканамічнага форуму краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў аўстрыйскім горадзе Вельдэнэ адбылася прэзентацыя Міншчыны.

Дзеля гэтага ў Аўстрыю прыбыла прадстаўнічая дэлегацыя сталічнага рэгіёна на чале з намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама Валерыем Скакуном. У складзе дэлегацыі знаходзяцца кіраўнікі вядучых прадпрыемстваў, СЭЗ «Мінск», прадстаўнікі банкаўскіх і страхавых структур.

Для Міншчыны гэта выдатная магчымасць заявіць аб сабе ў Еўрапейскім саюзе. Як паведамі-

ла прэс-служба МЗС, у форуме ўдзельнічаюць федэральны канцлер Аўстрыі Альфрэд Гузенбаўэр, кіраўнікі рэгіёнаў і міністэрстваў, і гандлёва-прамысловых палат краін Заходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы, а таксама больш за 250 прадстаўнікоў дзелавых колаў. Тры дні ў цэнтры іх увагі былі пераважна Беларусь, Расія і Украіна. Мінская дэлегацыя таксама наведала шэраг профільных вытворчасцяў і прадпрыемстваў землі Карынтыя ў галіне машынабудавання, лізінгавай дзейнасці, будаўніцтва. З гэтай зямлёй у Міншчыны ёсць усе шанцы наладзіць узаемавыгаднае эканамічнае супрацоўніцтва.

Леанід ТУГАРЫН.

Паўтарэнне пройдзенага

Праект канала АНТ «Адваротны адлік», які летам сыходзіў у творчы адпачынак, вяртаецца ў эфір. Прычым адразу з вострай тэмай. 2 кастрычніка гледачы ўбачаць дакументальны фільм «Песняры. Беларускі цуд».

...Напрыканцы 60-х у СССР папулярныя музыканты заціснутыя ў жорсткія рамкі. Партыйныя крытыкі накідваюцца літаральна за ўсё: прыпадабненне да Захаду, манернасць, безыдэйнасць... Да Мінска ад гэтых хваляў даходзяць хіба толькі адгалоскі, таму ў філармоніі з'яўляецца і спакойна развіваецца новы эстрадны ансамбль «Лявоны», які ўзначальвае Уладзімір Мулявін. Калектыў неверагодна хутка набывае папулярнасць, і менавіта гэта ў 1970 годзе падштурхоўвае філармонію зрабіць рызыкоўны крок: Мулявіна і яго ансамбль адпраўляюць на Усесаюзны конкурс, адкуль у выпадку поспеху ляжыць прамая дарога на вялікую, саюзнага ўзроўню, эстраду. Каб не выбівацца з вобразу савецкіх эстрадных выканаўцаў, удзельнікам ансамбля настойліва раяць пастрыгчыся і пагаліцца — ніякіх вусоў і бародаў. Музыканты адмаў-

ляюцца, неахвотна пагадзіўшыся толькі на адну ўмову — змяніць назву. Зрэшты, у Маскве высокае журы нават не звяртае ўвагі на доўгія валасы і вусы музыкантаў, здзіўленае іх выканальніцкім узроўнем. «Песняры» літаральна прачнуліся знакамітымі.

Ад ператварэння ў шаблоннае ВІА іх выратавала толькі адно: у Маскве калектыў палічылі фальклорным і самабытным, а ў Мінску не рашыліся аспрэчыць меркаванне афіцыйнай Масквы. З таго часу «Песняроў» прапаганда прадстаўляла як неад'емную частку нацыянальнай культуры. Беларускае тэлебачанне зняло пра іх музычны фільм — першы ў СССР фільм пра вакальна-інструментальны ансамбль... Але за ўзлётамі ансамбль напаткала чарада непрыемнасцяў: з калектыву сышлі асноўныя выканаўцы, назапасіліся ўнутрысямейныя праблемы. Дагэтуль не вырашана пытанне, хто з колішніх удзельнікаў мае большыя правы на брэнд «Песняроў». І толькі адно захавалася нязменным: любоў і прыязнасць некалькіх пакаленняў слухачоў да «беларускага цуду»...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Royal

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Пришел, увидел, «MERSEDES»!!!»

1. Настоящая рекламная игра называется «Пришел, увидел, «MERSEDES»!!!», проводится в соответствии с условиями настоящих правил с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры дополнительной платы.

Игра имеет цель — дополнительное увеличение посетителей (клиентов) казино «Royal», город Минск, проспект Независимости, 11, корп. 1.

2. Организатором Игры является ООО «Дакарай», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2-610. Учетный номер плательщика 190617507. Свидетельство № 614 о государственной регистрации коммерческой организации выдано Мингорисполкомом 18 апреля 2005 г. (далее по тексту — «Организатор»).

3. Игра проводится в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп. 1 в период **с 01 ноября 2008 года по 19 декабря 2008 года** (включительно).

4. Призовой фонд игры.

Призовой фонд Игры формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора игры — ООО «Дакарай». Призом игры является автомобиль Мерседес-Бенц С 180 К кузов W204, стоимостью 99 463 000 (девяноста девять миллионов четыреста шестьдесят три тысячи) белорусских рублей.

5. В Игре в период ее проведения, могут принять участие совершеннолетние физические лица, в возрасте старше 18 лет (далее по тексту «Участники»), с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники предприятий, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и/или проведению настоящей Игры, а также члены их семей.

6. Описание Игры.

Механизм проведения Игры:

■ Для того чтобы принять участие в Игре и розыгрыше призов Участнику следует в период с 01 ноября 2008 года по 19 декабря 2008 года посетить казино «Royal», расположенное по адресу г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 и принять участие в играх «ПОКЕР» стол № 1 и/или «РУЛЕТКА» стол № 1 и/или «БЛЭК ДЖЭК». Нумерация столов указана на столах.

При этом участнику игры «ПОКЕР» независимо от игры у «дилера» выдаются игровые купоны при условии ставки и за выпадение комбинаций согласно таблице:

комбинация/ ставка	10 у.е.– 25 у.е.	30 у.е.– 55 у.е.	60 у.е.– 95 у.е.	100 у.е.– 300 у.е.	>300 у.е.
«Стрит»	—	1	2	4	6
«Флэш»	—	2	4	6	8
«Фул Хауз»	2	3	5	8	10
«Карэ»	4	5	10	15	20
«Стрит флэш»	5	10	20	25	30
«Роял флэш»	10	20	30	50	70

Участнику игры «БЛЭК ДЖЭК» выдаются игровые купоны при условии ставки и за выпадении комбинаций согласно таблице:

комбинация/ ставка	10 у.е.– 25 у.е.	30 у.е.– 55 у.е.	60 у.е.– 95 у.е.	100 у.е.– 245 у.е.	250 у.е.— 300 у.е.
«7», «7» или «Блэк Джэк»	—	—	—	—	1
«Блэк Джэк одной масти»	—	1	2	4	6
«6», «7», «8» или «7», «7», «7» разной масти	2	4	6	8	10
«6», «7», «8» или «7», «7», «7» одной масти	4	6	8	10	20

Участнику игры «РУЛЕТКА» выдаются игровые купоны при условии выплаты при выпадении номера на столе согласно таблице:

номер/ выплата	200 у.е.– 500 у.е.	502 у.е.– 1000 у.е.	1002 у.е.– 5000 у.е.	5002 у.е.– 10 000 у.е.	>10 000 у.е.
номер равный числу дня	1	2	3	5	7
при повторе выпадения номера	1	2	3	5	7

Также, игроку игры «РУЛЕТКА» выдаются купоны при выплате сумм, согласно таблице, кроме выплат со ставок на дюжины, колонки, большие и малые номера, четные и нечетные номера, красные и черные номера:

выплата	200 у.е.– 500 у.е.	502 у.е.– 1000 у.е.	1002 у.е.– 5000 у.е.	5002 у.е.– 10 000 у.е.	>10 000 у.е.
количество купонов	—	1	2	3	5

Стоимость у.е. (условной единицы) — 2 115 белорусских рублей.

Купоны выдаются в период проведения рекламной игры с 00 час. 00 мин. 01 ноября 2008 года до 22 час. 50 мин. 19 декабря 2008 года.

Каждый купон, состоит из двух частей, имеющих свой идентификационный номер.

Участник Игры, получивший купон, по линии отрыва разделяет купон на две половины, одну половину оставляет себе, вторую – возвращает сотруднику Организатора игры. Переданные Организатору игры купоны регистрируются с указанием имени и первой буквы фамилии. В лототрон помещаются купоны игроков, набравшие 10 и более копунов.

Получение купона участника игры подтверждает факт ознакомления и полное согласие Участника с Правилами Игры, выражает желание Участника участвовать в Игре, а также обязывает присутствовать при проведении розыгрыша призового фонда Игры.

Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы купонов участников игры, в том числе с привлечением экспертов. Поддельные купоны участника игры, к участию в Игре не допускаются. Идентификация купонов участника игры осуществляется работниками Организатора Игры.

7. В рамках Игры создается комиссия по проведению рекламной игры. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры с 01 ноября 2008 года по 19 декабря 2008 года.

Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры:

■ Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ООО «ДАКАРАЙ». В состав комиссии входят 3 человека — председатель и два члена комиссии.

■ Решение комиссии признается действительным при условии присутствия большинства членов из общего состава комиссии.

■ Член комиссии ведет протокол заседаний комиссии. В протоколе отражаются время и место проведения заседания комиссии, повестка дня.

■ В протоколе розыгрыша призового фонда отражается время и место проведения розыгрыша призового фонда, сведения о составе комиссии по проведению розыгрыша, действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты проведения розыгрыша с указанием выигравшего купона и сведений о победителе, обладателе Приза рекламной игры.

■ Протокол подписывают все члены комиссии, присутствующие при проведении заседания комиссии.

■ Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша приза рекламной игры является основанием для выдачи приза победителю.

■ Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.

8. **Розыгрыш приза** Игры состоится по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, казино «Royal» в присутствии комиссии по проведению рекламной игры и участников игры **19 декабря 2008 года в 23.00.**

Определение победителя игры будет проводиться посредством случайной выборки купонов участников Игры в течение срока проведения рекламной игры с 01 ноября 2008 года по 19 декабря 2008 года.

В каждом этапе к розыгрышу допускаются игроки, набравшие до момента розыгрыша не менее 10 игровых купонов.

Все зарегистрированные и допущенные к участию в розыгрыше купоны участника игры помещаются представителем Организатора в лототрон и перемешиваются. Один из членов комиссии случайным образом вытягивает купоны участника игры из лототрона, объявляется идентификационный номер купона. Если в зале отсутствует владелец второй части купона с данным индентификационным номером, то из лототрона вынимается следующий купон. Данная процедура повторяется до тех пор, пока не будет вытянут купон с идентификационным номером, совпадающим с номером купона, присутствующего в зале участника Игры. Таким образом, определяются 37 участников Игры. Далее Игра проводится на игровом столе «Американская рулетка». Купон игрока, который был определен для участия первым, помещается на игровое поле «Американской рулетки» на номер «0». Купон игрока, который был определен вторым, помещается на игровое поле «Американская рулетка» на номер «1». Таким образом заполняются номера от «0» до «36». Дилер запускает шарик рулетки. Игрок, чей билет находится на выпавшем номере, является первым финалистом. На освободившийся номер на столе «Американская рулетка» один из членов комиссии вытягивает из лототрона купон. Дилер снова запускает шарик. Процедура повторяется до тех пор, пока не определятся еще два финалиста. После этого трем финалистам выдаются три игрушечные машинки «Мерседес». Машинки помещаются игроками на игровом поле «Американская рулетка» на номер «0». Финалисты бросают игральную кость в той очередности, которой выходили в финал. Сколько точек выпадает на игральной кости, на столько номеров игрок передвигает свою машинку. Победителем становиться тот финалист, который первым доведет свою машинку до номера «36» игрового стола. Даже если у кого-то из остальных финалистов осталась возможность сделать еще бросок.

9. По итогам розыгрыша составляется и подписывается членами комиссии протокол розыгрыша. Решение комиссии, касающееся результата розыгрыша Призового фонда, является окончательным и обязательным для всех участников и не может быть изменено.

10. О рекламной игре можно получить информацию, позвонив по телефону «горячей линии» (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00, либо непосредственно в казино «Royal» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1.

11. Вручение приза игры будет осуществляться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1, казино «Royal» в срок до 24 декабря 2008 года.

12. Для получения приза выигравшему участнику Игры, необходимо иметь при себе паспорт, удостоверяющий личность и вторую половину игрового купона для сверки его идентификационного номера с номером выигрышного купона.

Если Победитель Игры самостоятельно не явится за получением приза по адресу, указанному в п. 11 настоящих Правил, Победитель лишается права на получение приза.

Если победителем становится лицо, признанное недееспособным или ограниченно дееспособным, право получения приза переходит к его законным представителям — родителям, усыновителям или попечителям.

13. Победитель игры несет ответственность за уплату всех применимых налогов и предоставление налоговой отчетности, установленных действующим законодательством Республики Беларусь, связанных с получением призов Игры.

14. Организатор не оплачивает Участнику Игры расходы, связанные с проездом к месту получения приза Игры.

15. Приз не подлежит замене, выплата денежного эквивалента стоимости приза не осуществляется.

Ответственность Организатора по выдаче приза ограничивается исключительно указанном в настоящих Правилах количеству и виду приза. Организатор Игры не несет ответственность за любые риски, связанные с повреждением приза и его эксплуатацией, возникшие после выдачи приза победителю.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной игры их имена, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники игры по их согласию могут давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

16. Информирование о проведении Игры и ее условиях производится посредством размещения рекламы в средствах массовой информации, с использованием средств наружной рекламы, выпуском полиграфической продукции.

Настоящие Правила, сведения о Призовом фонде игры и порядке его формирования, сведения о составе комиссии по проведению рекламной игры и регламенте ее работы подлежат публикации в средствах массовой информации до начала рекламной игры.

Информация о результатах розыгрыша Призового фонда Игры будет опубликована в том же СМИ, где будут опубликованы правила настоящей Игры и дополнительно может быть размещена в других средствах массовой информации не позднее 29 декабря 2008 года.

Дополнительную информацию об Игре можно получить по телефону «горячей линии»: (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00.

17. Участие в Игре автоматически подразумевает ознакомление с настоящими Правилами и согласие участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником выполнения настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

Председатель комиссии:

■ Магеров Сергей Федорович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

Члены комиссии:

■ Давыдов Денис Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

■ Умецкий Станислав Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены)

Комиссия будет осуществлять свою деятельность в период проведения рекламной игры с 01 ноября 2008 года по 19 декабря 2008 года.

Призовой фонд Игры формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора игры — ООО «Дакарай». Призом игры является автомобиль Мерседес-Бенц С 180 К кузов W204, стоимостью 99 463 000 (девяноста девять миллионов четыреста шестьдесят три тысячи) белорусских рублей.

Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 1173 от 18 сентября 2008 года. УНП 190617507.

СКРЫЖАВАННЕ ДАРОГ

Скрыжаванне дарог — месца перасячэння дзвюх, трох ці болей дарог, усемагчымыя раздарожжы, месцы перасячэння дарогі і воратаў, межаў вёскі, мастоў і іншых перашкод і рубяжоў, у народнай культуры заўсёды лічылася дрэнным і нават небяспечным месцам. Скрыжаванне дарог было сімвалічнай мяжой, за якой пачынаецца другое (чужое) жыццё. Нашы продкі свята верылі, што **пера-крыжаванне** ахоўвае месца жыхарства людзей ад нячыстай сілы, якая ніколі не зможа яго пераступіць, перайсці. Насамрэч, у самім слове «скрыжаванне», утвораным ад слова «крыж», быццам бы гучыць перасцярога.

● Негатыўны адбітак скрыжаванне дарог атрымала па некалькіх прычынах. Па-першае, скрыжаванне было сімвалічнай лініяй, якая размяжоўвала, дзяліла, раз'ядноўвала дарогу, у некаторых выпадках станавілася сімвалічнай кропкай адліку: праводзіць каго-небудзь да скрыжавання дарог! Менавіта па гэтай прычыне ў час эпідэміі на скрыжаванні дарог ставілі крыжы: спыніць распаўсюджванне страшнай хваробы, не пусціць яе за сімвалічную мяжу.

● Па-другое, лічылася, што там, дзе перакрыжоўваецца некалькі дарог, дзе праходзіць шмат людзей, любая вестка (інфармацыя) вельмі хутка разляцецца па ўсім наваколлі (менавіта з гэтай мэтай на скрыжаванне дарог прыносілі розныя рэчы, на якія адсыпалі хваробы, беды і няшчасці, каб іх знесці як мага далей, «разнесці на ўсе чатыры бакі»!).

● Па-трэцяе, у старажытныя часы нашы прашчуры на скрыжаванні дарог хавалі памерлых.

● Па-чацвёртае, на скрыжаваннях, якія станавіліся «занядбанымі», «закінутымі», рабілі сметнікі, выкідалі рэчы, якія непасрэдна кантактавалі з памерлым (мыла, ручнік пасля абмывання) ці цяжкахворым чалавекам і г.д.

● Калі ў сям'і не гадаваліся дзеці, бацька дзіцяці павінен быў запрасіць хроснымі бацькамі першых людзей, якіх сустрэне на бліжэйшым да хаты скрыжаванні дарог.

● На крыжы каля скрыжавання дарог дзяўчаты і юнакі вешалі ручнікі, калі іх род пакутаваў ад адсутнасці шлюбаў.

● Калі хто-небудзь з нядобразычліўцаў хацеў нашкодзіць маладой пары, то мог паставіць на шляху вясельнага цягніка, на бліжэйшым скрыжаванні дарог, падрыхтаваныя спецыяльна для гэтага рэчы. Таму хросныя бацькі павінны былі пры набліжэнні да кожнага на шляху скрыжавання дарог перахрысціць яго, а таксама кінуць на зямлю грошы, соль, вугельчыкі.

● Падчас працяглай засухі на перакрыжаванні неабходна было ўпотайкі ад усіх разбіць украдзены гаршчок.

● Сёння ў сельскай мясцовасці прытрымліваюцца звычаю падчас пахавальнай працэсіі спыняцца на кожным скрыжаванні, ставіць на яго труну з памерлым.

● У адносінах да скрыжаванняў у народнай культуры існаваў шэраг забарон: не сядзець, не спаць, не пакідаць смецце! А галоўнае — нічога не падбіраць, каб пазбегнуць няшчасцяў і хваробаў.

● Зямля, узятая з перакрыжавання, лічылася надзейным абярэгам у далёкім шляху.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.57	19.05	12.08
Віцебск —	6.47	18.55	12.08
Магілёў —	6.47	18.55	12.08
Гомель —	6.44	18.52	12.08
Гродна —	7.13	19.20	12.07
Брэст —	7.13	19.21	12.08

Месяц

Апошняя квадра.

Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Васіля, Глеба, Івана, Канстанціна, Мікалая, Паўла, Пятра, Яўгена.*

К. *Тэклі, Багуслава.*

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

23 верасня

1943 год — 65 гадоў таму пачалося вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэты дзень войскі 13-й арміі Цэнтральнага фронту, фарсіраваўшы ў час правядзення Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі раку Днепр, акружылі і знішчылі фашысцкі гарнізон у райцэнтры Камарын. Больш як 20 воінаў Чырвонай Арміі, якія асабліва вызначыліся тады, былі прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза.

1938 год — у час правядзення Сусветнага кірмашу ў Нью-Ёрку закладзена «Капсула часу», якую неабходна ўскрыць у 6939 годзе (туды паклалі жаночы капялюшык, мужчынскую курыльную трубку і 1100 мікрафільмаў).

Цытата дня:

«Калі цябе кахаюць, не сумняваешся ні ў чым. Калі кахаеш сам — ва ўсім сумняваешся».

Сідонія Калет (1873—1954), французская пісьменніца.

Віншуем любага бацьку і дзядулю **Станіслава Іосіфавіча ЛЯШЧЫНСКАГА** з 80-годдзем. Жадаем добрага здароўя, бадзёрага настрою, удачы ў справах. Мы цябе любім.

Дзеці, унукі, праўнукі, *в. Турэц-Баяры.*

Усміхнёмся!

Які ідыёт прыдумаў такія фасоўкі пельменяў, што на адзін раз заўсёды многа, а на два — мала?

☺

— І падзяліўся мір напалову, з аднаго боку ваяры святла, яны ваююць за дабро, з іншага — ваяры цемры, яны ваююць за зло!

— Гэй, давай ужо проста, без пафасу, пагуляем у шашкі!

☺

1560-ы год, чэмпіянат Русі па стральбе з лука і фехтаванні нечакана закончыўся ўзяццем Казані.

☺

— У вас ёсць алібі?

— Ёсць. Хочаце валютай?

☺

Малады сімпатычны студэнт шукае спадарожніцу жыцця сталага заможнага бізнэсмена.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 5203. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12